Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
24 ВЕРАСНЯ 2016 г. СУБОТА № 185 (28295)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Чаму каўбасы будуць недасольваць

СТАР. 7




Легендарны звяздовец

СТАР. 8



Вучым малога правілам бяспекі

СТАР. 13

# Усё па-даросламу!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выхаванцы Рагачоўскага дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці на занятках па правілах дарожнага руху.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ЖУК, першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Цікавасць да эканамічных мерапрыемстваў у Гродне гаворыць пра высокую ацэнку інвестарамі ўмоў для вядзення бізнесу ў рэгіёне. Калі раней міжнародны інвестыцыйны форум і выстава-кірмаш «Еўрарэгіён «Нёман» былі мерапрыемствамі прыгранічнага фармату, то сёння яго межы значна пашырыліся. Пастаянная ўвага да бізнес-мерапрыемстваў, рэалізацыя буйных праектаў з удзелам замежнага бізнесу ў рэгіёне гавораць пра тое, што Гродзенская вобласць цікавая для замежных бізнесменаў, іх задавальняюць умовы работы, прыцягваюць палітычная і эканамічная стабільнасць, адносіны да інвестара».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9322 ▼ |
| Еўра | 2,1645 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

Мікалай СНАПКОЎ:

## «БЕЛАРУСЬ — КІТАЙ: СУМЕСНАЕ РАЗВІЦЦЁ...»



**Уражальнай падзеяй не толькі ў прасторы беларуска-кітайскіх адносін, але і ўвогуле ў эканамічным жыцці Еўразіі апошняга часу стала правядзенне 5-й выстаўкі ЭКСПА «Кітай — Еўразія». Так, у адзін момант у старажытным горадзе Урумчы сабраліся сотні, тысячы прадстаўнікоў розных краін, каб паказаць сябе Кітаю, жыхарам Кітая, каб зрабіць крок наперад у развіцці стасункаў з дзяржавай, якая ўжо сёння выступае рухавіком і, лічы, заканадаўцам многіх ініцыятыў, з рэалізацыяй якіх свет будзе рухацца ў будучыню з усімі яе перспектывамі і выдаткамі. А Беларусь была запрошана ганаровым госцем 5-й ЭКСПА «Кітай — Еўразія». Дэлегацыю нашай краіны ўзначальваў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалай СНАПКОЎ. З ім сустрэўся наш карэспандэнт і папрасіў падзяліцца сваімі ўражаннямі.**

***— Мікалай Генадзьевіч, чым вызначаецца гэтая выстаўка? Наколькі важнай падзеяй падаецца яна вам асабіста на фоне беларуска-кітайскіх адносін у галіне эканомікі?***

— І не толькі ў галіне эканомікі, але і ў палітычным плане выстаўка, наладжаная ў сталіцы Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна, куды Беларусь запрасілі ганаровым госцем якраз напярэдадні візіту нашага Прэзідэнта ў Кітай, паверце, адыграе яшчэ немалую ролю ў выбудоўванні беларуска-кітайскіх адносін на бліжэйшую пяцігодку. Мудры Канфуцый казаў: вялікая радасць — вітаць сяброў здалёку. Не меншая радасць — здалёку прыехаць у гасцінны Кітай і шырока адкрыты для ўсіх Сіньцзян.

СТАР. 2

■ Адраджэнне святыняў

## СТАРЫ НОВЫ ХРАМ

### Царкву ў Малых Мурынах Камянецкага раёна аднаўляюць па старадаўніх тэхналогіях

**Свята-Мікалаеўская драўляная царква ў вёсцы Малыя Мурыны стаіць больш за 250 гадоў — так пазначана ва ўсіх даведніках. А паводле іншых звестак, храм на гэтым месцы быў узведзены яшчэ ў 1530-х гадах. Апошні раз вясковая святыня перажывала рэстаўрацыю ў XIX стагоддзі. Няцяжка здагадацца, што адны бярвёны з той пары мясцамі моцна падгнілі, іншыя з'елі насякомыя, таму сцены і дах страцілі магчымасць лічыцца хоць колькі-небудзь устойлівай канструкцыяй.**

Яно і не дзіва, дрэва — не камень, яно не можа служыць доўга, з часам яго трэба мяняць. Адным словам, дайшло да таго, што службу ў вясковым храме стала праводзіць небяспечна. «І нельга ж было дапускаць, каб нейкім разам дах абрынуўся проста на галовы людзей», — сказаў у тэлефоннай размове з карэспандэнтам святар Валянцін Муліца.

У прыходзе было прынята рашэнне царкву аднавіць. Пачаліся ўзгадненні, падрыхтоўчыя работы, а ў пачатку мінулага года стары будынак разабралі. Тут жа ў інтэрнэце паднялася хваля абурэння, здагадак, гіпотэз. Пісалі, што на Камянеччыне знішчаюць помнік гісторыі і культуры. Чамусьці нават сцвярджалася, што на месцы старога храма ўзвядуць новы — у маскоўскім стылі. Паколькі згаданы храм занесены ў дзяржаўны спіс як гісторыка-культурная каштоўнасць і ахоўваецца законам, пісьмовыя скаргі пайшлі ў розныя ўстановы. Так, пракурор Брэсцкай вобласці атрымаў пісьмо з Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры з прапановай прыцягнуць вінаватых да адказнасці. Ліст быў накіраваны для праверкі ў пракуратуру Камянецкага раёна.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Заканчваецца падпіска на «Звязду» на IV квартал!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# УЗЯТАЕ СЛОВА ТРЭБА ТРЫМАЦЬ

## Прэзідэнт патрабуе няўхільнага выканання прынятых на Усебеларускім народным сходзе рашэнняў

**На гэтым кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу падчас даклада ўрада аб рабоце эканомікі за мінулы перыяд 2016 года, праектах прагнозу, бюджэту і грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год.**

Аляксандр Лукашэнка лічыць гэты год асаблівым, паколькі з яго пачалася новая пяцігодка. Тры месяцы таму на пятым Усебеларускім народным сходзе было прынята рашэнне па самых важных пытаннях развіцця дзяржавы, зацверджаны Асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі да 2020 года. На думку Прэзідэнта, неабходна, каб наступныя крокі — гадавыя планы і прагнозы, накіраваныя на рэалізацыю прыярытэтаў праграмы пяцігодкі, — цалкам адпавядалі абяцаным народу на з'ездзе.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на асобныя моманты, якія яго насцярожваюць: «Урад дакладвае, што ў цэлым стабільнасць захавана, у поўным аб'ёме і ў тэрмін разлічваемся па ўсіх дзяржаўных абавязацельствах, валютных даўгах, ствараюцца ўмовы для якаснага паляпшэння макраэканамічных параметраў. Тым не менш сітуацыя на шматлікіх прамысловых прадпрыемствах застаецца складанай». Прэзідэнт незадаволены адмоўнай дынамікай у сельскай гаспадарцы, недапрацоўкамі ў будаўнічай галіне, скарачэннем экспарту, зніжэннем інвестыцый.

«Няма галоўнага — росту эканомікі, нават таго, які мы запланавалі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Складваецца ўражанне, што насуперак прынятай праграме на пяцігодку ўрад рэалізуе інерцыйны сцэнарый развіцця. Гэта значыць пасіўна плыве па цячэнні, спасылаючыся на неспрыяльныя знешнія фактары і не імкнучыся мабілізаваць усе сілы і рэсурсы для эканамічнага ўздыму. А часам некаторыя і супраць цячэння заплываюць».

Прэзідэнт запатрабаваў даклада ўрада па наступных напрамках: як завяршаецца гэты год, што атрымалася, а што не дае вынікаў, якія меры прымаюцца па пераадоленні допушчанага адставання. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Калі мы адстойваем незалежнасць сваёй дзяржавы, то павінны зарабляць уласнай працай, робячы стаўку на ўнутраныя рэзервы, больш за тое — усякія праблемы і складанасці, плануючы бягучы год, мы прадугледжвалі, і не адзін раз, яны ўжо закладзены ў нашы паказчыкі. Унутраныя рэзервы слаба выкарыстоўваюцца як у зніжэнні сабекошту прадукцыі, укараненні новых тэхналогій, так і ў кіраванні прадпрыемствамі. Іншымі словамі, у ведах і тэхналогіях — ключ да вырашэння праблем і руху наперад».

Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў, што ў аснову неабходна паставіць рашэнні і мэтавыя ўстаноўкі, прынятыя на з'ездзе. «Прыярытэты намечаныя для ўсіх, і ад вас патрабуецца прытрымлівацца іх няўхільна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і запатрабаваў ад удзельнікаў нарады не галаслоўных абяцанняў і запэўненняў, а аб'ектыўнага аналізу прадстаўленых дакументаў і канструктыўных прапаноў па выкананні рашэнняў Усебеларускага народнага сходу.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на рашэнне праблемы занятасці як галоўнага сацыяльнага прыярытэту развіцця дзяржавы, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў далажыў Прэзідэнту, што эканоміка краіны развіваецца на фоне неспрыяльных знешніх умоў. Комплексна аналізуючы вынікі працы за мінулыя восем месяцаў, кіраўнік урада выразна вылучыў тры асноўныя перыяды работы эканомікі. «Студзень-люты — гэта стрэсавы перыяд: цана на нафту — $30 і менш, курс долара — 80 расійскіх рублёў. Сакавік—чэрвень — гэта перыяд аднаўленчага росту. Ліпень-жнівень — перыяд негатыўнага ўздзеяння, у першую чаргу з боку Расіі ў сувязі са зніжэннем аб'ёму пастаўкі нафты для перапрацоўкі на нашых НПЗ, а таксама за кошт неспрыяльных умоў, якія мелі месца ў сельскай гаспадарцы», — растлумачыў ён. Свой уплыў на эканоміку, паводле слоў Андрэя Кабякова, на працягу ўсіх васьмі месяцаў аказвала зніжэнне кошту і аб'ёмаў паставак калійных угнаенняў на знешнія рынкі.

Асноўнай мэтай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2017 годзе з'яўляецца рост канкурэнтаздольнасці эканомікі. Ураду трэба будзе сканцэнтраваць намаганні на забеспячэнні макраэканамічнай збалансаванасці, на фінансавым аздараўленні арганізацый рэальнага сектара эканомікі, стварэнні эфектыўнай сістэмы занятасці, новых працоўных месцаў, росце прадукцыйнасці працы, павышэнні эфектыўнасці кіравання дзяржмаёмасцю, паляпшэнні інвестыцыйнага клімату, а таксама зніжэнні адміністрацыйнай нагрузкі на бізнес.

Як было даложана кіраўніку дзяржавы, валавы ўнутраны прадукт на будучы год прагназуецца на ўзроўні 101,7%. Мяркуецца, што тэмп росту рэальнай заработнай платы ў 2017 годзе складзе 101,5% да паказчыка гэтага года, а інфляцыя не павінна перавысіць 9%.

Па выніках даклада ўраду даручана дапрацаваць прапанаваныя меры, праекты разгледжаных дакументаў і вынесці іх затым на разгляд Прэзідэнта.

# «БЕЛАРУСЬ — КІТАЙ: СУМЕСНАЕ РАЗВІЦЦЁ...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Кіраўнік аўтаномнага раёна таварыш Шахрат Закір сказаў, што яго старонка — самы блізкі да Беларусі кітайскі рэгіён...***

— Тут, ва Урумчы, Сянцзяні, адчуваецца асаблівы дух адраджэння Шаўковага шляху. І для Беларусі гонар вялікі — быць ганаровым госцем пятага ЭКСПА. Усе ўдзельнікі нашай дэлегацыі на сабе адчулі, як кіраўніцтва Сіньцзяна, сакратарыят ЭКСПА проста бліскуча ўсё арганізавалі на такім прыкметным форуме.

Блізкасць, пра якую гаварыў таварыш Шахрат Закір, мае пад сабой асаблівую глебу. Тут мяжа кітайскай часткі Шаўковага шляху. І, відаць, кіраўнік СУАР памятае, што Беларусь першай з еўрапейскіх краін падтрымала канцэпцыю будаўніцтва эканамічнага пояса Шаўковага шляху, вылучаную Старшынёю КНР таварышам Сі Цзіньпінам. Першая выказала гатоўнасць актыўна падключыцца да стварэння яго еўрапейскага звяна.

***— І нашы дарогі тут, пэўна ж, адыгрываюць рашаючую ролю?***

— Праз Беларусь праходзяць важнейшыя чыгуначныя маршруты, якія звязваюць Сіньцзян з краінамі Еўрапейскага саюза: дзякуючы канцэпцыі эканамічнага пояса Шаўковага шляху якраз і фарміруюцца новыя шляхі для тавараў, мадэрнізіруюцца напрамкі. Хуткасць дастаўкі грузаў сухапутным шляхам сёння, між іншым, перавысіла 1400 кіламетраў у суткі.

Так, пакуль, праўда, кошт дастаўкі ўсё яшчэ вышэйшы, чым марскім шляхам. Але пры гэтым значна вышэйшай з'яўляецца надзейнасць і ніжэйшымі рызыкі. Банкруцтва карэйскага аператара «Ханчжын шы пінг» пераконвае нас і ўвесь свет у мудрасці кітайскага кіраўніцтва, якое ўдзяляе вялікую ўвагу і аказвае падтрымку развіццю сухапутных перавозак.

***— Як сваё выразнае месца займаюць у нас, у Беларусі, і іншыя кітайскія праекты?***

— З вышыняў беларуска-кітайскіх адносін, добразычлівасць, шчырасць якіх асвятляла ўсю работу выстаўкі ва Урумчы, асабліва відаць вартасці нашых фундаментальных асноў у развіцці кітайскага ўнёску ў эканоміку Беларусі. Усяго некалькі тыдняў засталося да завяршэння будаўніцтва першай чаргі інфраструктуры Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі Камень» і мультымедыйнага цэнтра Чайна Мерчантс Груп, размешчанага за 25 км ад горада Мінска.

Увядзенне ў строй індустрыяльнага парка, які Старшыня КНР таварыш Сі Цзіньпін назваў пярлінай Шаўковага шляху, — гэта прарыў у эканамічным супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі. Такі міжнародны праект ужо цяпер прываблівае цікавасць інвестараў і прамыславікоў з розных краін Еўропы, Азіі, ды Амерыкі таксама.

***— І зараз ва Урумчы, ды і пастаянна ў выказваннях палітычных аналітыкаў, экспертаў, гучала і гучыць думка пра тое, што прыязнасць кітайскага боку звязана з выключна адкрытай пазіцыяй у адносінах да Кітая з боку кіраўніка нашай дзяржавы. Кітайцы бачаць, што словы нашага Прэзідэнта вызначаюцца адказнасцю.***

— Следам за словамі, ясна выкладзенай пазіцыяй ідуць справы. Яны з'яўляюцца грунтам на заўтра. У адпаведнасці з даручэннямі лідараў Кітая і Беларусі ў парку сфарміраваны самыя камфортныя ўмовы адкрыцця і вядзення бізнесу ў параўнанні з усёй прасторай Заходняй Еўразіі. Асаблівасцю і найвышэйшым узроўнем даверу з'яўляецца сумесная з кітайскімі экспертамі работа па фарміраванні прававой базы функцыянавання Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. Вось і атрымліваецца, што выгадная сумесная з кітайскімі партнёрамі рэалізацыя праекта дапамагае развіваць парк па перспектыўных кірунках сучаснай эканомікі.

***— Нагадайце найбольш цікавыя з іх...***

— Напрыклад — «Інтэрнэт рэчаў», абсталяванне для «разумнай» і ўзнаўляльнай энергетыкі, робататэхніка, оптыка і лазеры, вытворчасць лекаў. А таксама — вытворчасць новых матэрыялаў і іншыя сферы, якія фарміруюць эканоміку будучыні.

Наш сумесны з кітайскімі сябрамі парк — гэта выключная з'ява, якая скіравана на рэалізацыю ідэі «новай індустрыяльнай рэвалюцыі», ініцыяванай Старшынёй КНР таварышам Сі Цзіньпінам на Ханчжоўскім саміце «вялікай дваццаткі».

І 5-я выстаўка «Кітай — Еўразія», наладжаная ў СУАР, куды прыехалі нераўнадушныя да справы арганізацыі беларуска-кітайскіх эканамічных адносін кіраўнікі, пацвярджае: такая рэвалюцыя робіць нас мудрэйшымі і багацейшымі, дапамагае свету эвалюцыйна мінуць эканамічныя крызісы і іншыя праявы няўстойлівасці.

Ужо на практыцы Беларусь рэалізоўвае сёння дэвіз ЭКСПА-2016 «Кітай — Еўразія»: сумеснае абмеркаванне, сумеснае стварэнне, сумеснае выкарыстанне! Парк — яскравы прыклад сумеснай рэалізацыі канцэпцыі эканамічнага пояса Шаўковага шляху і сумеснага будаўніцтва супольнасці адзінага лёсу.

Гутарыў **Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
*Кітай, г. Пекін.*

■ Прыярытэты

# ЖАМЧУЖЫНА ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ

**Індустрыяльны парк «Вялікі камень» стане жамчужынай на Шаўковым шляху Кітая. Такое меркаванне ў патэнцыйных інвестараў складваецца таму, што парк ужо ў хуткім часе будзе зручна злучаць Усход і Захад, дазваляючы пашыраць узаемны гандаль. Ужо сёння будаўніцтва інфраструктуры маштабнага праекта выходзіць на фінішную прамую.**

Прычым па многіх кірунках яго ўзвядзенне адбываецца апераджальнымі тэмпамі. Гэта з'яўляецца сігналам для прыходу ў парк буйных кампаній. У адміністрацыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» карэспандэнту «Звязды» адзначылі, што сёння там ужо зарэгістравана 8 рэзідэнтаў. Сярод іх кампанія, якая працуе у сферы машынабудавання, — кітайскае прадпрыемства Zoomlion, што пераважна займаецца распрацоўкай і вытворчасцю высокатэхналагічнага абсталявання для сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, энергетыкі. Таксама з'явіліся кампаніі, якія працуюць у сферы інфармацыйных тэхналогій. Дзякуючы адной з іх у парку плануецца стварыць навукова-даследчы цэнтр, які будзе месцам дачыненне да машынабудаўнічай галіны. У «Вялікім камені» ужо зарэгістраваліся вядомыя сусветныя вытворцы электроннай тэхнікі Huawei і ZTE. Ёсць і буйная лагістычная кампанія China Merchants Group, якая зарэгістравала свайго рэзідэнта ў парку і рэалізуе праект па стварэнні лагістычнага субпарка. Акрамя таго, ужо заключана больш за 50 пагадненняў аб намерах уступлення ў праект.

Каб прыцягнуць новых рэзідэнтаў, наша краіна плануе прадастаўляць для кампаній яшчэ больш прэферэнцый. **Міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** адзначыў, што рыхтуецца праект указа, які ўнясе сур'ёзныя змены ў той нарматыўны дакумент, па якім сёння дзейнічае парк. З'явіцца яшчэ больш прэферэнцый для таго, каб зацікавіць партнёраў не толькі з Кітая, але і з Еўропы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Жыллё

# «КАМУНАЛКУ» АБЯЦАЮЦЬ НЕ ПАВЫШАЦЬ

**Аб гэтым учора паведаміў <u>прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ</u>. У прыватнасці ён адзначыў, што цана ацяплення і ў гэты зімовы сезон будзе ў межах лічбаў, якія былі ў пачатку года.**

Сваю ўпэўненасць у гэтым прадстаўнік ЖКГ патлумачыў тым, што, згодна з Указам кіраўніка дзяржавы №107, былі ўстаноўлены гранічныя тарыфы на ўсе асноўныя віды жыллёва-камунальных паслуг, таму кошт ацяплення змяняцца не будзе. «Сярэдняя выніковая лічба будзе ў межах тых паказчыкаў, якія грамадзяне атрымлівалі ў студзені і лютым», — адзначыў Генадзь Аксціловіч.

Паводле яго слоў, сёння ўзровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) складае 58%. Між іншым, перад міністэрствам была пастаўлена задача давесці гэты паказчык да 70% ужо ў наступным годзе. На падобны пасыл спадар Аксціловіч паведаміў, што цяпер павышэнне гэтага ўзроўню кампенсацыі адбываецца за кошт зніжэння выдаткаў арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі па аказанні ЖКП. «Ведамству даведзены па гэтым кірунку сапраўды сур'ёзныя заданні на бягучы год. Неабходна і надалей зніжаць выдаткі ў вытворчасці, ажыццяўляць аптымізацыю кадравай колькасці прадпрыемстваў за кошт мадэрнізацыі вытворчых працэсаў», — удакладніў пазіцыю кіраўніцтва міністэрства Генадзь Аксціловіч.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Ячмень фуражный в количестве 5 000 кг, начальная стоимость лота – 562,50 белорусского рубля** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Коммунальное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Племенной завод Реконструктор» |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, г. Орша, ул. Кирова, 34. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к заместителю директора ОАО «Оршанский КХП» Банадысеву Андрею Александровичу, тел. 8 (029) 510-09-04 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 13 октября 2016 года в 14.30 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 12 октября 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# УНІКАЛЬНАЕ БАГАЦЦЕ ПАЛЕСКАЙ ЗЯМЛІ



Фота БЕЛТА.

Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» пройдзе 24 верасня ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна

**У мерапрыемствах фэсту возьмуць удзел больш за 20 творчых калектываў, майстры і рамеснікі з 8 раёнаў Гомельскай (Жыткавіцкі, Ельскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Хойніцкі) і 3 раёнаў Брэсцкай (Лунінецкі, Пінскі, Столінскі) абласцей, а таксама калектыў Нацыянальнага парку «Прыпяцкі».**

Яны прадставяць на падворках фрагменты старадаўніх летніх і восеньскіх каляндарна-земляробчых і сямейна-бытавых свят і абрадаў, выступяць у канцэрце-прэзентацыі разнажанравых узораў фальклору. Згодна з канцэпцыяй падворкаў, усе яны складуць адну палескую вёску, дзе кожны раён будзе насіць пэўную назву вуліцы, якая адлюстроўвае яе змест.

Урачыстае адкрыццё фэсту пачнецца з цырымоніі ўручэння статуэткі-сімвала «Ганаровы паляшук». Упершыню ў межах «Поклічу Палесся» пройдзе фестываль юных майстроў «Перазвон талентаў» з удзелам дзяцей, якія прадэманструюць розныя віды рамёстваў, творы дэкаратыўна-прыкладной творчасці, закліканыя прыцягнуць увагу да ідэі захавання самабытнай культуры праз бесперапыннасць перадачы традыцый ад старэйшага пакалення да малодшага. Будзе працаваць літаратурна-тэатральная пляцоўка «Адвечны спеў зямлі палескай».

Бліжэй да вечара адбудзецца II конкурс прыгажосці «Палеская прыгажуня-2016», які будзе папярэднічаць канцэрту песенных і харэаграфічных калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Літвы, Малдовы і Кітая.

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне арганізатарам, удзельнікам і гасцям IV Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады свайго існавання гэтае свята стала адным з цэнтраў прыцягнення талентаў, а таксама пляцоўкай для зацікаўленай размовы аб тым, як зрабіць палескі рэгіён і краіну прывабнымі для замежных гасцей, інвестараў, дзелавых людзей.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# ЦЁПЛЫ ПРЫЁМ

## Беларускія параалімпійцы вярнуліся дадому

**У чацвер вечарам у Нацыянальным аэрапорце Мінск сабралася добрая сотня людзей з кветкамі, віншаваннямі і вітальнымі плакатамі — усе яны чакалі сваіх герояў, якія нарэшце вярнуліся з гарачай Бразіліі.**



На Гульнях беларусы заваявалі 10 узнагарод, прычым 8 з іх — найвышэйшай пробы. З 21 атлета 19 увайшлі ў васьмёрку наймацнейшых, а ў агульнакамандным заліку наша зборная заняла 19 месца.

*— Вынікі выступлення, безумоўна, станоўчыя,* — адзначае **старшыня Параалімпійскага камітэта краіны Алег ШЭПЕЛЬ.** *— Перад ад'ездам у Рыа мы разлічвалі на гэта. Самае галоўнае дасягненне — гэта тое, што па якасці медалёў мы трапілі ў 20 наймацнейшых каманд з 170 краін, якія там бралі ўдзел. Другое, што з 21 спартсмена 19 выйшлі ў фінал, гэта сведчыць аб тым, што мы не павезлі туды турыстаў, а павезлі людзей, якія гатовы змагацца і праслаўляць сваю краіну. Вядома, асабліва хочацца адзначыць выступленне Ігара Бокія, шасціразовага алімпійскага чэмпіёна. Меркавалі, што плывец удала выступіць у Рыа, ён быў добра гатовы, але каб шэсць залатых медалёў ... Малайчына!* — рэзюмаваў Шэпель.

Сам герой сёлетняй Параалімпіяды відавочна не чакаў такой пышнай сустрэчы ў аэрапорце. Акрамя спартыўных заўзятараў і кіраўнікоў, Ігара сустракала ўся сям'я: мама, тата, брат і каханая дзяўчына. Нягледзячы на складаны і доўгі пералёт, Ігар пастараўся ўдзяліць увагу кожнаму журналісту і жадаючаму атрымаць аўтограф або фотаздымак з героем.

*— Пасля першага старту прыйшла ўпэўненасць, пачуццё таго, што ўсё залежыць толькі ад цябе. У 2012 годзе мне было 18, у Лондан ехаў без хваляванця. А ў Рыа выступаў з вялікім пачуццём адказнасці, таму што ўжо быў пяціразовым параалімпійскім чэмпіёнам. Многія людзі верылі ў мяне, вядома, не хацелася іх падводзіць. Ехаў у Бразілію з планам выступіць не горш, чым у Лондане, атрымалася яшчэ лепш. Усе ў захапленні, і трэнеры, і я сам задаволены выступленнем.*




Не толькі на радзіме, але і там, у далёкай Бразіліі, нашага Ігара Бокія назвалі самым яркім спартсменам Параалімпіяды-2016, таму не дзіўна, што беларус не змог пазбегнуць параўнанняў з легендарным Майклам Фелпсам.

*— Амерыканскі плывец унікальны. Думаю, не варта нас параўноўваць. І Майкл Фелпс, і я прыкладаем максімум намаганняў, каб дасягнуць высокіх вынікаў,* — адзначыў Ігар.

Акрамя Бокія на верхнюю прыступку п'едэстала ў Рыа падымаліся Уладзімір Ізотаў, таксама ў плаванні, і Андрэй Праневіч — ён стаў найлепшым у фехтаванні на калясках.

Мама Андрэя Валянціна яшчэ да прызямлення самалёта з хваляваннем успамінае, як яе сын ішоў да гэтай перамогі.

*— Ён ішоў да яе цэлых сем гадоў. Пачаў займацца гэтым відам фехтавання, вядома, позна, таму было нялёгка. На лонданскую Параалімпіяду не трапіў — не адабраўся, на той момант у яго не было высокіх вынікаў, а вось апошні год толькі і жыў Параалімпіядай у Бразіліі.*

Сам залаты медаліст Рыа быццам бы яшчэ там, у фінальным паядынку, эмоцыі настолькі свежыя, што Андрэй з цяжкасцю іх стрымлівае, расказваючы пра сваю перамогу.

— Я проста ў шоку, дагэтуль адысці не магу. Цяжка апісаць тое, што я адчуваў у тыя секунды, якіх эмоцый толькі не было. Пераможны паядынак быў вельмі напружаны і складаны, сапернік вельмі моцны і тытулаваны, таму выйграць у яго было ўдвая прыемна. Зараз магу адназначна сказаць, што гэта галоўная перамога ў маім жыцці. Як і любы спартсмен, я імкнуўся трапіць на Параалімпіяду і выйграць алімпійскае «золата». Атрымалася.

«Бронзу» ў скарбонку нашай каманды паклаў дасведчаны лёгкаатлет Аляксандр Трыпуць. Гэты алімпійскі медаль, па прызнанні спартсмена, перш за ўсё, з'яўляецца для яго прыкметай вяртання ў спорт, а вяртацца, як вядома, ніколі не бывае лёгка.

Такія высокія дасягненні нашых параалімпійцаў яшчэ раз даказваюць усяму свету, што непераадольных перашкод не існуе.

Наступныя летнія Алімпійскія і Параалімпійскія гульні пройдуць у Токіа праз чатыры гады.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Добрая справа

# ПАДАРУНАК — АД ТАТЫ ТРАЙНЯТ

**Ключы ад шасці аўтамабіляў «Газель», спецыяльна перабсталяваных пад сацыяльны транспарт для інвалідаў-калясачнікаў, перадаў кіраўнікам дамоў-інтэрнатаў для інвалідаў і ветэранаў працы Беларускі саюз жанчын. Такі падарунак БСЖ атрымаў ад кіраўніка расійскай групы кампаній «Сансіці» Мікалая Уласюка ў межах дабрачыннага руху «З любоўю да Беларусі», ініцыяванага саюзам.**

Салоны «Газеляў» часткова пазбаўлены пасажырскіх крэслаў, каб вызваліць месца для калясак. Для іх фіксацыі на падлозе машын усталяваны спецыяльныя крапежныя элементы. Прадугледжана дадатковае асвятленне салона і падножак. Для бяспечнай пагрузкі інвалідаў зроблены электрагідрападʼёмнікі з пультам кіравання.

— Дырэктары інтэрнатаў будуць выкарыстоўваць гэтыя аўтамабілі, каб людзі маглі праехаць па нашай краіне, пабываць у сталіцы, наведаць музеі, далучыцца да беларускіх культурных падзей. А магчыма, выехаць і за межы Беларусі, напрыклад у тую ж Маскву, — выказала спадзяванні **Марыяна ШЧОТКІНА, старшыня Беларускага саюза жанчын.** — Тое, што гэтыя аўтобусы зараз стаяць тут, што яны абсталяваны па самым апошнім слове тэхнікі, — усё гэта дзякуючы неабыякавасці людзей. Атрымоўваючы гэты транспарт, мы думалі таксама і пра нашых дзяцей. Бо з дапамогай спецыяльных аўто яны змогуць ездзіць на трэніроўкі і займацца спортам і, магчыма, з іх у будучым вырастуць нашы параалімпійскія зоркі.

Расійскі мецэнат, які мае беларускія карані і нядаўна стаў бацькам трайнят, трымаўся сарамліва і шчыра ўсміхаўся. Атрымаўшы ад БСЖ удзячнае пісьмо за дапамогу, ён сказаў, што «шчаслівы, што можа быць карысным для сваёй радзімы, і рады, што яго грамадзянскі парыў знайшоў падтрымку ў саюза».

Аўтамабілі ГАЗ-3221 агульным коштам $125 тыс. атрымалі кіраўнікі Віцебскага, Гродзенскага, Лагойскага, Расцянскага, Ляснянскага дамоў-інтэрнатаў і дома-інтэрната «Шубіна» ў Гомельскай вобласці.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Са святам!

# Маладосць даўжынёй у 160 гадоў

## Фаніпаль сёння адзначае свята горада

**Сваю гісторыю ён пачаў у 1856 годзе як былое ўладанне памешчыкаў Энельфельдта і Багдашэўскага (фальварак у Самахвалавіцкай воласці Мінскага павета). Гэтае першае ўпамінанне занесена ў дакументы Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь. За гэты час горад значна абнавіўся. У ім пабудаваны адзіны ў краіне завод жалезабетонных маставых канструкцый. А да 2020 года плануецца рэканструяваць пасажырскую інфраструктуру на ўчастку Мінск-Пасажырскі — Койданава і арганізаваць курсіраванне цягнікоў гарадскіх ліній.**

**Старшыня Фаніпальскага гарвыканкама Людміла КАЛІНІЧ** віншуе гараджан са святам і запрашае іх адзначыць яго разам на вуліцах горада. Мерапрыемствы для фаніпальцаў разгарнуцца на шасці пляцоўках адначасова. Акрамя традыцыйных святочных канцэртаў, для жыхароў будзе арганізавана творчая візітка прадпрыемстваў горада «Цудоўная пяцёрка».

На вуліцах Фаніпаля пройдзе незвычайны парад дзіцячых калясак. Ён абяцае здзівіць гараджан творчым падыходам да гэтага неабходнага для маладых бацькоў сродку перамяшчэння немаўлят. А для тых, хто ўжо ганяе на двух колах, будзе арганізаваны велапарад. Рыцарскія турніры, майстар-класы ад Фаніпальскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, спартыўныя сустрэчы па сілавым экстрыме і армрэслінгу зацікаваць жыхароў. Завяршыць святочны дзень піратэхнічнае шоу з даху Фаніпальскага гарвыканкама.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Кампус

# ПРАВА + ТАЛЕРАНТНАСЦЬ

**XI Міжнародная юрыдычная алімпіяда «Моладзь за мір» пройдзе ў Міжнародным універсітэце «МІТСО» з 26 па 30 верасня.**

Сёлета ў інтэлектуальных спаборніцтвах прымуць удзел прадстаўнікі 9 краін: Вялікабрытаніі, Германіі, Нідэрландаў, Францыі, Кубы, Кітая, Малдовы і іншых.

Міжнародная юрыдычная алімпіяда «Моладзь за мір» — унікальны праект для нашай краіны, які не мае аналагаў ва Усходняй Еўропе і СНД і ўваходзіць у тройку самых прэстыжных еўрапейскіх конкурсаў па міжнародным праве. За дзесяцігадовую гісторыю яе ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі больш як 40 краін свету: студэнты найлепшых юрыдычных школ з Вялікабрытаніі, Швецыі, Францыі, Кубы, Індыі, Нідэрландаў...

Штогод у якасці членаў журы ў алімпіядзе прымаюць удзел вядучыя замежныя эксперты па міжнародным праве.

Арганізатарам праекта выступае Міжнародны універсітэт «МІТСО» пры падтрымцы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# СТАРЫ НОВЫ ХРАМ



Так выглядала царква раней.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведаміў карэспандэнту газеты **намеснік пракурора Камянецкага раёна Аляксандр ВЯРБІЦКІ**, праверкай займаўся раённы аддзел унутраных спраў. Падчас яе правядзення высветлілася, што рэстаўрацыйныя работы вядуцца з дазволу Міністэрства культуры краіны, ёсць праектна-каштарысная дакументацыя, ажыццяўляецца навуковае кіраўніцтва праектам, як таго патрабуе закон. Такім чынам, у ходзе праверкі ўстаноўлена адсутнасць складу правапарушэння.

— Калі сказаць прасцей, — працягвае Аляксандр Міхайлавіч, — то кроквы царквы былі фактычна ў аварыйным стане, надзвычайнае здарэнне мог справакаваць нават моцны вецер. Таму рашэнне аб рэканструкцыі ўяўляецца своечасовым. А патрабаванне закона аб захаванні тэхналогіі рэстаўрацыйных работ выконваецца. На сённяшні дзень у праваахоўных органаў пытанняў да правядзення рэстаўрацыі помніка культуры няма.

...Для таго каб упэўніцца ў правільнасці і своечасовасці пачатку рэстаўрацыі, дастаткова пабыць на месцы. Рыштаванні новабудоўлі відаць здалёк. Старыя бярвёны складзены крыху наводдаль ад будаўнічай пляцоўкі храма. Некаторыя з іх настолькі раз'едзеныя шашалем і трухлявыя, што страцілі паўкруглую форму і тырчаць вострымі абломкамі. Тое, што некалі было дрэвам, зараз можна разбурыць адной рукой. Яны відавочна адслужылі свой век.

Ды па-сапраўднаму радуе вока будынак, які літаральна ўздымаецца на вачах. Сцены новай царквы ўжо складзены амаль пад дах. Стаіць храм на ўзгорку, акружаны соснамі, унізе метраў за трыста цячэ рака Лясная. Для царквы некалі продкі выбралі вельмі маляўнічы куток недалёка ад Белавежскай пушчы. Сюды трапляеш, і душа пачынае радавацца. А светлыя драўляныя сцены ў промнях ранішняга сонца толькі дадаюць аптымізму.

На будоўлі шчыруюць мужчыны. У асноўным сюды прыходзяць дапамагаць мясцовыя жыхары, як яны самі сябе азначылі, прыхаджане. Кіруе працэсам, можна сказаць, выконвае абавязкі прараба Аляксандр Мінчык.



**Аляксандр МІНЧЫК *(справа)* і Аляксандр САЛОДКІ спецыяльна прыехалі ў вёску дзеля будоўлі.**

Аляксандр Мікалаевіч прыехаў дапамагчы з Баранавіцкага раёна. Ён і сталяр, і цясляр. Расказаў, што большая частка працоўнай біяграфіі была звязана з домабудаўнічым камбінатам, будаваў дамы для людзей. Але з 15 гадоў дапамагаў сваяку, які займаўся ўзвядзеннем і адраджэннем храмаў. У яго і навучыўся. Апошнія гады працаваў у адной з баранавіцкіх рэстаўрацыйных фірм. Адраджалі касцёлы і праваслаўныя цэрквы ў Баранавіцкім раёне. Зараз выйшаў на пенсію і адклікнуўся на просьбу аб дапамозе.

— Як яны на мяне выйшлі, не ведаю, — расказвае Аляксандр Мінчык. — Аднойчы на мой тэлефон пазванілі актывісты гэтага прыходу і спыталі, ці не мог бы я дапамагчы на будоўлі. Рашыў гэта зрабіць ад чыстага сэрца, дзеля Боскай славы. Таму я тут сёння. Разам са мной прыехаў Аляксандр Салодкі, з якім раней працавалі ў іншых храмах.

Спрактыкаваны цясляр гаворыць, што аб'ект гэты надзвычай складаны. Паводле праекта будаўнікі мусяць аднавіць будынак у фармаце «адзін да аднаго» з тым, як было ў XVIII стагоддзі. Самым мудрагелістым у тэхналогіі будаўніцтва продкаў цяпер здаюцца вуглы — так званыя французскія і нямецкія, якія і выкарыстаны пры ўзвядзенні храма ў Малых Мурынах. Цяпер гэтыя вуглы фактычна выведзены. Калі сцены будуць поўнасцю гатовыя, што будаўнікі плануюць зрабіць да халадоў, Аляксандр плане вярнуцца дадому. На яго думку, спецыялістаў па даху знайсці лягчэй, чым тых, хто правільна зробіць сцены.

Аляксандр Мінчык сказаў, што месца тут цудоўнае, жыватворнае, намоленае, гэта адчуваецца, бо і дыхаецца лёгка, і працуецца добра. Як майстар сваёй справы і чалавек веруючы, ён упэўнены, што храм хутка адкрые дзверы для прыхаджан. Не без Божай дапамогі, вядома.



**Ніна МУРЫН рада, што царква адраджаецца.**

Шкада, што не ўдалося ў гэты дзень сустрэцца з айцом Валянцінам, хоць папярэдняя дамоўленасць была. Але яго занятасць зразумелая, вясковы святар цяпер на гэтай будоўлі і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц. Дастаткова сказаць, што рэстаўрацыя храма вядзецца на ахвяраванні прыхаджан і сродкі спонсараў. Няцяжка здагадацца, што па цяперашнім часе знайсці і сабраць тыя сродкі каштуе вялікіх намаганняў. А яшчэ трэба на кожны дзень знайсці і арганізаваць людзей — усім займаецца вясковы бацюшка.

Але ж галоўнае відавочна: царква ў Малых Мурынах узводзіцца на сваім старым месцы, яна знешне будзе такой, як была раней і як яе накрэсліў у чарцяжах спецыяліст кампаніі «РэстаўрацыяІнвест».

— Гэта ўнікальны досвед нават не толькі для Брэсцкай вобласці, але і для краіны ў цэлым, — сказаў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Вячаслаў ГАРБУЗАЎ**. — План правядзення работ прайшоў неабходныя ўзгадненні ў Міністэрстве культуры. Храм вырашана адраджаць з выкарыстаннем тэхналогій XVIII стагоддзя.

Спецыялісты спачатку наноў залілі фундамент, потым пачалі ўзводзіць сцены. Іх складаюць з адмысловых бярвёнаў, якія перакладваюцца мохам. Тыя з элементаў старой царквы, якія найлепш захаваліся, выкарыстоўваюцца пры будаўніцтве. Плануецца, што работа будзе завершана бліжэй да канца 2017 года.

— Трэба аддаць належнае святару і актывістам прыходу, — працягвае Вячаслаў Іванавіч, — што ўзяліся за нялёгкую справу адраджэння. У нас ёсць прыклады, калі побач з драўлянай царквой узводзяць за сродкі калгаса новы будынак з цэглы альбо блокаў, а стары намолены храм застаецца дагніваць і разбурацца. А тут мы маем прыклад беражлівага стаўлення да культавага збудавання, якое з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры.

Адна са старэйшых жыхарак вёскі Малыя Мурыны 85-гадовая Ніна Мурын вельмі рада таму, што іх вясковы храм адраджаецца.

— Я тут нарадзілася, — расказала Ніна Аляксееўна. — У гэтай царкве хрысцілі не толькі мяне, але і маіх бацькоў. Пакуль дазваляла здароўе, я спявала ў царкоўным хоры, пэўны час нават кіравала пеўчымі жанчынамі. Дай Бог здароўя нашаму айцу Валянціну, што ўзяўся перабудоўваць царкву. Туды ўжо страшна было хадзіць, каб не абвалілася. А цяпер... калі дажыву, то схаджу на службу ў наш новы храм.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Камянецкі раён.*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Борисовхлебпром» на праве собственности**

| Лот № 1 | Здание насосной башни (620/С-33103) | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1 | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 6 960,00 | 696,00 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

Здание насосной башни с инвентарным номером 620/С-33103. Назначение: Здание неустановленного назначения.
Год постройки – 1959. Число этажей – 1. Общая площадь – 21,1 кв. м. Площадь застройки – 33 кв.м. Санитарно- и электротехн. работы: электроосвещение – открытая проводка; вентиляция – естественная.
Составные части и принадлежности: кирпичное одноэтажное здание насосной башни В1/к

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,7661 га с кадастровым номером 622250100001002286. Целевое назначение: содержание и обслуживание зданий и сооружений участка по производству хлебобулочных и кондитерских изделий. Право постоянного пользования.
Описание права, ограничения (обременения) прав: на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи (напряжением свыше 1000 вольт), площадь 0,0190 га, сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1230 га; сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,0344 га; сетей и сооружений канализации, площадь 0,2168 га.
На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 15 (пятнадцати) календарных с момента подписания протокола о результатах аукциона дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Объекта, согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи Объекта.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 10% (Десяти процентов) от цены продажи Лота №1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 26.10.2016 в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, расположенного по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1, проводимом 26 октября 2016 г. Организация и проведение аукциона, оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **24.10.2016 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактные лица для осмотра Объекта аукциона: Толстик Сергей Аликович, 8 (029) 302-72-86.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • e-mail: torgi@ino.by**


## ■ Добрая навіна

# Arrivederci, ці Да пабачэння!

**Першы ў гісторыі беларускага мовазнаўства «Італьяна-беларускі слоўнік» будзе створаны ў Нацыянальнай акадэміі навук.**

Новы праект абмяркоўвалі падчас асабістай сустрэчы старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў і Пасол Італьянскай Рэспублікі ў нашай краіне Стафана Біянкі.

Ініцыятарам стварэння слоўніка выступіў Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук. Праект быў заяўлены на конкурс міжнародных праектаў, які штогод праводзіць Міністэрства замежных спраў і міжнароднага супрацоўніцтва Італіі, дзе стаў пераможцам.

Слоўнік прызначаны для перакладу з італьянскай на беларускую мову тэкстаў розных жанраў і стыляў, у першую чаргу, мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры. У яго плануецца ўключыць 35 тысяч найбольш часта ўжывальных італьянскіх слоў, а таксама прыклады іх выкарыстання. Аб'ём слоўніка складзе каля 800 старонак друкаванага тэксту.

У рамках кластара «Міжнародная школа беларускай мовы і літаратуры» ўжо створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы слоўніка і аўтарскі калектыў, у склад якога ўвайшлі вядучыя спецыялісты ў галіне беларускай і італьянскай моў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кафедры італьянскай мовы БДУ і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. На стварэнне слоўніка адводзіцца два гады.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Рожь продовольственная в количестве 70 000 кг, начальная стоимость лота – 9100 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Унитарное сельскохозяйственное предприятие коммунальной собственности «Надежино» |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, г. Орша, ул. Кирова, 34. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к заместителю директора ОАО «Оршанский КХП» Банадысеву Андрею Александровичу, тел. 8 (029) 510-09-04 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 13 октября 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 12 октября 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

■ Без бар'ераў!

# ІНКЛЮЗІЯ, А НЕ ІЛЮЗІЯ

## Як стварыць школу, у якой будзе ўтульна ўсім?

**Ці многія з бацькоў гатовыя да сітуацыі, калі побач з іх сынам ці дачкой у звычайным класе будуць навучацца дзеці з расстройствамі аўтыстычнага спектра ці, скажам, «сонечныя дзеці» з хваробай Даўна? А ці гатовыя да гэтага педагогі?**
**Праблему існавання штучных бар'ераў у безбар'ерным асяроддзі ўзнімаў на жнівеньскім форуме педагагічных работнікаў старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК.**
**— Нашу сістэму адукацыі вылучае вялікі гуманістычны патэнцыял, гэта тычыцца ў першую чаргу ўключэння ў агульнаадукацыйны працэс дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, колькасць якіх пастаянна расце. Але ўсе нашы намаганні (матэрыяльныя, кадравыя і кіраўніцкія) не дадуць чаканага эфекту, пакуль не знікнуць псіхалагічныя бар'еры ў дачыненні да дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Дзеці гатовы быць побач адно з адным: пытанне, хутчэй, у бацьках, педагогах і людзях, што іх акружаюць. Яны ствараюць бар'еры ў безбар'ерным асяроддзі — псіхалагічныя, маральна-духоўныя і фізічныя, — канстатаваў Міхаіл Мірончык.**
**Вопыт, праблемы і перспектывы інклюзіўнай адукацыі аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага семінара, арганізаванага Міністэрствам адукацыі сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі. Сваім досведам з беларускімі педагогамі падзяліліся спецыялісты з Чэхіі, Аўстрыі і Славакіі.**


Фота БЕЛТА.
**Урок у 13-й спецыяльнай школе г. Мінска для дзяцей з парушэннямі слыху.**

### ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПШ

**Іржы ТРУНДА — дырэктар пачатковай школы «Вратыслаўска» горада Прагі, доктар педагагічных навук,** прызнаецца, што калі дваццаць гадоў таму яму ўпершыню ў педагагічнай практыцы давялося сутыкнуцца з дзецьмі з асаблівасцямі ў развіцці, ён быў да гэтага не падрыхтаваны.

— Па-першае, я сам з'яўляюся прадуктам эксклюзіўнай школы, — жартуе ён. — Спачатку — вучоба ў элітнай навучальнай установе, затым — у прэстыжным універсітэце ў Празе. Па-другое, у маім акружэнні ніколі не было дзяцей з асаблівымі патрэбамі, таму і досведу ўвогуле ніякага не было. Па-трэцяе, ідэі інклюзіўнага навучання яшчэ не былі сфармуляваныя ў чэшскім грамадстве. Таму ўвесь шлях — ад першай да апошняй прыступкі — мне прыйшлося прайсці самастойна...

Трэба патлумачыць, што ў пачатковай школе ў Чэхіі вучацца дзеці ва ўзросце ад 6 да 15 гадоў (з 1-га па 9-ты клас). Іржы Трунда суправаджаў свой клас з першага года навучання і да яго выпуску з базавай школы, што дало яму магчымасць назіраць развіццё дзяцей у калектыве даволі працяглы час.

— 20 гадоў таму, калі я быў прызначаны настаўнікам у першы клас, я даведаўся, што ў мяне будзе навучацца хлопчык з сур'ёзнымі ментальнымі асаблівасцямі (адхіленнямі ў разумовым развіцці. — **Аўт.**). Затым яшчэ ў аднаго вучня быў выяўлены рак, і пасля аперацыйнага ўмяшання яго інтэлектуальныя здольнасці таксама моцна пацярпелі. Былі ў калектыве і іншыя дзеці з расстройствамі, — расказвае спадар Трунда. — На вучня з ментальнымі асаблівасцямі псіхолагі прапанавалі мне махнуць рукой яшчэ ў трэцім класе. Маўляў, ніякага толку ўсё роўна не будзе, і наперадзе яго чакае жыццё на сацыяльную дапамогу. Па апошніх звестках медыцынскай навукі, інтэлект гэтага хлопца так і застанецца на ўзроўні дзевяці-дзесяцігадовага хлопчыка. Але сёння я магу з упэўненасцю сказаць, што нашы намаганні не былі марнымі. Малады чалавек працуе цяпер у сетцы хуткага харчавання, дзе выконвае даволі простую фізічную работу. Менеджарам ён і насамрэч ніколі не стане, затое ён не стаў абузай ні для грамадства, ні для ўласнай сям'і: сам сябе ўтрымлівае і вядзе жыццё звычайнага чалавека. Другі хлопец, у якога быў выяўлены ў дзяцінстве рак мозга, цяпер працуе ў Нарвегіі ў будаўнічай кампаніі. І, як я пераканаўся на сустрэчы выпускнікоў, мае былыя вучні па-ранейшаму адчуваюць сябе адзіным калектывам і не выкрэсліваюць са свайго жыцця сваіх асаблівых аднакласнікаў, хоць усе яны ўжо дарослыя людзі. Для мяне, напэўна, гэта найвышэйшая ўзнагарода за маю працу.

> **«Сэнс не ў тым, каб усе рабілі ўсё аднолькава, а ў тым, каб мы магчымасці кожнага разумелі і прымалі».**

Адным са складнікаў поспеху Іржы Трунда лічыць тую акалічнасць, што звычайныя дзеці і дзеці з асаблівымі патрэбамі аказаліся ў адным класе літаральна з першага года навучання. Праўда, спадар Трунда ўпэўнены, што звычайных дзяцей увогуле не існуе. «Пакажыце мне хоць адно звычайнае дзіця, — кажа ён. — Усе дзеці — асаблівыя, і было б проста выдатна, калі б для ўсіх вучняў ствараліся індывідуальныя планы іх навучання і развіцця».

— Калі дзеці ідуць у школу, яны ведаюць, што там будуць іншыя дзеці, таму спакойна ставяцца да ўсіх. Не думаю, што мае вучні так добра прынялі б сваіх асаблівых равеснікаў, калі б тыя з'явіліся, скажам, у сёмым класе. Таму інклюзію трэба ўкараняць як мага раней, пачынаючы з першых гадоў навучання дзіцяці.

### АЦЭНКА ДЛЯ «АСАБЛІВАГА» ВУЧНЯ

Дырэктар школы прызнаецца, што па першым часе самым актыўным на ўроках быў ён сам, пакуль не зразумеў, што актыўнымі павінны быць, найперш, дзеці. А для гэтага трэба пашыраць пералік педагагічных прыёмаў... Калі «асаблівае» дзіця актыўнае ўсяго 2-3 хвіліны, то для яго ўрок — гэта змарнаваны час. Значна больш карысці для здароўя будзе, калі яно паганяе мяч.

Адно з самых складаных пытанняў, якое паўстае перад педагогам — як ацэньваць вучня са спецыфічнымі патрэбамі, і, галоўнае, як патлумачыць гэту ацэнку астатнім?

— Мне давялося прыдумаць гісторыю. Быццам бы ў майго сябра ў класе вучыцца хлопчык, які страціў у выніку аварыі нагу, — дзеліцца сваім досведам Іржы Трунда. — Сябра — настаўнік фізкультуры, таму яго вучні займаюцца на ўроках бегам. «Як вы думаеце, хто ў гэтым класе будзе атрымліваць самыя нізкія адзнакі за тое, што самы марудны?» — задаў я пытанне сваім вучням і сам жа на яго адказаў: «Ну, канешне, хлопчык з пратэзам!» Мае дзеці вырашылі, што іх настаўнік звар'яцеў, і самі сталі фармуляваць думку, якую я хацеў да іх давесці: што ёсць сітуацыі, у якіх нельга ўсіх аднолькава ацэньваць. Дзеці са спецыфічнымі патрэбамі даволі часта хаваюцца за сваёй асаблівасцю, таму трэба адразу ім зразумець: не варта спадзявацца, што ты будзеш адседжвацца за спінамі аднакласнікаў. Трэба прыкладаць намаганні і старацца ў меру сваіх індывідуальных магчымасцяў. Рабіць за іх нічога катэгарычна нельга, хоць настаўніку так прасцей. Задача педагога — дапамагчы, паспрыяць, каб асаблівы вучань зрабіў усё сам. Універсальнага ключа для ўсіх не існуе — да кожнага асаблівага вучня трэба шукаць свой падыход.

Сітуацыю з інклюзіяй дваццаць гадоў таму і сёння нельга нават параўноўваць. Усё часцей побач са звычайнымі дзецьмі ў класе вучацца асаблівыя дзеці.

— Ва ўніверсітэце, дзе я выкладаю, ужо таксама з'явіліся студэнты з асаблівасцямі, — кажа спадар Трунда. — І ўсё ж такі многія педагогі па-ранейшаму вельмі насцярожана ставяцца да інклюзіі. І гэтаму ёсць тлумачэнне. Працу педагога грамадства ацэньвае па паспяховасці яго вучняў. Натуральна, што настаўнікі жадаюць быць паспяховымі, а для іх поспех — гэта перамогі вучняў на алімпіядзе і паступленне ва ўніверсітэт. «Асаблівыя» дзеці не будуць прыносіць ім дыпломы і медалі, і з гэтым трэба змірыцца. Але іх сацыялізацыя ў грамадстве каштуе нашмат даражэй. Ёсць і яшчэ адно распаўсюджанае меркаванне — быццам бы прысутнасць дзяцей з асаблівымі патрэбамі ў класе дрэнна адбіваецца на поспехах іх аднакласнікаў. **Сярод выпускнікоў майго «асаблівага» класа адзін малады чалавек цяпер навучаецца ва ўніверсітэце ў Кембрыджы, а другі — ва ўніверсітэце ў Нью-Ёрку. І для мяне гэта акалічнасць лепш чым усякія даследаванні даказвае, што дзіця са спецыяльнымі патрэбамі не можа быць тормазам для іншых.** Усё залежыць ад падыходаў настаўніка, які працуе ў такім класе.

Сёння Іржы Трунда ўзначальвае базавую школу, у якой налічваецца 305 вучняў, і ў 52 з іх — індывідуальная адукацыйная праграма. Над стварэннем такой праграмы працуюць школьны псіхолаг, спецыяльны педагог, класны кіраўнік, асістэнт педагога пры ўдзеле бацькоў. Ёсць сярод вучняў дзеці не толькі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, але і дзеці з рознымі іншымі спецыфічнымі адукацыйнымі і сацыяльнымі патрэбамі, напрыклад, дзеці з цыганскіх сем'яў, для якіх адукацыя не з'яўляецца каштоўнасцю, дзеці імігрантаў з Украіны, Расіі, В'етнама, якія не валодаюць чэшскай мовай...

Закон «Аб адукацыі» ў Чэхіі фактычна настойвае на ўкараненні інклюзіўнага навучання, але Іржы Трунда ўпэўнены, што прымус зверху не спрацуе — трэба распачынаць з настаўнікаў, паступова змяняючы іх свядомасць...

Дакладнае разуменне таго, што кожны чалавек мае права і можа быць уключаным у нармальнае жыццё, — адзін з самых галоўных пастулатаў інклюзіўнай адукацыі. Інклюзія — працэс, які закранае не толькі сферу адукацыі. Ён закліканы разбураць бар'еры ў свядомасці грамадства, рабіць яго больш талерантным, гуманным і адкрытым да любой разнастайнасці...

На ўсёй планеце ўзрастае разуменне правоў чалавека — права кожнага чалавека быць уключаным у грамадскае жыццё, атрымліваць адукацыю, мець нармальную сям'ю, належны ўзровень даходаў і г.д. Інклюзіўная адукацыя з'яўляецца лагічным працягам сусветных тэндэнцый на збліжэнне і інтэграцыю.

### ЗРАЗУМЕЦЬ І ПРЫНЯЦЬ

**Выкладчык Педагагічнага ўніверсітэта горада Ціроля (Аўстрыя), доктар педагагічных навук Вольфганг ЗІБЕРЭР** прызнаецца: «Я, як дэфектолаг, калі размаўляю з дзіцем, звяртаю ўвагу не на яго патэнцыял, а бачу толькі яго дэфект. **Калі едзеш у аўтобусе і глядзіш у акно, то можна ўбачыць прыгожы пейзаж удалечыні ці, наадварот, бруднае шкло — сляды, што пакінулі на акне кроплі вады. Усё залежыць, ад таго, пад якім вуглом глядзець і што ты хочаш убачыць...»**

У Аўстрыі, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, ёсць школы, якія вельмі істотна прасунуліся ва ўкараненні інклюзіі, але хапае і школ, якія знаходзяцца толькі ў самым пачатку шляху і дзе да ідэі сумеснага навучання звычайных і «асаблівых» дзяцей ставяцца пакуль насцярожана. Хоць апошнім часам з'яўляецца ўсё больш прыкладаў, якія натхняюць прыхільнікаў ідэі інклюзіі. Адзін з самых яскравых — лёс аўстрыйскага хлопчыка, які нарадзіўся без рук і ног, тым не менш ён скончыў не толькі школу, але і ўніверсітэт. Цяпер Георг працуе ў Вене ў шматпрофільным шпіталі клінічным псіхолагам.

— Толькі ўявіце сабе эфект, калі ў палаце ў пацыента, які страціў ногі ў выніку аварыі, з'яўляецца такі спецыяліст, — кажа Вольфганг Зіберэр. — Усім вядома і імя Пабла Пінеда. Гэта першы ў Еўропе чалавек з сіндромам Даўна, які разбурыў усе забабоны і скончыў універсітэт, дзе вывучаў педагогіку і псіхалогію. Сёння ён працуе настаўнікам у пачатковай школе і здымаецца ў кіно, сыграў галоўную ролю ў кінастужцы «Я таксама», мае міжнародную кінаўзнагароду.

«Для мяне інклюзія — гэта вялікі хор з сімфанічным аркестрам, дзе мы ўсе разам рэпеціруем і спрабуем стварыць музыкальны шэдэўр, — прызнаецца Вольфганг. — Сэнс не ў тым, каб усе рабілі ўсё аднолькава, а ў тым, каб мы магчымасці кожнага разумелі і прымалі».

Дарэчы, развіццё сучасных тэхналогій дапамагло навукоўцам зразумець, як функцыянуе і развіваецца чалавечы мозг. Праведзена шмат даследаванняў у гэтым кірунку, і іх вынікі паставілі пад сумненне той дыягнастычны інструментарый, які традыцыйна выкарыстоўваўся для ўстанаўлення разумовай адсталасці. Некаторыя спецыялісты сёння лічаць, што тое парушэнне, з-за якога мы лічым чалавека разумова адсталым, з'яўляецца проста асаблівасцю яго мыслення. І несправядліва, калі дзіця, якое мае пэўныя асаблівасці мыслення, займаецца тымі відамі дзейнасці, якія яго мала стымулююць і не развіваюць. Нават калі дзіця не можа засвоіць у поўным аб'ёме тое, што патрабуецца, педагогі павінны рабіць усё магчымае для таго, каб яно развівала свае здольнасці. Іншымі словамі, неабходна ставіць аднолькавыя адукацыйныя мэты і задачы для ўсіх дзяцей, незалежна ад парушэнняў. Пры такім падыходзе, зразумела, павышаюцца патрабаванні да настаўніка, які працуе з дзіцем, да яго майстэрства, крэатыўнасці, магчымасцяў выкарыстоўваць асістыўныя тэхналогіі, гібкія метады і формы навучання.

### НЕ ПРОСТА ПРЫГОЖАЕ СЛОВА

У Беларусі сёння на базе 8 агульнаадукацыйных устаноў рэалізуецца рэспубліканскі эксперыментальны праект па апрабацыі мадэлі інклюзіўнай адукацыі, пра што расказала **начальнік аддзела спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніна ЗМУШКО.** Зацверджана Канцэпцыя развіцця інклюзіўнай адукацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь і План мерапрыемстваў на 2016—2020 гады па яе рэалізацыі. Унесены адпаведныя змяненні ў праект новай рэдакцыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі». «Мы пераходзім да ўвасаблення ідэй інклюзіі на практыцы», — запэўнівае Антаніна Змушко.

Чым жа інклюзіўная школа адрозніваецца ад звычайнай? Сёння ўжо ёсць школы з безбар'ерным асяроддзем, але гаварыць аб тым, што ўсе яны інклюзіўныя, рана, таму што ў іх яшчэ няма адпаведнай культуры зносін, няма агульнашкольнай палітыкі ў адносінах да дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У інклюзіўнай школе фізічнае асяроддзе і адукацыйны працэс прыстасоўваюцца да патрэб дзіцяці, а ўвесь персанал мае адпаведную падрыхтоўку і паважліва адносіцца да ўсіх дзяцей з поўным разуменнем іх асаблівых праблем.

**У галоўным адукацыйным ведамстве спадзяюцца, што ў выніку эксперыментальнай дзейнасці будуць выпрацаваны агульныя рэкамендацыі па ўкараненні інклюзіўнай адукацыі ў кожнай школе і створаны алгарытм работы па поўным уключэнні асаблівых вучняў у жыццё школ. Галоўнае, каб інклюзія для нас не засталася проста прыгожым словам...**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Покупаем продукты в один клик»

## (далее – «Рекламная игра»)

**1. Организатор Рекламной игры.**

Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**2. Наименование Рекламной игры.**

Рекламная игра, проводимая Организатором, носит название «Покупаем продукты в один клик».

**3. Территория проведения Рекламной игры.**

Рекламная игра «Покупаем продукты в один клик» проводится на территории РБ на сайте e-dostavka.by.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

Рекламная игра проводится с 28 сентября 2016 года по 30 декабря 2016 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель комиссии – Реут Юрий Леонидович, директор ООО «360 медиа групп»;

Заместитель Председателя комиссии – Багдюк Алеся Вячеславовна, зам. директора ООО «360 медиа групп»;

Члены комиссии:

1. Реут Александр Станиславович, специалист ООО «360 медиа групп»;
2. Анцыперович Олеся Николаевна, Главный бухгалтер ООО «360 медиа групп»;
3. Павлович Ирина Сергеевна, специалист ООО «Бриллааре».

Данная комиссия создана для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры.

**6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Игра проводится в целях стимулирования Интернет-платежей банковскими платежными картами Visa на сайте e-dostavka.by.

**7. Участники Рекламной игры.**

7.1. Участниками Рекламной игры могут быть физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане, достигшие 18 лет (далее – «Участники»).

7.2. Участниками Игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**8. Условия участия в Рекламной игре:**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с **28 сентября 2016 по 20 декабря 2016** включительно:

8.1. Совершить с использованием любой банковской платежной карты Visa, выпущенной банками Республики Беларусь, оплату заказа через Интернет на сайте e-dostavka.by (далее – «Интернет-платеж»).

8.2. При оформлении заказа выбрать вариант оплаты «Оплатить Visa и участвовать в рекламной игре». Этим действием покупатель подтверждает свое участие в Рекламной игре, а также согласие на передачу Организатору следующих данных: ФИО (полностью), контактный телефон, почтовый адрес (будут использованы Организатором при уведомлении участника о выигрыше), дата совершения интернет-платежа.

8.3. Получить email-подтверждение о совершении интернет-платежа и сохранить его в течение всего периода проведения Рекламной игры.

Каждый интернет-платеж, соответствующий условиям Рекламной игры, участвует в розыгрыше. Один интернет-платеж может принимать участие в Рекламной игре только один раз.

Определение Участников Рекламной игры производится по каждому произведенному интернет-платежу. Порядковые номера присваиваются Организатором по дате и времени интернет-платежа.

**9. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора. Общий размер Призового фонда составляет **22 841,34** (двадцать две тысячи восемьсот сорок один рубль 34 копейки) в денежных знаках образца 2009 года, или 228 413 400 (двести двадцать восемь миллионов четыреста тринадцать тысяч четыреста) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года.

| № | Наименование | | Кол-во, шт. | Цена единицы с НДС, в денежных знаках образца 2009 года / денежных знаках образца 2000 года | Всего с НДС, в денежных знаках образца 2009 года / денежных знаках образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Планшет Samsung Galaxy Tab A 8.0 16GB LTE | Далее «планшет» | 6 | 647,00 / 6 470 000 | 3 882,00 / 38 820 000 |
| | Денежный приз для уплаты подоходного налога | | | 96,68 / 966 800 | 580,08 / 5 800 800 |
| 2 | Смартфон Samsung Galaxy A7 2016 / A710F | Далее «смартфон» | 6 | 1 019,00 / 10 190 000 | 6 114,00 / 61 140 000 |
| | Денежный приз для уплаты подоходного налога | | | 152,26 / 1 520 260 | 913,56 / 9 135 600 |
| 3 | Телевизор Samsung UE50KU6000U | Далее «телевизор» | 6 | 1 646,00 / 16 460 000 | 9 876,00 / 98 760 000 |
| | Денежный приз для уплаты подоходного налога | | | 245,95 / 2 459 500 | 1 475,70 / 14 757 000 |
| | **Итого:** | | 18 | | **22 841,34 / 228 413 400** |

**10. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравшего участника Рекламной игры.**

10.1. К моменту розыгрыша данные об Участниках Рекламной Игры (т. е. лицах, которые осуществили действия, предусмотренные п. 8 настоящих Правил) формируются в Список Участников. Каждому Участнику Рекламной игры в Списке Участников последовательно присваивается индивидуальный порядковый номер по дате и времени интернет-платежа. Все порядковые номера имеют одинаковую разрядность.

10.2. Для проведения розыгрыша используются специальный вращающийся барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Из состава Комиссии выбирается секретарь для извлечения шаров из барабана.

Определение выигрышного номера получателя Приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

10.3. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника игры в списке. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

10.4. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Списке Участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Списке Участников.

10.5. За время Рекламной игры проводится 6 (шесть) розыгрышей согласно таблице ниже. В каждом розыгрыше будет выбрано по 3 (три) победителя и будут разыграны следующие призы в указанном количестве и следующей последовательности:

1) Призы 1-ой категории – 1 планшет
2) Призы 2-ой категории – 1 смартфон
3) Призы 3-ей категории – 1 телевизор

10.6. Даты проведения розыгрышей:

| № | Даты и время проведения розыгрышей | Проводится среди Участников, которые произвели Интернет-оплату заказа картой Visa на сайте e-dostavka.by, поставив отметку о согласии участия в Рекламной игре в период с... по...: | Разыгрываемый приз |
|---|---|---|---|
| 1 | 13 октября 2016 года в 12.00 | **с 28 сентября 2016 г.** (00:00) по **11 октября 2016 г.** (23:59) включительно | В каждом розыгрыше разыгрывается: 1 планшет 1 смартфон 1 телевизор |
| 2 | 27 октября 2016 года в 12.00 | **с 12 октября 2016 г.** (00:00) по **25 октября 2016 г.** (23:59) включительно | |
| 3 | 9 ноября 2016 года в 12.00 | **с 26 октября 2016 г.** (00:00) **по 7 ноября 2016 г.** (23:59) включительно | |
| 4 | 24 ноября 2016 года в 12.00 | **с 8 ноября 2016 г.** (00:00) по **21 ноября 2016 г.** (23:59) включительно | |
| 5 | 8 декабря 2016 года в 12.00 | **с 22 ноября 2016 г.** (00:00) по **5 декабря 2016 г.** (23:59) включительно | |
| 6 | 22 декабря 2016 года в 12.00 | **с 6 декабря 2016 г.** (00:00) по **20 декабря 2016 г.** (23:59) включительно | |

Розыгрыши Призового фонда проводятся открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, Проспект Победителей, 7а, 19 этаж, офис 59.

**11. Срок и способ информирования выигравшего Участника, порядок вручения приза.**

11.1. После проведения каждого розыгрыша в течение трех рабочих дней Организатор уведомляет победителей о выигрыше приза посредством направления уведомления по e-mail и уведомлением по телефону:

Победителей 1-го розыгрыша – до 14 октября 2016 года включительно
Победителей 2-го розыгрыша – до 28 октября 2016 года включительно
Победителей 3-го розыгрыша – до 11 ноября 2016 года включительно
Победителей 4-го розыгрыша – до 25 ноября 2016 года включительно
Победителей 5-го розыгрыша – до 9 декабря 2016 года включительно
Победителей 6-го розыгрыша – до 23 декабря 2016 года включительно

11.2. Победитель каждого розыгрыша должен связаться с Организатором по телефону горячей линии +375 17 279 87 17 в период с 9:00 до 21:00 в рабочие дни:

Победители 1-го розыгрыша – до 18 октября 2016 года включительно
Победители 2-го розыгрыша – до 1 ноября 2016 года включительно
Победители 3-го розыгрыша – до 15 ноября 2016 года включительно
Победители 4-го розыгрыша – до 29 ноября 2016 года включительно
Победители 5-го розыгрыша – до 12 декабря 2016 года включительно
Победители 6-го розыгрыша – до 26 декабря 2016 года включительно

В эти же сроки Победителю необходимо предоставить следующие сведения: фамилия, имя, отчество, дата рождения, серия, номер, срок действия, дата и место выдачи документа, удостоверяющего личность;

11.3. Приз вручается Победителям лично по адресу: г. Минск, Проспект Победителей, 7а, 19 этаж, офис 59.

Победителям 1-го розыгрыша – до 24 октября 2016 года включительно
Победителям 2-го розыгрыша – до 7 ноября 2016 года включительно
Победителям 3-го розыгрыша – до 21 ноября 2016 года включительно
Победителям 4-го розыгрыша – до 5 декабря 2016 года включительно
Победителям 5-го розыгрыша – до 16 декабря 2016 года включительно
Победителям 6-го розыгрыша – до 29 декабря 2016 года включительно

При получении приза необходимо предъявить Организатору документ, удостоверяющий личность, и соответствующее email-подтверждение в отношении выигрышного Интернет-платежа. Фактом получения Победителем приза является акт передачи приза, подписанный Победителем.

11.4. В случае если Победитель каждого розыгрыша не явился за получением приза в указанные сроки (ввиду его отъезда, смены места жительства и/или телефона, болезни, не истребования уведомления из почтового отделения и др.), победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора.

11.5. Победитель вправе передать право на получение приза другому лицу в соответствии со сроками, указанными в пункте 11.2, письменно известив организатора посредством предоставления заявления с приложением копии паспорта победителя и лица, которому будет осуществляться передача приза.

11.6. Денежная компенсация стоимости приза не производится.

11.7. При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором Рекламной игры. Удержание с победителей Рекламной игры подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза – денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере.

11.8. Победители Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения приза.

11.9. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи Призов Победителям.

**12. Порядок информирования об условиях и результатах Рекламной игры.**

12.1. Правила проведения Рекламной игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Рекламной игры в газете «Звязда» до 27 сентября 2016 года (включительно), а также размещаются на сайте Организатора www.360.by.

12.2. Сведения о результатах розыгрыша публикуются до 30 декабря 2016 года включительно в газете «Звязда», а также размещаются на сайте Организатора www.360.by. Телефон для справок +375 17 279 87 17.

**13. Общие условия Рекламной игры.**

13.1. Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

13.2. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

13.3. Результаты Рекламной игры будут являться окончательными и не могут быть оспорены.

13.4. Участвуя в Рекламной игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре.

13.5. Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи приза должны быть адресованы непосредственно Организатору Рекламной игры по адресу: 220073, г. Минск, а/я 56. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

13.6. Информацию об условиях участия и правилах проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» +375 17 279 87 17 в период с 28 сентября 2016 по 30 декабря 2016 (включительно) с 9:00 до 21:00 в рабочие дни.

13.7. Компания Visa не является Организатором Рекламной игры, не принимает участия в Рекламной игре и не отвечает по претензиям участников Рекламной игры.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2830 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 23 сентября 2016.





## Извещение о проведении 25 октября 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «Контрольно-проездной пункт» общей площадью 17,6 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-75347, расположенный по адресу: Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/39 (назначение: здание специализированное иного назначения) | 7 760,00 (77 600 000 бел. руб. образца 2000 года) | 776 (7 760 000 бел. руб. образца 2000 года) |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **25 октября 2016 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.04.2016 по 11.05.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН») (0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).**





ПЕРЕГОВОРЫ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

## УП «Проектный институт Белгипрозем»

**приглашает вас принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для проведения работ по текущему ремонту.**

**Предмет закупки –**

## ТЕКУЩИЙ РЕМОНТ ПРОИЗВОДСТВЕННЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

**(общей площадью – 85,1 кв. м) по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 26.**

Примерный перечень видов строительных работ (дефектный акт) можно получить у специалистов предприятия:

- Бейсова Г.Б. – тел. 207 05 33;
- Лукашевич А.Ф. – тел. 207 05 33.

Переговоры будут проведены без предварительного квалификационного отбора.

Срок выполнения работ – октябрь–декабрь 2016 года.

Оплата ежемесячно – по факту выполнения работ.

Затраты, связанные с командировочными расходами или разъездным характером работ, не возмещаются.

Время проведения переговоров 03 октября 2016 года в 11 часов.

Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: **207 05 33, 212 07 00.**

УНП 100035563



В извещении, опубликованном в газете «Звязда» № 181 от 20.09.2016 г., кадастровый номер земельного участка, расположенного в д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 15А, **следует читать: 623288001601000092.**

УНП 600181536

■ Жывіце доўга

# У КАЎБАСЕ І ХЛЕБЕ СТАНЕ МЕНШ СОЛІ, А Ў ЁГУРТАХ — ЦУКРУ

**Навацыі ў сістэме аховы здароўя скіраваны на прафілактыку**

**У Беларусі плануецца забараніць рэкламу піва, курыць у машынах і памяшканнях, дзе знаходзяцца дзеці да 14 гадоў, павялічыць падаткі на алкаголь. Такія новаўвядзенні чакаюцца падчас рэалізацыі дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гг.». Яна скіравана на стабілізацыю колькасці насельніцтва і павелічэнне чаканай працягласці жыцця да 75,3 года замест цяперашніх 73,9 года.**

## Правіла трох пяцёрак

*— У сістэме аховы здароўя да 70-80% расходаў прыходзіцца на аказанне медыцынскай дапамогі для лячэння менавіта неінфекцыйных захворванняў,* — адзначыла **Жанна ЕРАМЕЕВА, кансультант аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі Галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя.** — *Такія пацыенты звяртаюцца ў паліклінікі, кладуцца ў стацыянар, што павялічвае нагрузку на медперсанал. Аднак, як вядома, танней і прасцей папярэдзіць захворванне, а не лячыць яго, і на гэта арыентавана дзяржпраграма.*

Асноўная прычына смяротнасці насельніцтва — усё тыя ж неінфекцыйныя захворванні: хваробы сістэмы кровазвароту, лёгкіх, анкалогія, цукровы дыябет.

*— Розніца ў стане здароўя насельніцтва звязана з уплывам экалагічных, сацыяльна-эканамічных і паводзінскіх фактараў. Прааналізаваўшы іх, спецыялісты стварылі так званае залатое правіла трох пяцёрак. У першай «пяцёркі» вызначаецца 5 асноўных фактараў рызыкі: курэнне, злоўжыванне алкаголем, нерацыянальнае харчаванне, нізкая фізічная актыўнасць і неспрыяльныя ўмовы вытворчасці,* — расказала прадстаўніца міністэрства.

Другая «пяцёрка» — мэтавыя групы, на якія неабходна ўплываць: дзеці, навучэнцы, моладзь; рабочыя, якія падвяргаюцца фактарам рызыкі на вытворчасці (працаздольнае насельніцтва); сацыяльна слабыя слаі грамадзян (малазабяспечаныя); людзі, што выйшлі з працаздольнага ўзросту; асобы, якія вызначаюць палітыку ў галіне аховы здароўя.

***На рэалізацыю дзяржпраграмы за пяць гадоў спатрэбіцца 27 млн 716 тыс. дэнамінаваных беларускіх рублёў, ці $13,7 млн.***

Выдзелена таксама 5 асноўных узроўняў уздзеяння на гэтыя групы: фарміраванне прававога асяроддзя, інфармацыйнай прасторы, сістэмы бесперапыннай адукацыі па пытаннях аховы здароўя, падтрымка мясцовых ініцыятыў (так званых здаровых гарадоў) і прафілактыка на індывідуальным узроўні.

## Каб не піў, не курыў і не еў тлустага

Сярод фактараў, якія вызначаюць здароўе насельніцтва, толькі каля 10-15% прыходзіцца на сістэму аховы здароўя, 20% — на навакольнае асяроддзе і спадчыннасць, а асноўная роля належыць умовам і ладу жыцця чалавека. Менавіта апошнія фактары трэба мяняць, каб дапамагчы беларусам палепшыць стан здароўя.

Нягледзячы на актыўную барацьбу з курэннем і памяншэнне колькасці курцоў на 14%, дагэтуль працягвае смаліць амаль трэць насельніцтва краіны. Пры гэтым амаль 55% з іх хацелі б пазбавіцца ад тытунёвай залежнасці. Каб падштурхнуць людзей актыўней адмаўляцца ад дрэнных звычкі, у межах рэгулявання электронных сістэм курэння і павелічэння колькасці грамадскіх месцаў, дзе забаронена курыць, плануецца забараніць смаліць у машынах і памяшканнях у прысутнасці дзяцей да 14 гадоў. Прапануецца аказваць медыцынскую дапамогу тым, хто хоча адмовіцца ад цыгарэт.

Ужыванне алкаголю ў Беларусі і мужчынамі, і жанчынамі за апошнія гады мае тэндэнцыю да павелічэння праз цэнавую даступнасць напояў, лічаць эксперты. Каб паўплываць на становішча, плануецца павысіць падаткі на алкаголь, забараніць рэкламу і стымуляванне продажу спіртнога, абмежаваць яго наяўнасць у рознічным продажы.

## Празмерныя соль, цукар і тлушч — пад забаронай

Праблема незбалансаванага харчавання закранае 57,4% дарослых беларусаў з залішняй вагой і 24,3%, якія пакутуюць ад атлусцення. Гэтыя з'явы назіраюцца ў выніку празмернага ўжывання жывёльных тлушчаў, простых вугляводаў і солі, а таксама недастатковай колькасці вітамінаў і мінералаў, садавіны і гароднiны.

*— Фактычна ўпершыню захады па пытаннях харчавання і фізічнай актыўнасці былі закладзены ў падпраграму прафілактыкі і кантролю неінфекцыйных захворванняў,* — расказала Жанна Ерамеева. — *Плануюцца захады па зніжэнні ўтрымання цукру ў кісламалочнай прадукцыі для дзяцей, солі ў каўбасных і хлебабулачных вырабах.*

За выкананнем гэтых прапаноў, якія трэба аформіць дакументальна, будуць сачыць, аднак справа ўскладняецца тым, што ў існуючых ДАСТах, напрыклад, нідзе не прапісаны нарматывы па ўтрыманні солі ў прадуктах.

Спецыялісты лічаць, што неабходна ўзмацніць жорсткасць адносна нарматываў па ўтрыманні транстлушчаў у масла-малочнай прадукцыі і поўнасцю выключыць іх з рацыёну дзіцячых прадуктаў харчавання. Абмежаваць рэкламу газіроўкі і прадуктаў з высокім утрыманнем солі, цукру і тлушчу, цалкам забараніць рэкламу піва.

## Здаровыя праграмы для сотавых і студэнтаў

На індывідуальным узроўні спецыялісты ўжо адзначаюць некаторыя поспехі. Добры вынік, напрыклад, паказаў пілотны праект «Мой стыль жыцця сёння — маё здароўе і поспех заўтра», які рэалізуецца з 2013 года Мінскім гарадскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі сумесна з БДУІР. Работа па карэкцыі харчавання і распрацоўцы спецыяльнага меню вялася сярод першакурснікаў ВНУ, 68% з якіх мелі адхіленні вагі цела. За навучальны год у 92% удзельнікаў праекта маса нармалізавалася. Па выніках праекта распрацаваны «дзённік харчавання», які, як плануецца, будзе ў 2019 годзе распаўсюджаны на ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны.

**Плануецца павышэнне падаткаў на алкаголь, забарона рэкламы і стымулявання продажу спіртнога, абмежаванне яго наяўнасці ў рознічным продажы.**

*— Колькасці праграм і сацыяльнай рэкламы, якія прапагандуюць здаровы лад жыцця, недастаткова. Да таго ж яна не транслюецца ў «прайм-тайм» і кінатэатрах. Няма абмежаванняў на рэкламу некарысных прадуктаў: ласункаў, чыпсаў, газіроўкі,* — зазначае Жанна Ерамеева, акрэсліўшы шэраг задач для пераадолення гэтай сітуацыі. — *Неабходна стварыць цыкл тэматычных тэлеперадач на высокім прафесійным узроўні і якасную сацыяльную рэкламу, забяспечыўшы яе трансляцыю ў аптымальны для прагляду ўсімі катэгорыямі насельніцтва час. Актыўна карыстацца інтэрнэт-рэсурсамі і стварыць вэб-партал «Здаровая Беларусь» да канца 2016 года, распрацаваць тэматычныя мабільныя праграмы.*

Паколькі навыкі паводзін па захаванні здароўя закладваюцца з дзяцінства, прадстаўніца Міністэрства аховы здароўя закранула таксама пытанне неабходнасці стварэння здароўезахавальнага асяроддзя праз адэкватныя вучэбныя нагрузкі на школьнікаў, збалансаванасць харчавання і фізічнай культуры, прывіццё гігіенічных навыкаў.

Мяркуецца таксама матываваць кіраўнікоў да арганізацыі аздараўленчай работы на прадпрыемствах праз медагляды, аптымальныя рэжымы працы і адпачынку, здаровае харчаванне і водны баланс. Станоўчыя прыклады такой працы ўжо існуюць.

У пачатку кастрычніка ў Беларусі пачнецца беспрэцэдэнтнае даследаванне — «Стан фактараў рызыкі сярод насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Яго метадалогія распрацавана Міжнароднай арганізацыяй аховы здароўя і апрабавана ў больш як 130 краінах.

*— Беларусь ідзе на поўны комплекс гэтага даследавання, уключаючы анкетаванне і фізікальныя вымярэнні — халестэрыну, глюкозы ў крыві, крэацініну і солі ў мачы. Мы атрымаем унікальныя даныя, будзем мець поўную карціну распаўсюджвання фактараў рызыкі сярод насельніцтва і зможам гаварыць і з людзьмі, і са СМІ, і з тымі, хто прымае палітычныя рашэнні на мове фактаў,* — расказала **Ірына НОВІК, намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, эканомікі і ўпраўлення аховы здароўя.**

Першыя вынікі даследавання атрымаюць ужо ў лютым, а канчатковая справаздача адбудзецца не пазней за першае паўгоддзе 2017-га.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Вечныя каштоўнасці

# ГАЛОЎНАЕ — ЗДАРОЎЕ

## Так лічыць большасць беларусаў



**«Прыблізна ў 87 працэнтаў беларусаў здароўе знаходзіцца на першым месцы сярод жыццёвых каштоўнасцяў», — адзначыў першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч.**

Дзмітрый Піневіч растлумачыў, што так званы дужы пол нашай краіны не заўсёды ўважліва ставіцца да стану свайго здароўя. У выніку беларускія мужчыны жывуць на адзінаццаць гадоў менш, чым жанчыны. Акрамя таго, яны ў два разы часцей паміраюць ад анкалагічных захворванняў, у дваццаць разоў — ад інфарктаў, а ад хвароб сістэмы кровазвароту і знешніх фактараў — у шэсць разоў. «Неабходна ратаваць нашых мужчын!» — сказаў першы намеснік міністра аховы здароўя.

Галоўнымі фактарамі пагаршэння здароўя беларусаў працягваюць заставацца курэнне і алкаголь. Так, у 2015 годзе на душу насельніцтва прыходзілася крыху больш за дзевяць літраў спіртнога (пры тым, што 8 літраў ужо лічацца шкоднымі).

— Паколькі людзей старэйшага працаздольнага ўзросту ў Беларусі становіцца ўсё больш, то ў студзені 2017 года будзе адкрыты Цэнтр актыўнага даўгалецця на базе Рэспубліканскага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, — паведаміў Дзмітрый Піневіч. — Там сканцэнтруюцца навуковыя рэсурсы для распрацоўкі мерапрыемстваў, праектаў для людзей пажылога ўзросту,

З 2017 года плануецца пачаць змены ў сістэме дыспансерызацыі.

— Мы сыходзім ад усеагульнай дыспансерызацыі, надаём больш увагі мэтавым скрынінгам (прафілактычным медаглядам). Карты і гісторыі хваробы ў электронным выглядзе дазволяць паменшыць колькасць паўторных візітаў у паліклінікі.

У аснову дзяржаўнай палітыкі па фарміраванні здаровага ладу жыцця, захаванні і ўмацаванні здароўя нацыі лёг не толькі ўласнабеларускі досвед, але і здабыткі Еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі па ахове здароўя.

**Набіраюць папулярнасць масавыя спартыўныя мерапрыемствы. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца Мінскі паўмарафон, да якога сёлета далучылася на чатыры тысячы больш беларусаў, чым летась.**

— Спартыўны рэйтынг Беларусі на сусветнай арэне дастойны: па алімпійскіх відах спорту яна займае не ніжэй за 25-е месца. Сёння ў нас сістэматычна займаюцца фізкультурай больш за 1,98 мільёна чалавек (20,8 працэнта ад агульнага насельніцтва). Напрыклад, у 2010 годзе гэты паказчык складаў 1,6 мільёна чалавек (16,6 працэнта). Гэты прагрэс залежыць ад умоў і якасці паслуг для заняткаў спортам, якія забяспечваюцца ў краіне, — сказаў **начальнік упраўлення фізічнай культуры Міністэрства спорту і турызму Пётр ВОРАН.**

Набіраюць папулярнасць масавыя спартыўныя мерапрыемствы. Калі раней на іх неабходна было прыцягваць, напрыклад, студэнтаў, то цяпер людзі самі імкнуцца прыняць удзел. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца Мінскі паўмарафон, да якога сёлета далучылася на чатыры тысячы больш беларусаў, чым летась.

Па словах Пятра Ворана, менавіта крэатыўны падыход да масавых мерапрыемстваў, скіраваных на здаровы лад жыцця, дазваляе прыцягваць у першую чаргу маладое пакаленне.

Летнія лагеры па традыцыі адыгрываюць адну з асноўных роляў у аздараўленні дзяцей на канікулах.

— Паводле папярэдняй інфармацыі, у летні перыяд у лагерах адпачылі больш за 358,5 тысячы дзяцей, што склала 102,3 працэнта ад планавай лічбы. Больш за ўсё дзяцей аздаравіліся ў Брэсцкай вобласці, Мінску і Мінскай вобласці, — сказала **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.**

Акрамя таго, летам функцыянавалі спартыўна-аздараўленчыя лагеры, асноўны кірунак якіх — прывіццё і фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця (там адпачылі больш за 70 тысяч дзяцей). Лагеры працы і адпачынку, дзе дзеці мелі магчымасць не толькі аздаравіцца, але і рэалізаваць свае прафесійныя навыкі і патрэбы, прынялі больш за 17 тысяч дзяцей.

— Завяршаецца фарміраванне школьных гурткоў, секцый, у тым ліку спартыўнага, фізкультурна-аздараўленчага і спартыўна-тэхнічнага профілю ў цэнтрах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, — адзначыла Алена Галаўнёва. — Бацькі павінны звярнуць увагу на тое, наколькі дзеці ўцягнутыя ў вучэбны працэс. І па магчымасці далучыць іх да заняткаў, якія фарміруюць здаровы лад жыцця.

**Ганна КУРАК**

## Святлана САРОКА:

# «КУЛЬТУРА — ГЭТА ГАРМОНІЯ ЎСІХ ЧАЛАВЕЧЫХ ЯКАСЦЯЎ»

**Святлана Сарока ўзначальвае Палац культуры Маладзечна ад пачатку яго будаўніцтва. За тыя дзесяцігоддзі, што яна кіруе ім, установа стала асяродкам культурнага жыцця Мінскай вобласці і адной з асноўных творчых пляцовак краіны. Часта сусветна вядомыя зоркі эстрады, мінуючы сталіцу, адпраўляюцца выступаць адразу ў Маладзечна, на сцэну палаца і амфітэатра.**



У гэтай жанчыне спалучаюцца супрацьлеглыя на першы погляд рысы: дабрыня і строгасць, жаноцкасць і дзелавітасць, спакой і патрабавальнасць, мяккасць і воля. Святлана Сарока ўмее працаваць з людзьмі, здольная прыцягваць іх да сябе, натхняць і весці да пастаўленых мэт. Пры гэтым яна — аддавая жонка і маці. Пры сустрэчы першае, пра што хочацца запытацца: «Ці адпачываеце вы ўвогуле?» Бо так шмат зроблена ёю за гэтыя гады.

У гутарцы сам-насам Святлана Сарока, не толькі дырэктар Палаца культуры Маладзечна, але і член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу пятага склікання, дзеліцца сакрэтам, як усё паспяваць, разважае пра тое, па чым можна пазнаць культурнага чалавека, і тлумачыць, чаму свае выступленні прамаўляе менавіта па-беларуску.

***— Святлана Рыгораўна, вы здзіўляеце актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Цікава, вы і ў дзяцінстве былі такой?***

— Я расла вельмі-вельмі сціплай дзяўчынкай. Мне пашчасціла нарадзіцца ў сям'і, у якой бацькі паважалі адзін аднаго, старэйшых і нас, дзяцей. Мае бацькі і ўвесь наш род — усе былі і ёсць вельмі працавітыя гаспадары і прыстойныя людзі, якія заўжды трымалі сябе годна ў адносінах да іншых, да хатніх і саміх сябе. Усе рысы характару і душэўныя якасці, якія маю, былі выхаваны імі.

**«Я мару пра тое, каб у чалавека была магчымасць працаваць 24 гадзіны ў суткі. Мне б гэта вельмі адпавядала. У жыцці столькі цікавага, усё хочацца паспець!»**

Дзяцінства асацыюецца ў мяне перш за ўсё з тымі момантамі, калі ўся наша вялікая сям'я збіралася за вялікім святочным сталом. У дзядулі з бабуляй была заведзена традыцыя: на святы дзеці павінны прыехаць у бацькоўскі дом. І мы збіраліся. Гэты звычай перадаваўся з пакалення ў пакаленне і перайшоў да нашых дзяцей. Штогод мы збіраемся на Велікоднае свята, таму ведаем усіх сваіх стрыечных, траюрадных, раднімся між сабой, даражым адзін адным.

Прафесіяналізм, любоў да справы, дабрыня да людзей і чалавечнасць. Гэтаму вучылі мяне бацькі, педагогі, сябры, кіраўнікі... Стараюся пра гэта памятаць і гэтага прытрымлівацца.

***— Вашы прамовы ў Савеце Рэспублікі, якія мне не раз даводзілася чуць, заўжды былі па-беларуску...***

— Размаўляю па-беларуску і дома, і на працы — лічу гэта натуральным. Адзінае выключэнне — калі бяру ўдзел у міжнародных мерапрыемствах, на якіх прысутнічаюць замежныя госці, што разумеюць рускую мову. Амаль усе свае выступленні таксама рыхтую па-беларуску і хачу сказаць, што нашым суайчыннікам гэта вельмі падабаецца. Беларусы, калі чуюць гутарку на беларускай мове, заўжды кажуць пра яе мілагучнасць, напеўнасць, нават душэўнасць. Дарэчы, 98% мерапрыемстваў у Палацы культуры мы праводзім па-беларуску. Выключэнні складаюць выпадкі, калі ў зале шмат замежных гасцей.

***— Мова — частка культурнай свядомасці. Як лічыце, што варта зрабіць, каб яна развівалася надалей?***

— Так, мова роднай зямлі — найвялікшая святыня, галоўны элемент нацыянальнай культуры народа. Мова — гэта вялікая сіла, якая арганізоўвае духоўнае жыццё народа, вызначае яго менталітэт. Гэта тое, што вылучае нас сярод народаў свету.

У нас дзве дзяржаўныя мовы — гэта рэчаіснасць сучаснай Беларусі, але ёсць момант выбару, і часта прыклад іншых значыць шмат. Кожны размаўляе на той мове, на якой яму зручна. Асабіста я рускую мову ведаю з дзяцінства, шаную і люблю. У маёй хатняй бібліятэцы, відаць, працэнтаў восемдзесят кніг, напісаных па-руску. Яна далучае мяне, як і ўсіх беларусаў, да вялікай рускай і сусветнай культуры. Я звярталася да думак многіх разумнейшых, адукаванейшых людзей свету, але прывяду словы толькі аднаго з іх — выдатнага рускага пісьменніка савецкай эпохі Канстанціна Паўстоўскага: «Па адносінах кожнага чалавека да сваёй мовы можна дакладна меркаваць не толькі аб яго культурным узроўні, але і аб яго грамадзянскай вартасці. Сапраўдная любоў да сваёй краіны немагчымая без любові да сваёй мовы. Чалавек, абыякавы да роднай мовы, — дзікун. Таму што яго абыякавасць да мовы тлумачыцца паўнейшай абыякавасцю да мінулага, сённяшняга і будучага свайго народа».

Клопат пра развіццё беларускай мовы і культуры мае першаступеннае значэнне для лёсу нашай нацыі. На дзяржаўным узроўні пастаўлена пытанне аб тым, каб не даць беларускай мове выйсці з ужывання, загінуць. Бо словы, што народ жывы, пакуль жывее яго мова, яго культура, а інакш ён ператвараецца ў насельніцтва,— не проста фраза. На жаль, мы, беларусы, не вельмі патрыятычныя ў адносінах да сваёй мовы. Мяркую, што беларусам не хапае адчування гонару і разумення важнасці яе захавання. Нам усім неабходна ўсвядоміць гэта, размаўляць на роднай мове і перадаваць яе з вуснаў у вусны, ад пакалення да пакалення.

Глыбока перакanана, што без вялікай і шчырай любові да сваёй нацыянальнай мовы нельга стварыць каштоўнага мастацкага твора. Нам неабходна шанаваць і зберагаць сваё роднае слова. Дарэчы, Міністэрства культуры — адзінае з міністэрстваў у краіне, дзе справаводства вядзецца на беларускай мове. Зразумела, і мы, прадстаўнікі культуры, як правіла, размаўляем па-беларуску.

***— У чым яшчэ для вас праяўляецца культура?***

— Для мяне культура, духоўнасць — гэта вельмі тонкая матэрыя. Наогул, культура — паняцце рознабаковае. Яно мае вялікую колькасць значэнняў у самых розных кірунках нашага жыцця. Паняцце «культура» ахоплівае не толькі мастацкую творчасць, але літаральна і ўсе сферы дзейнасці чалавека. З пункту гледжання навукі, культура — гэта ўсё, што створана ім, звязана з чалавекам. Таму паняцце тычыцца не толькі нашай сферы, але і ўсіх бакоў жыцця: парадку на зямлі, культуры на вытворчасці, чалавечых адносін.

Мы можам ганарыцца тым, што зроблена, і з аптымізмам глядзець у будучае беларускай нацыянальнай культуры, але на аптымізм усім нам разам трэба працаваць, каб наша культура гучала ў свеце на беларускай і на многіх мовах. Фёдар Дастаеўскі сказаў, што культура — гэта спалучэнне агульначалавечага і нацыянальнага. Дык вось менавіта наша нацыянальная культура праз Еўфрасінню Полацкую, Сімяона Полацкага, Кірылу Тураўскага, Максіма Багдановіча, Янку Купалу, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, праз усю нашу спадчыну, помнікі гісторыі, з'яўляецца часткай менавіта гэтай агульначалавечай, агульнаеўрапейскай, сусветнай культурнай прасторы.

***— Культурнага чалавека можна пазнаць не толькі па стаўленні да сваёй спадчыны, але і па здольнасці бачыць прыгожае. Дарэчы, вы не так даўно трапілі ў топ самых прыгожых беларускіх жанчын — дзяржаўных служачых...***

— Пра тое, што трапіла ў гэты спіс, даведалася ад сяброўкі, якая таксама ёсць у ім. Была шчыра здзіўлена. Шмат хто са знаёмых пасля пісаў з гэтай нагоды і віншаваў. Але сакрэтаў ніякіх няма. Сёння ёсць усе магчымасці для таго, каб добра выглядаць. Было б жаданне. Праўда, прыгажосць знешняя без унутранай для мяне амаль не мае вагі і каштоўнасці. У чалавеку ўсё павінна быць гожым — і душа, і цела.

***— Ці можна гарманічна спалучаць у сабе, напрыклад, сілу і прыгажосць? Увогуле, у чым, на вашу думку, праяўляецца моц жанчыны?***

— Яна неадназначная. З аднаго боку — у яе інтэлекце, а з іншага — у жаночай мудрасці. Жанчына спрадвеку была ўвасабленнем абаяльнасці, прыгажосці, захавальніцай хатняга ачага, сямейнага дабрабыту і ў той жа час заставалася надзейнай падтрымкай для мужчыны. Але ўсё ж такі галоўная місія кожнай з нас — даць жыццё дзіцяці, выгадаваць яго, выхаваць дастойным чалавекам. Сённяшнія жанчыны — разумныя, ініцыятыўныя, інтэлектуальныя — імкнуцца быць паспяховымі ў сваёй справе, у прафесіі. І, што цудоўна, спалучаюць усё гэта з выхаваннем дзяцей і вядзеннем хатняй гаспадаркі.

***— Цікава, які вы кіраўнік? Бо Палац культуры — такі, якім мы бачым яго сёння — у пэўным сэнсе ваша выпешчанае дзецішча. Але без каманды супрацоўнікаў, мяркую, нічога б не атрымалася.***

— Узначальваць палац, які будаваўся, фактычна давялося падымаць яго з нуля. Але мы справіліся ў той час дзякуючы будаўнікам і веры ў тое, што робім патрэбную людзям справу. Сёння Палац культуры — вядучая ўстанова культуры Мінскай вобласці, работа якой на высокім узроўні забяспечвае шырокі спектр паслуг у сферы вольнага часу насельніцтва. Палац культуры і Амфітэатр з'яўляюцца галоўнымі сцэнічнымі пляцоўкамі для правядзення маштабных культурна-масавых мерапрыемстваў рэгіянальнага, абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню.

Асаблівай увагі заслугоўвае творчы калектыў Палаца культуры, які адрозніваецца высокім прафесіяналізмам, веданнем сваёй справы. Сёння ў Палацы працуе больш за 170 чалавек, 35 творчых калектываў. Гэта спецыялісты з практычным вопытам, магутным патэнцыялам у рэалізацыі культурна-масавых праектаў. Для мяне як кіраўніка важна, каб кожны з іх адбыўся ў прафесіі, адчуваў, што ён на сваім месцы, каб яму было цікава працаваць у калектыве, бо ўсе гэтыя складнікі ў сукупнасці адыгрываюць значную ролю ў тым, наколькі чалавек шчаслівы на працы. А калі тое, што робіць, яму падабаецца — гэта ўжо палова поспеху.

Ведаеце, калі зараз гледачы з нашай залы выходзяць акрыленыя, з новымі сіламі, значыць, нездарма працуем. Гэта адна з задач культуры — дапамагчы чалавеку падняцца над надзённымі праблемамі і над самім сабой, пабачыць сябе новага, здольнага да лепшага.

**«Клопат пра развіццё беларускай мовы і культуры мае першаступеннае значэнне для лёсу нашай нацыі. На дзяржаўным узроўні пастаўлена пытанне аб тым, каб не даць беларускай мове выйсці з ужывання, загінуць».**

***— Слухаю вас і шчыра здзіўляюся: адкуль бераце на ўсё сілы?***

— Я мару пра тое, каб у чалавека была магчымасць працаваць 24 гадзіны ў суткі. Мне б гэта вельмі адпавядала. У жыцці столькі цікавага, усё хочацца паспець! На мой погляд, сумяшчэнне грамадскай і працоўнай дзейнасці, любімай справы і сямейнага жыцця надае жанчыне вялікую ўнутраную сілу і з'яўляецца той асновай, на якой, як кажуць, трымаецца свет. Маё жыццё склалася так, што я магла стаць і доктарам, і настаўніцай, але цяпер працую ў сферы культуры і разумею, што толькі тут змагла б адбыцца цалкам.

***— Што для вас галоўнае ў жыцці?***

— Усё рабіць з любоўю. Імкнуцца ўкласці ва ўсё зробленае часцінку душы. Жыццё — гэта вечны пошук, пазнанне і вучэнне, праца над сабой і самаразвіццё. Імкненне дасягнуць майстэрства ў сваёй прафесіі, тварыць і ствараць, кіруючыся прынцыпамі адказнасці і прыстойнасці. Гэта справа майго жыцця. Жыццё, натхнёнага мастацтвам, творчасцю, любоўю да людзей. Жыццё, неад'емная часткай якога з'яўляецца і сям'я, і любімая работа.

***— Чаго б пажадалі ўсім нам, беларусам?***

— Было б добра, каб у кожнай сям'і аб'явілі такую акцыю — «Мы ў Год культуры» — і наведалі ўстановы культуры і мерапрыемствы на іх базе, далучыўшыся да нацыянальнай духоўнай спадчыны. Няхай Год культуры стане адметным для кожнага добрымі падзеямі, дапаможа глыбей асэнсаваць каштоўнасць вечнага і аб'яднае ўсіх нас у імкненні да прыгажосці.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

### Парламенцкая дзейнасць

***— У чым заключалася ваша работа ў якасці члена Савета Рэспублікі?***

— Сёння ўжо можна рабіць высновы аб праведзенай рабоце ў новай для мяне якасці сенатара. Падводзячы вынікі і азіраючыся на імкліва праляцеўшыя чатыры гады працы ў Савеце Рэспублікі, у рэгіёнах, магу сказаць, што не толькі адчула сваё дачыненне да рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, але і напрацавала пэўны досвед у заканатворчым працэсе.

Адным з галоўных кірункаў у рабоце члена Савета Рэспублікі з'яўляецца заканадаўчая дзейнасць. Увогуле, складана пералічыць законы, прынятыя на сесіях. Усе яны важныя для нашага грамадства. Непасрэдна ў Савеце Рэспублікі важнае месца адводзіцца пастаянным камісіям. Працуючы ў складзе Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, з'яўлялася кіраўніком рабочых і маніторынгавых груп па падрыхтоўцы і распрацоўцы нарматыўна-прававых актаў у сферы культуры, якія дазволяць не толькі ацаніць дзейснасць раней прынятых заканадаўчых актаў, але і выпрацаваць шэраг рэкамендацый па іх далейшым удасканаленні.

Мяркую, вялікае значэнне мае работа, якую праводзяць сенатары ў рэгіёнах. У дачыненні да мяне — гэта ў Валожынскім, Стаўбцоўскім, Маладзечанскім раёнах. Трымаць руку на пульсе рэгіянальных праблем дапамагалі ўдзелы ў пасяджэннях раённых выканкамаў і органаў прадстаўнічай улады, узаемадзеянне з мясцовым актывам і працоўнымі калектывамі. З дапамогай сенатара людзі маюць магчымасць наўпрост удзельнічаць у працэсе заканатворчасці. У сваёй акрузе я атрымлівала ідэі і прапановы, якія затым крышталізаваліся і ператвараліся ў артыкулы новых законаў. Акрамя таго, працуючы ў рэгіёнах, асаблівую ўвагу надавала зваротам грамадзян.

Таксама значную частку маёй працы займала міжнародная дзейнасць, дзе я выступала ў якасці члена Пастаяннай камісіі па культуры, інфармацыі, турызме і спорце ў Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў і прымала ўдзел у выбарчых кампаніях іншых краін як міжнародны назіральнік.

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# ЛЕГЕНДАРНЫ ЗВЯЗДОВЕЦ

## Яшчэ настаўнікі захапляліся ўменнем Уладзіміра Амельянюка рабіць цікавую, змястоўную газету

**Сярэдняя школа ў Самахвалавічах, якія знаходзяцца побач з Мінскам, — скарбніца для любога журналіста. Не кожны гарадскі музей можа пахваліцца такімі цікавымі і, самае галоўнае, змястоўнымі экспазіцыямі краязнаўчай і этнаграфічнай тэматыкі. Ды і сама гісторыя школы, якая налічвае больш як 150 гадоў, настаўніцкія дынастыі, а таксама сучасныя падыходы ў навучанні амаль паўтысячы школьнікаў (пагадзіцеся, для сельскай мясцовасці гэта нямала) варты цэлага аповеду. Захоўваюць гэтыя сцены і іншую, вельмі каштоўную для нас, звяздоўцаў, інфармацыю...**





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Каля помніка Уладзіміру Амельянюку, які знаходзіцца на тэрыторыі Самахвалавіцкай сярэдняй школы, прымаюць у піянеры, ладзяць іншыя ўрачыстасці.**

У гэтай школе вучыўся будучы Герой Савецкага Саюза, легендарны журналіст-падпольшчык, рэдактар першага нумара падпольнай «Звязды» Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк. Цяпер ён, як самы знакаміты навучэнец установы, «сустракае» кожнага, хто заходзіць за школьныя вароты, — помнік Герою ўжо даўно стаў сімвалам не толькі школы, а і, напэўна, усяго пасёлка.

### Леснічоўка ля Самахвалавіч

Нарадзіўся Уладзімір Амельянюк на Пскоўшчыне, у пасёлку Дно. У Самахвалавічы бацькі пераехалі, калі Валодзя ўжо быў падлеткам. Ёсць інфармацыя, што галава сям'і з'яўляўся ваеннаслужачым. Магчыма, так яно і было, але на Міншчыне Сцяпан Кандратавіч працаваў лесніком.

**«Валодзя ўжо ў школе ў тыя гады праяўляў схільнасці да журналістыкі. Ён быў рэдактарам класнай насценгазеты і членам рэдкалегіі агульнашкольнай газеты».**

Жылі Амельянюкі каля вёскі Дзегцяное, у леснічоўцы, што прыкладна за васямнаццаць кіламетраў ад Самахвалавіч. Паколькі да школы было не блізка, бацькі знялі дзецям пакой у пасёлку.

Інфармацыі аб тым, якога ўзросту была сястра Уладзіміра Амельянюка, няма. Але вядома, што разам з Зінаю яны хадзілі ў адзін клас. Разглядаючы сямейны фотаздымак, які захоўваецца ў школьным музеі, можна меркаваць, што брат і сястра былі прыкладна аднаго ўзросту. Магчыма, Зіна была старэйшай за свайго брата, але зусім не нашмат. Вядома, што ў Самахвалавічах Амельянюкі вучыліся нядоўга: з 1928 па 1929 год. Напэўна, той факт, што школа была сямігадовай, і прымусіў сям'ю пераехаць у сталіцу.



**Уладзімір Амельянюк з сынам Генадзем, май 1941 года.**



**Сцяпан Кандратавіч, Зінаіда, Паліна Сцяпанаўна і 14-гадовы Уладзімір Амельянюкі** *(злева направа)*.

### На журфаку

Пасля заканчэння мінскай школы Валодзя Амельянюк хадзіў на педагагічныя курсы. Некаторы час працаваў настаўнікам і піянерважатым. Але журналіст у ім перамог настаўніка — і ў 1938 годзе Уладзімір Сцяпанавіч паступае ў Мінскі Камуністычны інстытут журналістыкі. Паралельна супрацоўнічае з рэдакцыяй газеты «Піянер Беларусі», рэдагуе дзяржынскую раённую газету. Па ўспамінах таварышаў, вучыўся ён на выдатна. Будучы на чацвёртым курсе, Валодзя праходзіў практыку ў рэдакцыі абласной газеты ў Беластоку. Там яго і застала Вялікая Айчынная вайна.

### У падполлі

У родныя мясціны ішоў пешшу. На гэтым поўным жаху і пакут шляху страціў сваю сястру — Зіна загінула на яго вачах... Па ўспамінах маці, Паліны Сцяпанаўны, у захоплены фашыстамі Мінск Валодзя вярнуўся параненым.

Жылі тады Амельянюкі па вуліцы Чарнышэўскага. Кажуць, што ніхто з гітлераўцаў тут не кватараваў. Фашысты нават адключылі вуліцу ад электраэнергіі — выдатнае месца для падпольнай дзейнасці. Знаёмы хлопец правёў лінію электраперадачы, і Уладзімір стаў уключаць свой радыёпрыёмнік. Падпольная дзейнасць пачалася для яго праслухоўваннем зводак Саўінфармбюро, якія ён перапісваў і разам з таварышамі расклейваў па горадзе. Ужо будучы членам Мінскага падпольнага гаркама партыі, Валодзя Амельянюк актыўна ўдзельнічаў у дыверсійнай дзейнасці. Разам з іншымі падпольшчыкамі арганізоўваў уцёкі савецкіх ваеннапалонных з нямецкіх лагераў, перадаваў партызанам выкрадзеную ў немцаў зброю, амуніцыю, боепрыпасы, медыкаменты, падробленыя дакументы.

Падпольная барацьба і само жыццё ў акупацыіператварылі вясёлага і прыгожага юнака ў не па гадах дарослага чалавека. Уладзімір рэдка ўсміхаўся, стаў вельмі сур'ёзным. Змяніўся і знешне: адгадаваў бараду. Асабліва падкасіла яго гібель бацькі. Сцяпана Кандратавіча, актыўнага падпольшчыка, фашысты схапілі вясной 1942 года. Жорстка катавалі, не атрымаўшы ніякіх прызнанняў, забілі. Па іншых звестках, не стала яго ўжо пасля гібелі сына.

### Радком праўды

Узначаліўшы падпольную рэдакцыю «Звязды» ў няпоўныя 25 гадоў, Уладзімір Амельянюк аказаўся на перадавой ідэалагічнага фронту. З яго лёгкай рукі газета выкрывала хлуслівую фашысцкую прапаганду, звярталася да насельніцтва з заклікамі аказваць дапамогу партызанам. На яе старонках расказвалася пра падзеі на фронце, пра подзвігі народных мсціўцаў, паведамлялася аб выніках «рэйкавай вайны», аб дыверсіях найбольш актыўных груп... Галоўнае — «Звязда» дайшла да Баранавіч, Оршы, Бабруйска, Гомеля і іншых гарадоў.



**Хата па мінскай вуліцы Чарнышэўскага, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны жыла сям'я Амельянюкоў.**

Фашысцкае камандаванне добра разумела, якую пагрозу нясе газета, чыю рэдакцыю яны так старанна шукалі. У кароткі час у фашысцкіх засценках загінула шмат журналістаў-падпольшчыкаў. Але газета працягвала выходзіць. Кажуць, што для пошуку друкарні нават выклікалі вопытных разведчыкаў з Берліна. Гітлераўцы ведалі: гібель самай вядомай і аўтарытэтнай беларускай газеты — органа Мінскага гаркама КП(б)Б — нанясе непапраўны ўрон падпольнаму руху. Таму шукалі яны і галоўнага рэдактара.

### Крок у вечнасць

І знайшлі... Каля Чырвонага касцёла ў Мінску — у тым самым месцы, дзе 26 мая 1942 года загінуў галоўны рэдактар першага падпольнага нумара «Звязды», — узведзены помнік журналістам-падпольшчыкам. Амельянюку, якому праз 20 гадоў пасля Перамогі прысвоіць званне Героя Савецкага Саюза, толькі споўнілася дваццаць пяць...

— Бацька расказваў, што Уладзімір Сцяпанавіч адчуваў — за ім сочаць, — расказваў некалі сын наборшчыка падпольнай «Звязды» Барыс Александровіч. — У той дзень ён якраз ішоў у аптэку, каб купіць лекі для партызанаў. Толькі выйшаў з аптэкі — і выстрал... Як жа бацька плакаў, не мог у гэта паверыць.

Ёсць і іншыя версіі гібелі падпольнага рэдактара.

Хасан Александровіч і Уладзімір Амельянюк былі сябрамі. Марылі стаць сапраўднымі журналістамі. І сталі — толькі больш чым проста журналістамі. Яны разам у 1938 годзе паступілі ў Камуністычны інстытут журналістыкі. Уладзімір Сцяпанавіч рана ажаніўся. З жонкай Лідай і сынам Генадзем жылі ў Мінску, на вуліцы Чарнышэўскага. Часта заходзілі ў госці да Александровічаў.

«Бацька любіў яго за справядлівы характар, неверагодную дасціпнасць, вясёлы нораў», — успамінаў сын наборшчыка. Будучы ў цэнтры горада, Барыс Александровіч заўсёды збочваў да помніка журналістам-падпольшчыкам. Казаў, што бацька быў бы яму за гэта ўдзячны.

### Аднакласнікі

Помнік-бюст Уладзіміра Амельянюка ў Самахвалавічах урачыста адкрылі 9 мая 1974 года — краіна святкавала чарговую гадавіну Перамогі, 30-годдзе вызвалення беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На гэтай урачыстай цырымоніі прысутнічаў чалавек, які асабіста ведаў адважнага падпольшчыка. Праўда, для Казіміры Сцяпанаўны Кратовіч ён быў проста Валодзем-аднакласнікам.

Як расказала настаўніца гісторыі Самахвалавіцкай сярэдняй школы, загадчыца школьнага музея Наталля Аладзьева, Кратовічы нават жылі побач з Амельянюкамі. Таму ўспамінам аднакласніцы Уладзіміра, якімі яна падзялілася з піянерскім атрадам 5 «А» класа 2 снежня 1977 года на ўрачыстым зборы з нагоды прысваення атраду імя Героя, можна смела даваць. Занатаваныя дзіцячай рукой, яны адкрываюць новыя факты з біяграфіі легендарнага журналіста-падпольшчыка:

**Жылі Амельянюкі каля вёскі Дзегцяное, у леснічоўцы, што прыкладна за васямнаццаць кіламетраў ад Самахвалавіч. Паколькі да школы было не блізка, бацькі знялі дзецям пакой у пасёлку.**

*«... Жылі яны (Уладзімір і Зінаіда Амельянюкі. — **Аўт.**) на кватэры ў сям'і Кратовіча Канстанціна Панкрацьевіча (будучага мужа Казіміры Сцяпанаўны. — **Аўт.**). Я сябравала з Зінай і добра ведала яе брата Валодзю. Аднойчы мы хадзілі да іх у госці ў лясніцтва. Хата была сціплай, але вельмі там было чыста і акуратна. Сям'я сюды пераехала аднекуль з Расіі, гэта адчувалася нават ва ўбранні пакоя. Даўно гэта ўсё было, амаль 50 гадоў таму, але добра памятаю вельмі сабранага, самастойнага, акуратнага з чубком хлопчыка за другой партай у сярэднім радзе. Ён быў маладзейшым за многіх вучняў у класе (у тыя гады ў адным класе аказваліся дзеці рознага ўзросту), але карыстаўся вялікай павагай аднакласнікаў. Ён вельмі добра адказваў каля дошкі і заўсёды так дакладна і зразумела, што, здавалася, тлумачыць нават больш зразумела, чым настаўнік. І на перапынках ён заўсёды быў гатовы дапамагчы таварышу, патлумачыць. Мне, напрыклад, цяжка давалася матэматыка, ён заўсёды дапамагаў. Аднойчы Валодзя па хваробе прапусціў 6 тыдняў заняткаў, але здолеў самастойна дагнаць клас, які пайшоў наперад па ўсіх прадметах. І паспяхова здаў экзамены. І яшчэ Валодзя заўсёды ўспамінаецца з кнігай у руках. Не памятаю, каб ён бегаў у класе, біўся. Калі ніхто не прасіў на перапынку нешта патлумачыць, ён адразу ж браўся за кнігі. Валодзя ўжо ў школе ў тыя гады праяўляў схільнасці да журналістыкі. Ён быў рэдактарам класнай насценгазеты і членам рэдкалегіі агульнашкольнай газеты. І не проста таму, што яго выбралі, ён працаваў. Рабіў гэта захоплена. Пісаў добрыя артыкулы — настаўнікі захапляліся яго ўменнем зрабіць цікавую, змястоўную газету. Потым сям'я пераехала ў Мінск, і Валодзя заканчваў вучобу ўжо ў горадзе».*

***

Усю сям'ю знішчыла вайна. Бацька і сын Амельянюкі загінулі ў падполлі, сястры не стала ў пачатку вайны, маці памерла ў 1945-м... Нічога не вядома пра лёс жонкі Амельянюка Ліды і сына Генадзя. Хутчэй за ўсё, у нашага слаўтага калегі нашчадкаў не засталося. У адваротным выпадку, хоць хто-небудзь за столькі гадоў абавязкова аб'явіўся б. А можа, дзесьці жыве чалавек, які не ведае сваіх каранёў? Або нават падумаць не можа, што ў далёкай Беларусі гэтае прозвішча на слыху?

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Платеж на удачу»

БЕЛКАРТ Тебе ближе

**1. Наименование рекламной игры**

Настоящая рекламная игра называется «Платеж на удачу» (далее – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – «Правила») согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

**2. Сведения об Организаторе**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак», УНП 192325716, зарегистрировано 20 августа 2014 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192325716 (далее – Организатор).

**2.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Чапаева, 3, ком. 101.

**2.3.** Заинтересованным лицом Игры является Закрытое акционерное общество «Платежная система БЕЛКАРТ».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

Игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Период проведения Рекламной игры**

Игра проводится в период с 26.09.2016 г. по 20.11.2016 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Рекламной игры**

Для контроля за ходом игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Никифорова Ольга Александровна – директор ООО «Мятный знак».

Члены комиссии:

Шубич Татьяна Леонидовна, специалист по маркетингу ООО «Мятный знак»;

Протько Марина Вячеславовна, главный бухгалтер ООО «Мятный знак»;

Кисель Алла Николаевна, ведущий аналитик отдела методологии и аналитики Управления развития ЗАО «Платежная система БЕЛКАРТ»;

Роман Екатерина Валерьяновна, специалист 1-й категории отдела PR ЗАО «Платежная система БЕЛКАРТ».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников.

Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

**6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

**6.1.** Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей с использованием личных банковских платежных карточек БЕЛКАРТ (далее – карточки БЕЛКАРТ), эмитированных банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ.

**6.2.** При использовании в Правилах термина «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**7. Участники Рекламной игры.**

**7.1.** Участниками Игры могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь и достигшие 18 лет на момент совершения безналичной операции, соответствующей условиям настоящих Правил.

**7.2.** Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии;

**7.3.** Физическое лицо может участвовать в Игре столько количество раз, равное количеству безналичных операций (транзакций), совершенных с использованием карточки БЕЛКАРТ.

**8. Условия участия в Рекламной игре**

**8.1.** Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

**8.1.1.** В период с 00 часов и 00 минут 26.09.2016 года по 23:59:59 09.10.2016 года включительно совершить с использованием карточки БЕЛКАРТ безналичную операцию на территории Республики Беларусь на любую сумму в белорусских рублях по оплате (приобретению) товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) на территории Республики Беларусь;

**8.1.2.** В период с 00 часов и 00 минут 26.09.2016 года по 23:59:59 10.10.2016 года на интернет-сайте игры www.igra.kartochki.by (далее – «Сайт»):

1. заполнить регистрационную форму:

• собственные фамилию, имя и отчество;

• почтовый адрес для направления корреспонденции (будет использован Организатором при уведомлении участника в случае выигрыша);

• личный номер телефона в формате – код оператора или междугородний телефонный код населенного пункта, номер абонента (пример – +375297896367, где 29 – код оператора (населенного пункта), а 7896367 – номер абонента, без пробелов и символов);

• адрес электронной почты (e-mail) (будет использован Организатором при уведомлении участника о выигрыше);

• данные о безналичной операции:

1) дата операции (дата совершения безналичной операции – согласно соответствующему карт-чеку);

2) номер карт-чека по совершенной операции;

3) первые четыре цифры номера карточки БЕЛКАРТ, с помощью которой была совершена безналичная операция;

4) банк-эмитент карточки БЕЛКАРТ (банк, выпустивший соответствующую банковскую платежную карточку БЕЛКАРТ);

2. ознакомиться с Правилами Рекламной Игры, поставив галочку об ознакомлении с Правилами Рекламной Игры в регистрационной форме.

**8.1.3.** Соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными банком-эмитентом.

**8.1.4.** При совершении физическим лицом нескольких безналичных операций, соответствующих Правилам, такое физическое лицо вправе каждый раз регистрировать своё участие в Рекламной игре.

**8.1.5.** Сохранять до выдачи призов оригинал карт-чека, подтверждающего факт совершения безналичных операций при использовании карточки БЕЛКАРТ.

**8.1.6.** Каждая уникальная регистрация на Сайте, соответствующая требованиям настоящих Правил, участвует в розыгрыше призов в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**8.1.7.** Регистрация новой уникальной безналичной операции осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

**8.1.8.** В случае, если одна и та же уникальная безналичная операция будет зарегистрирована на Сайте более одного раза, она будет приниматься для участия в розыгрыше только один раз по факту первой регистрации данных уникальной безналичной операции в регистрационной форме Сайта и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации. Повторная регистрация одного и того же карт-чека не принимается к участию в розыгрыше.

**8.1.9.** Не допускаются к участию в Игре физические лица, которыми:

- не проведена регистрация на Сайте;

- безналичные операции совершены до 00 часов и 00 минут 26.09.2016 года или после 23:59:59 09.10.2016 года.

**9. Состав и размер призового фонда**

**9.1.** Призовой фонд Игры составляет сумму в размере 10 758 (десять тысяч семьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей 31 копейка в денежных знаках образца 2009 года, или 107 583 100 (сто семь миллионов пятьсот восемьдесят три тысячи сто) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года, и формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

**1) Приз:**

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед., бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года | Сумма всего, бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Разветвитель USB A4TECH HUB-56-3 (SILVER) | USB-разветлитель | 34 | 20,10 / 201 000 | 683,40 / 6 834 000 |
| 2 | Разветвитель USB A4TECH HUB-56-4 (BLACK) | USB-разветлитель | 116 | 20,10 / 201 000 | 2 331,60/ 23 316 000 |

**2) Суперприз (состоит из):**

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед., бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года | Сумма всего, бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | USB флэш-накопитель Mirex UNIT AQUA 32 GB | USB флэш-накопитель | 30 | 30,06 / 300 600 | 901,80 / 9 018 000 |
| 2 | Динамики CANYON CNS-CBTSP1S | Динамики CANYON | 30 | 34,56 / 345 600 | 1 036,80/ 10 368 000 |
| 3 | Плеер MP3 Ritmix RF – 3350 8Gb Black RF – 3350 8Gb Black | Плеер MP3 | 20 | 61,14 / 611 400 | 1 222,80 / 12 228 000 |
| 4 | CNE-CPB156W CANYON портативное зарядное устройство, цвет белый, емкость 15600 мАч | Портативное зарядное устройство | 20 | 69,84 / 698 400 | 1 396,80/ 13 968 000 |
| 5 | Фоторамка Ritmix RDF-712 Black RDF-712 Black стоимостью 150,12 / 1 501 200 бел. руб. + денежная сумма в размере 7,64 / 76 400 бел. руб. | Фоторамка | 5 | 157,76 / 1 577 600 | 788,80 / 7 888 000 |
| 6 | Наушники беспроводные Sony MDR-RF811RK MDR-RF811RKC. EE8 стоимостью 155,40 / 1 554 000 бел. руб + денежная сумма в размере 8,43 / 84 300 бел. руб. | Наушники беспроводные Sony | 5 | 163,83 / 1 633 830 | 819,15 / 8 191 500 |

**3) Главный приз:**

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед., бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года | Сумма всего, бел. руб., в денежных знаках образца 2009 года/ в денежных знаках образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Портативный персональный компьютер (ноутбук) Acer Aspire E5-573-51VS i5-5200U/15''/4G/1TB/ Linux стоимостью 1 385,00 / 13 850 000 бел. руб + денежная сумма в размере 192,16 / 1 921 600 бел. руб. | Портативный персональный компьютер | 1 | 1 577,16 / 15 771 600 | 1 577,16 / 15 771 600 |

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**

Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Игры. Результаты розыгрыша Игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

**10.1.** Розыгрыш Призов и Суперпризов состоится 19 октября 2016 года в присутствии комиссии по проведению Игры в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Победителей, 7А, офис 55, 17 этаж среди участников игры, зарегистрированных на интернет-сайте Игры в соответствии с настоящими правилами.

**10.2.** Розыгрыш Главного приза состоится 28 октября 2016 года в присутствии комиссии по проведению Игры в 13.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, 4 (Дворец спорта, холл) среди Победителей Призов и Суперпризов.

**10.3.** Все участники, вошедшие в список первых 150 (ста пятидесяти) участников игры, зарегистрированных на интернет-сайте Игры в период с 00 часов и 00 минут 26.09.2016 года по 23:59:59 10.10.2016 в соответствии с настоящими правилами, становятся победителями Приза «USB-разветлитель».

**10.4.** В розыгрыше Суперпризов принимают участие все Участники, прошедшие регистрацию на интернет-сайте Игры и допущенные к розыгрышам в соответствии с настоящими Правилами.

**10.5.** Призы и Суперпризы разыгрываются в последовательности, указанной в п. 9.1. Правил.

**10.6.** В розыгрыше Главного приза принимают участие все Победители Призов и Суперпризов в соответствии с настоящими Правилами.

**10.7.** Для определения Победителей Суперпризов Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) по 9 (девять).

**10.8.** Для осуществления розыгрыша Суперпризов Организатор формирует из базы данных безналичных операций, соответствующим Правилам, уникальные номера (далее – «номера») в хронологическом порядке согласно дате и времени регистрации безналичных операций на Сайте (далее – «массив»).

**10.9.** Определение выигрышных номеров Суперпризов происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.10.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Член комиссии извлекает из лототрона один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**10.11.** Далее в лототрон загружаются все десять шаров. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Член комиссии извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве. Таким образом, формируются все выигрышные номера Суперпризов.

**10.12.** Полученные выигрышные номера Суперпризов сверяются с базой данных безналичных операций, и указываются фамилия, имя и отчество, номер телефона, почтовый адрес и адрес электронной почты (e-mail) (в случае ее указания в регистрационной форме) Победителей.

**10.13.** Для осуществления розыгрыша Главного приза Организатор печатает карточки участников (далее – «карточка участника») с данными Победителей Призов и Суперпризов с указанием фамилии, имени и отчества, номером телефона, почтовым адресом и адресом электронной почты (e-mail) (в случае ее указания в регистрационной форме).

**10.14.** Для определения Победителя Главного приза Организатор использует лототрон и карточки участников. Карточки участников помещаются в лототрон и перемешиваются. Затем Член комиссии вытягивает одну карточку участника для розыгрыша Главного приза. Вытянутая карточка участника признается выигрышной, а участник, данные которого указаны на ней, – Победителем Главного приза.

**11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша призового фонда. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.**

**11.1.** Победители уведомляются Организатором по электронной почте (в случае ее указания в регистрационной форме), письменно заказным письмом с уведомлением в течение 2-х (двух) рабочих дней с даты проведения каждого розыгрыша и по телефону.

**11.2.** Торжественное вручение Призов, Суперпризов и Главного приза состоится 28 октября 2016 года по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 4 (Дворец спорта, холл), после проведения розыгрыша Главного приза.

**11.3.** В случае отсутствия Победителя в день торжественного вручения выдача Призов, Суперпризов и Главного приза проводится в срок с 29 октября 2016 года по 20 ноября 2016 года по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Чапаева, 3, офис 101 в рабочие дни с 10.00 до 18.00. Для получения Приза, Суперприза и Главного приза Победителю необходимо предварительно связаться с представителем Организатора с 29.10.2016 по 20.11.2016 года включительно в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по телефону 8 033 335 51 10.

**11.4.** Для получения Призов, Суперпризов и Главного приза Победитель при себе должен иметь паспорт, карточку БЕЛКАРТ, с помощью, которой была проведена безналичная операция, а также оригинал карт-чека или документ из банка, подтверждающий оплату безналичной покупки.

**11.5.** В случае если Победитель не может получить приз лично, приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично доверенность от Победителя на получение приза, заверенную нотариально, и документы согласно п.11.4 Правил.

**11.6.** Победитель теряет право получения Приза, Суперприза, Главного приза, в случае если:

• отказался от получения Приза, Суперприза, Главного приза, о чем письменно известил Организатора Рекламной игры, по адресу 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Чапаева, 3, ком. 101;

• указал недостоверную информацию при регистрации на Сайте;

• не предоставил необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

• не явился для получения приза в сроки, установленные Правилами.

**11.7.** Победитель при получении Приза, Суперприза и Главного приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

**11.8.** Выплата денежного эквивалента приза не допускается.

**11.9.** Начисление, удержание и перечисление подоходного налога производится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**12. Права и обязанности участников Игры.**

**12.1.** Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

**12.2.** Победители вправе согласиться на рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной Игры.

**12.3.** Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**12.4.** Участники при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником недостоверной информации в регистрационную форму.

**12.5.** Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

**13.2.** Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 04.11.2016 г.

**14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

**14.1.** Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной Игры по адресу: 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Чапаева, 3, ком. 101.

**14.2.** Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону +375 17 276 00 76 в рабочие дни с понедельника по четверг с 8.30 по 17.30, в пятницу с 8.30 по 16.15, а также на сайте www.belkart.by.

**15. Общие положения.**

**15.1.** Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**15.2.** Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2819 выдано Министерством торговли Республики Беларусь 5 сентября 2016.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка с учетом/до деноминации |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №223381712101000029, площадью 0,0934 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Заутьевский с/с, д. Мазурино для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки Западная Двина. **Нач.цена:** 3 000 / 30 000 000 бел. руб. **Задаток:** 300 / 3 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3604321030185 ЦБУ 213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070283, код платежа 04901, получатель платежа: Заутьевский сельисполком. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №223383503601000014, площадью 0,1351 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №1) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач. цена**: 5 000 / 50 000 000 бел. руб. **Задаток:** 500 / 5 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №223383503601000015, площадью 0,1362 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №2) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач. цена**: 5 000 / 50 000 000 бел.руб. **Задаток:** 500 / 5 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №223383503601000016, площадью 0,1338 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №3) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач. цена**: 5 000 / 50 000 000 бел. руб. **Задаток:** 500 / 5 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком. |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №223383030601000098, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Новопогостский с/с, д. Снеги для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Укля, охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000В, придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена**: 5 000 / 50 000 000 бел. руб. **Задаток:** 500 / 5 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3604321060201 ЦБУ № 213 ф-ла № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070268, код платежа 04901. Получатель платежа: Новопогостский сельисполком. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 13.10.2016 в 11.00 по адресу: г. Миоры, ул. Дзержинского, 17, в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 26.09.2016 с 8.30 по 12.10.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия аукциона: приступить к занятию земельного участка в течение 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; в месячный срок после получения решения получить в отделе архитектуры и строительства райисполкома АПЗ и ТУ на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить ПСД, приступить к строительству объекта после разработки и утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка с учетом/до деноминации. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221284810101000093, площадью 0,1422 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена**: 4 000 / 40 000 000 бел. руб. **Задаток**: 400 / 4 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с 3600314080100 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельский исполком. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 27.10.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 26.09.2016 с 8.30 по 26.10.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома, приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

**РУП «Белпочта»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

**для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт отделения почтовой связи №38 по ул. Долгобродской, 4 в г. Минске».**

**Процедура переговоров состоится «28» сентября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29. УНП 101015738

***Настоящим на основании п.1 ст.56 Гражданского кодекса Республики Беларусь***

**УВЕДОМЛЯЕМ О ПРИНЯТИИ**

**производственно-торговым унитарным предприятием «Итал Гэлэри», (УНП 192446604, адрес местонахождения: г. Минск, пл. Свободы, д. 5, пом. 16),**

**РЕШЕНИЯ О РЕОРГАНИЗАЦИИ В ФОРМЕ СЛИЯНИЯ**

**с торгово-производственным частным унитарным предприятием «ЛОГОС», (УНП 100084170, адрес местонахождения: г. Минск, пл. Свободы, 5, ком. 1).**

На основании п.1. ст.55 Гражданского кодекса Республики Беларусь все права и обязанности унитарного предприятия «Итал Гэлэри» и УП «ЛОГОС» в отношении всех кредиторов и должников, включая и обязательства, оспариваемые сторонами, на основании передаточного акта перейдут к вновь создаваемому в результате слияния Обществу с ограниченной ответственностью «Итал Гэлэри». Гарантируем соблюдение и защиту прав всех кредиторов.

Все возникающие вопросы, связанные с реорганизацией Унитарного предприятия «Итал Гэлэри» и УП «ЛОГОС», просим направлять по адресу: г. Минск, пл. Свободы, д. 5, пом. 16.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## строительства объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом № 1 по генплану (2-я очередь строительства)

**Информация о застройщике:** «Приорбанк» Открытое акционерное общество («Приорбанк» ОАО), зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 г., регистрационный номер 12.

Юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Режим работы: понедельник – четверг с $8^{30}$ до $17^{30}$ в, пятница с $8^{30}$ до $16^{15}$, обеденный перерыв с $12^{30}$ до $13^{15}$, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

В течение трех предшествующих лет «Приорбанк» ОАО как заказчик принял участие в строительстве следующих объектов недвижимости:

в 2015 году – «многоквартирный жилой дом № 2 по генплану в составе объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш – Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной 1-я очередь строительства», г. Минск».

**Информация об объекте строительства.**

**Цель строительства:** исполнение условий заключенного с Минским городским исполнительным комитетом договора от 12 октября 2009 г. № 258-Д на реализацию права проектирования и строительства группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Этапы и сроки реализации объекта строительства:** первый пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 5, 6, 7, 8, техническое подполье всего здания, технический этаж секции 5, 6, 7, 8, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой части секции 5, 6, 7, 8 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; второй пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 1, 2, 3, 4, технический этаж секции 1, 2, 3, 4, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой секции 1, 2, 3, 4 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; третий пусковой комплекс строительства – гараж-стоянка общей площадью 6328,54 квадратного метра; четвертый - четырнадцатый пусковые комплексы строительства – административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра.

Первый пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – июнь 2016 г.

Второй – четырнадцатый пусковые комплексы: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – май 2017 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертные заключения от 6 августа 2010 г. № 895-15/10 и от 4 февраля 2015 г. № 67-15/15, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Разрешение на производство строительно-монтажных работ:** разрешение на производство строительно-монтажных работ от 30 декабря 2015 г. №2-207Ж-001/15, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

**Местонахождение объекта строительства**: г. Минск, Советский район, в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Характеристика объекта строительства**: жилой дом состоит из 8 жилых секций, из которых 1, 5, 8-10-этажные и 2, 3, 4, 6, 7, 12-этажные. Конструктивная схема здания – монолитный каркас с шагами колонн от 2,3 м до 7,2 м со сплошными плоскими монолитными перекрытиями толщиной 200 мм. Здание с теплым техническим чердаком и техническими надстройками, в которых расположены машинные помещения лифтов и венткамеры подпора воздуха. Под домом запроектировано техническое подполье, в котором размещаются тепловые пункты, насосная пожаротушения, ЛВС. Техподполье имеет три самостоятельных выхода. Высота технического подполья 2,3 м обусловлена возможностью подключения здания к наружным сетям. Общая площадь квартир: однокомнатных от 43,15 до 54,09 кв.м; двухкомнатных от 63,51 до 78,39 кв.м; трехкомнатных от 83,48 до 100,02 кв.м. Количество квартир на этаже – 4. Высота жилого этажа от пола до пола 3 м. Во всех квартирах запроектировано устройство летних помещений (остекленных лоджий и балконов). В квартирах, расположенных на 6 этаже и выше, в качестве второго эвакуационного выхода приняты выходы на лоджии и балконы с глухими простенками шириной 1,2 м. На 1-м этаже расположены встроенные административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра с входами со стороны основных транспортных и пешеходных потоков. Для маломобильной группы населения при входах в эти помещения предусматриваются пандусы. Входы в жилье осуществляются со стороны дворовой территории. На первом этаже 8 секции предусмотрены помещения товарищества собственников. Естественное освещение обеспечивается нормативным удалением дома от прилегающей застройки с учетом инсоляции, а также оптимальным соотношением площадей окон к площадям помещений. Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ-профиля с двухкамерными стеклопакетами. Под дворовой территорией предусмотрено размещение подземного одноэтажного гаража-стоянки на 181 машино-место. Объемно-планировочное решение гаража-стоянки предусматривает устройство двух отсеков на 91 и 90 машино-места, разделенные противопожарной преградой с тамбур-шлюзом между ними. Каждый отсек имеет два выезда – один непосредственно наружу, второй – через соседний отсек. Выходы для людей предусмотрены через лестничные клетки и по въездным пандусам. В жилом доме предусмотрена аварийная противодымная вентиляция для удаления дыма при пожаре из коридоров и подача наружного воздуха из шахты лифтов. Вентиляция: в квартирах – естественная; во встроенных помещениях – естественная и механическая. Электроснабжение: разводка электропроводки с установкой электросчетчиков по квартирам и встроенным помещениям. Холодное и горячее водоснабжение: в квартиры и встроенные помещения устанавливаются счетчики холодной и горячей воды, регуляторы давления и устройства пожаротушения. Отопление: в квартирах – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры; во встроенных помещениях – горизонтальная однотрубная система отопления с установкой радиаторов и теплосчетчиков для каждой организации, потребляющей тепло. Телефонизация, радиофикация, телевидение: поквартирная разводка. Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы). Внутренняя отделка жилых помещений и встроенных помещений: стены, потолки, полы — без чистовой отделки. Дверные блоки: наружные – металлические; межквартирные – деревянные; межкомнатные – не устанавливаются.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства:** второй пусковой комплекс строительства – 22 единицы; 10 машино-мест.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры второго пускового комплекса строительства: однокомнатные квартиры – 2 единицы; двухкомнатные квартиры – 10 единиц; трехкомнатные квартиры – 10 единиц.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан и юридических лиц 10 машино-мест.

**Цены на объекты долевого строительства:**

второй пусковой комплекс строительства: Стоимость 1 (одного) квадратного метра **однокомнатных**, **двухкомнатных, трехкомнатных** квартир при внесении 30% стоимости квартир (цены договора) в течение месяца с момента заключения договора составляет **2 200** (две тысячи двести) белорусских рублей, оставшиеся платежи равными частями не позднее мая 2017 года.

Предусмотреть скидки при 100% оплате и установить стоимость 1 (одного) квадратного метра **однокомнатных, двухкомнатных, трехкомнатных** квартир в размере 2 100 (две тысячи сто) белорусских рублей в течение месяца с момента заключения договора.

Стоимость 1 (одного) машино-места составляет **30 000** (тридцать тысяч) белорусских рублей. Первоначальный взнос – 20%. Оставшиеся платежи равными частями не позднее мая 2017 г.

Формирование стоимости квадратного метра вышеназванных квартир производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

**Условия оплаты:** при заключении договора дольщик вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров, на момент заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата для всех категорий участников долевого строительства составляет не менее 30% от стоимости квартиры (цены договора) и должна быть внесена не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет не менее 20% от стоимости машино-места (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства будет осуществляться в белорусских рублях.

**Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке:** в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 4 декабря 2014 г. № 3079 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства объекта». Свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7546; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7547; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7548; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7550.

**Площадь и границы земельного участка:** земельный участок площадью – 2,2393 га, расположен в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Элементы благоустройства:** Комплекс работ по благоустройству включает устройство подъездов, пешеходных связей, установку малых архитектурных форм, озеленение, организацию детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок, площадок для отдыха взрослых.

**Количество в строящемся объекте строительства самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода объекта строительства в эксплуатацию:** общее количество квартир – 327, в том числе: однокомнатные – 54 единицы; двухкомнатные – 128 единиц; трехкомнатные – 145 единиц. Общее количество встроенных общественно-торговых помещений – 11 единиц. Общее количество машино-мест – 181 единица.

**Общее имущество объекта строительства, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта строительства в эксплуатацию и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось дольщиками, и передаются застройщиком товариществу собственников.

**Предполагаемый срок ввода объекта строительства в эксплуатацию:** окончание строительства – 9 мая 2017 г.

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда от 29 декабря 2014 г. № 03.01-05/7 заключен застройщиком с ОАО «Стройтрест № 35».

**Условия приема заявлений и ознакомления с объектом долевого строительства:** прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3. Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик вправе заключить договор с другим претендентом. Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – Общество с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» (ООО «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс»), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3 или по телефону 8 (017) 292 42 19.

УНП 100220190

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО» С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НА 40 ПРОЦЕНТОВ

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб., коп. | Задаток 20%, руб., коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Лот № 5 – капитальные строения:** | | | |
| 1.1 | склад хлопка открытый с разгрузочной площадкой с инвентарным номером 110/С-102617, площадью 3253,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7/5, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002576, площадью 0,3254 га | **82 043,28** | **16 408,66** |
| 1.2 | железнодорожный путь № 4 с инвентарным номером 110/С-102752, протяженностью 137,8 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 14100000000600271, площадью 0,0472 га | **14 652,94** | **2 930,59** |
| 1.3 | железнодорожный путь № 5 с инвентарным номером 110/С-102854, протяженностью 200,3 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002619, площадью 0,0560 га | **21 097,94** | **4219,59** |
| | **Итого:** | | **117 794,16** | **23 558,84** |

**Аукцион состоится 27 октября 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.**

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Заявления и документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21.10.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: **(80163): 47-63-80; 47-64-93.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РН, 2РП серии ТСН №№ 0112656-0112657 **считать недействительными.** УНП 100122726

**Считать недействительными** страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ **серии ВА №8654321, №8654253** СООО «Белкоопстрах».

## Пытанне-адказ

***Праз колькі часу пасля выкліку міліцыя павінна прыбыць на месца здарэння?***

Адказвае **старшы інспектар аддзялення каардынацыі арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС маёр міліцыі Уладзімір СЛЕСАРЭНКА.**

Адзінага адказу на гэтае пытанне няма, умовы залежаць ад шэрагу фактараў. У горадзе найбліжэйшы нарад ці ўчастковы інспектар павінен прыбыць на месца здарэння на працягу 10 хвілін, калі з часу здзяйснення злачынства прайшло не больш за адну гадзіну альбо маюцца звесткі аб злачынцу. У тым выпадку, калі прайшло больш за гадзіну, на месца ўжо накіроўваецца не нарад, а следча-аператыўная група. Пры паступленні інфармацыі, якая паказвае на прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння, у бліжэйшага нарада ёсць не больш за 15 хвілін, каб прыбыць па адрасе. Следча-аператыўная група абмежаваная 25 — 50 хвілінамі ў залежнасці ад часу здзяйснення злачынства і наяўнасці звестак аб злачынцу.

Калі ж пацярпелы знаходзіцца ў сельскай мясцовасці, а правапарушальнік вядомы і з моманту супрацьпраўнага дзеяння прайшло не больш за гадзіну, нарад ці ўчастковы інспектар міліцыі прыедзе на адлегласць да 30 км на працягу гадзіны, на адлегласць больш за 30 км — за паўтары гадзіны.

У цяперашні час значная ўвага надаецца ўдасканаленню тэхнічнага забеспячэння міліцыі. Напрыклад, супрацоўнікі органаў унутраных спраў Мінскага гарнізона выкарыстоўваюць у працы радыёстанцыі з GPS-датчыкам. Аператыўны дзяжурны на інтэрактыўнай карце бачыць, які нарад знаходзіцца бліжэй да месца выкліку, і перадае яму паведамленне, што спрыяе павышэнню хуткасці.

Сутнасць працы міліцыі — аказаць дапамогу людзям, якія трапілі ў бяду, таму варта памятаць, што тэлефон 102 з'яўляецца нумарам экстраннай службы, якім мэтазгодна карыстацца толькі ў выпадках пагрозы жыццю і здароўю, а таксама для паведамленняў аб злачынствах і правапарушэннях, відавочцамі якіх вы сталі. Для вырашэння больш дробных і нетэрміновых праблем варта звярнуцца да ўчастковага міліцыянера або ў аддзел (упраўленне) унутраных спраў. Усе тэлефоны знаходзяцца ў адкрытым доступе.

Калі ў вас ёсць пытанні да супрацоўніка міліцыі, можаце звяртацца з імі ў рэдакцыю газеты «Звязда» па тэлефоне 8 (017) 287-18-71, на электронны адрас info@zviazda.by (з пазнакай «Пытанне МУС») або па пошце: г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013

## Рэйд

# З ХУТКАСЦЮ СВЯТЛА Ў ВЕЧНУЮ ЦЕМРУ

## Сапраўдныя байкеры правілы не парушаюць



**Аб сваім набліжэнні яны абвяшчаюць загадзя: гучны роў матора, імгненне... і вы ўжо бачыце толькі сілуэт удалечыні. Хто яны: каралі дарог ці іх праклён? Разам з супрацоўнікамі ДАІ мы праверылі сталічных байкераў.**

Перад рэйдам праглядаю стужку навін: за адзін дзень у Мінску два сур'ёзныя здарэнні з удзелам матацыклістаў, адно з іх са смяротным зыходам. І гэта, на жаль, не рэдкасць. Як можна суцішыць гоншчыкаў, мы паразважалі падчас патрулявання.

На гадзінніку — дваццаць трыццаць, з дзяжурнымі аўтаінспектарамі выязджаем на галоўную магістраль горада — праспект Незалежнасці. Вячэрні і начны час — перыяд павышанай актыўнасці матацыклістаў. І сапраўды, цяжка ўтрымацца ад спакусы і, без перашкод у выглядзе шматлікіх аўтамабіляў або грамадскага транспарту, не праехацца па шырокай свабоднай дарозе. Менавіта таму праспект Незалежнасці і праспект Пераможцаў — улюбёныя месцы матацыклістаў. Аднак у гэты дзень на дарозе іх няшмат. У межах бачнасці машыны ДАІ, вядома, не ганяюць. Спыняем аднаго з іх для праверкі дакументаў. Малады чалавек спакойна цікавіцца прычынай і нетаропка дастае пасведчанне кіроўцы, пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку, страхоўку, талон тэхагляду. Каб зверыць твар кіроўцы з фотаздымкам, інспектар просіць яго зняць шлем. З дакументамі ўсё добра, таму, пажадаўшы шчаслівай дарогі, адпускаем законапаслухмянага матацыкліста.

**Статыстыка:**

***У мінулым годзе ў сталіцы адбылося 27 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам матацыклістаў, у якіх пацярпела 26 чалавек, яшчэ трое загінула. За 9 месяцаў гэтага года адбылося 17 такіх ДТЗ, 16 чалавек атрымалі траўмы, пяцёра загінулі. Улічваючы, што байкерскі сезон падыходзіць да канца, можна адзначыць тэндэнцыю да зніжэння агульнай колькасці здарэнняў, звязаных з матацыклістамі, чаго, на жаль, нельга сказаць пра колькасць загінулых.***

— Падчас дзяжурства мы альбо знаходзімся ў транспартным патоку, проста на месцы кантралюючы рух, альбо ўладкоўваемся на абочыне, каб бесперашкодна можна было спыніць кіроўцаў для праверкі, — расказвае **старшы інспектар ДПС спецпадраздзялення па забеспячэнні дарожнай бяспекі ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама маёр міліцыі Павел ПІСКАРОЎ.** — Матацыклісты — гэта асаблівая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху. З-за таго, што матацыклы могуць развіваць вельмі высокія хуткасці, да таго ж гэты від транспарту значна больш манеўраны, чым аўтамабіль, яны адчуваюць сябе амаль няўлоўнымі. Таму з абочыны, калі яны рухаюцца вельмі імкліва, іх практычна немагчыма спыніць. Звычайна мы іх не пераследуем, бо гэта можа стварыць небяспечную сітуацыю на дарозе, а перадаём іншым пастам, каб падрыхтаваліся да іх затрымання. У цэлым, не думаю, што пераслед — гэта эфектыўна: у стрэсавай сітуацыі кіроўца дапускае значна больш памылак, да таго ж з-за пагоні ён яшчэ больш павялічвае хуткасць. Некаторыя матацыклісты, ведаючы, што будуць парушаць, загадзя закрываюць свае нумарныя знакі, каб іх нельга было вызначыць праз сродкі відэафіксацыі.

Зараз уводзіцца ў эксплуатацыю новы тып патрульных машын: без спецыяльнай «размалёўкі». Такі аўтамабіль ніяк не распазнаецца сярод іншых, аднак ён забяспечаны і рацыяй, і замаскіраванымі праблісковымі маячкамі. Заўважыўшы парушальніка ў патоку, супрацоўнікі ДАІ пад'язджаюць да яго на такой машыне і даюць указанне спыніцца. Нават з пункту гледжання псіхалогіі значна менш імавернасць, што матацыкліст паспрабуе ўцячы, таму што ён будзе заспеты знянацку. Акрамя таго, у дадзены момант ёсць падраздзяленні ДАІ, якія ў сваёй працы самі выкарыстоўваюць мотатранспарт, што з асаблівым энтузіязмам успрымаюць маладыя супрацоўнікі, — расказвае Павел.



У той час, як мы раз'язджаем па горадзе, на дарогах усё спакойна. Зрэдку трапляюцца матацыклісты, але яны выконваюць правілы. Па меншай меры, страшэнных перавышэнняў хуткасці ні ў каго няма.

— Былі выпадкі, калі фіксавалі хуткасць 200 кіламетраў у гадзіну. Вы толькі ўявіце: 200 кіламетраў у горадзе! — успамінае інспектар. — Вядома, перавышэнне хуткасці — гэта асноўная праблема. Без шлемаў (іх нашэнне абавязковае) не ездзяць, мабыць, гэта пытанне прэстыжу. А што тычыцца кіравання ў нецвярозым стане або язды без тэхагляду, то колькасць парушальнікаў такая самая, як сярод аўтамабілістаў. Хоць ёсць адно спецыфічнае парушэнне — язда без глушыцеля. На шум, які перашкаджае адпачываць начамі, пастаянна скардзяцца жыхары дамоў, размешчаных уздоўж шырокіх дарог. Як толькі паступае званок, мы выязджаем на месца — разбірацца.

Ганяе часцей за ўсё моладзь на спартыўных мотабайках. А так званыя тыповыя байкеры — дарослыя барадатыя мужчыны ў скуранай вопратцы і з шматлікімі татуіроўкамі, на магутных матацыклах — ездзяць вельмі акуратна: ім статус не дазваляе парушаць правілы. Дарэчы, разам з павелічэннем агульнага ліку матацыклаў на дарогах, значна вырасла і колькасць дзяўчат за рулём гэтага двухколавага транспарту. Прадстаўніцы прыгожага полу, што і варта было чакаць, кіруюць значна акуратней, чым мужчыны.

Пакуль мы размаўляем, каля нас з'яўляецца матацыкліст. Вырашаем яго праверыць. Малады чалавек вельмі нервуецца, нават можна заўважыць, як у яго дрыжаць рукі. Аднак з дакументамі, якія ён па чарзе дастае з заплечніка, усё ў парадку. Вось толькі пытанне аб талоне тэхнічнага агляду ставіць матацыкліста ў тупік. Ён пачынае корпацца ў заплечніку, абмацваць кішэні, ператрасаць кашалёк, паўтараючы ўсе гэтыя дзеянні па некалькі разоў з такой стараннасцю, што ўсе дакументы аказваюцца на зямлі. Увесь гэты час інспектар цярпліва чакае, заклікаючы перастаць так хвалявацца. У выніку запаветная паперка ўсё ж такі знаходзіцца. Пасля чаго малады чалавек з прыкметнай палёгкай зноў адпраўляецца ў шлях. А мы ў сваю чаргу з праспекта Незалежнасці, «небагатага» ў гэты дзень на байкераў, перамяшчаемся на вуліцу Прытыцкага.

На Прытыцкага мы не сустракаем ніводнага матацыкліста — рэйд прайшоў спакойна. «Магчыма, тое, што сталі ездзіць спакайней, звязана з гучнымі аварыямі. Якім бы бязбашаным ты ні быў, але калі чуеш пра гэтыя страшныя здарэнні, міжволі задумваешся пра тое, як зберагчы сябе і іншых людзей. Ёсць варыянты кардынальнага вырашэння праблемы: забараніць матацыклістам уезд у цэнтр горада, як гэта зрабілі, напрыклад, у Магілёве цалкам і ў Гомелі на начны перыяд. Аднак матацыклісты з'яўляюцца паўнапраўнымі ўдзельнікамі дарожнага руху і, на мой погляд, такія захады празмерныя», — разважае Павел.

**Старшы інспектар па асаблівых даручэннях ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама падпалкоўнік міліцыі Міхаіл КАРНІЕВІЧ** адзначае, што тэма матацыклістаў на дарогах застаецца адной з балючых. З-за высокіх хуткасцяў «жалезных коней» іх уладальнікі трапляюць у сур'ёзныя дарожна-транспартныя здарэнні, пры гэтым матацыклісты, як правіла, слаба абароненыя фізічна. Спецыяльная экіпіроўка дапамагае абысціся без знешніх пашкоджанняў, але ніяк не зберагае ад больш сур'ёзных траўмаў: не выратуе «касуха» ад пераломаў. Адным з самых эфектыўных метадаў барацьбы з велізарнымі хуткасцямі сталі перасоўныя датчыкі фотафіксацыі. Былі зарэгістраваны перавышэнні больш чым на 40 кіламетраў у гадзіну, што цягне за сабой пакаранне ў памеры 6 базавых велічынь (126 рублёў). Некалькі разоў заплаціўшы немалыя штрафы, многія зрасходавалі суму, выдаткаваную на бензін, таму безразважных матацыклістаў на дарогах стала менш.

Ёсць яшчэ адна праблема — самастойнае ўмяшанне ў канструкцыю транспартнага сродку. Матацыклісты асабліва любяць так званыя «гаражныя» перарабкі. Многія ездзяць з пашкоджанай выхлапной сістэмай, кошт якой, дарэчы, сувымерны з цаной самога транспартнага сродку.

У распараджэнні супрацоўнікаў ДАІ ёсць мотатранспарт, які ў працы з байкерамі дае магчымасць адчуваць сябе як роўных. Інспектары выкарыстоўваюць матацыклы ў перыяд цёплага сухога надвор'я і выконваюць на іх усе тыя ж функцыі, што і на аўтамабілях. Арыентавання выключна на ўзаемадзеянне з байкерамі ў іх няма: правяраюць усіх, хто перамяшчаецца на колах

**Дарэчы:**

***Ёсць тры катэгорыі правоў для матацыклістаў: AM — для скутараў, A1 — для лёгкіх матацыклаў аб'ёмам рухавіка да 125 кубоў і A для тых, што перавышаюць гэты аб'ём. З канца мінулага года атрымаць правы катэгорыі A можна толькі маючы стаж кіроўцы з катэгорыяй A1 больш за два гады. Аднак калі ў вас ужо ёсць пасведчанне кіроўцы катэгорыі B (легкавы аўтамабіль), усё значна прасцей: трэба толькі прайсці перападрыхтоўку ў аўташколе і здаць практычны экзамен.***

## Навіны 102

# НАРКАЗЛАЧЫНСТВАЎ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

Аб гэтым у межах міжнароднага семінара «Супрацьдзеянне ўчыненню нарказлачынстваў у інтэрнэце» заявіў **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Васіль ЛОСІЧ.** На 10% у параўнанні з тым жа перыядам мінулага года скарацілася колькасць крымінальных спраў, якія былі ўзбуджаны за ўжыванне і распаўсюджванне наркотыкаў. Акрамя таго, на 30% у сукупнасці стала менш выпадкаў са смяротным зыходам, выкліканых наркатычнымі і псіхатропнымі рэчывамі, а таксама выпадкаў перадазіроўкі, для выратавання ў выніку якіх спатрэбілася спецыялізаваная медыцынская дапамога.

Як адзначыў Васіль Лосіч, гэта можна растлумачыць дзеяннем Дэкрэта №6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў». На дадзены момант становішча ў гэтай сферы стабілізаванае. Аднак адной з галоўных праблем застаецца тое, што гандаль наркотыкамі носіць транснацыянальны характар. Акрамя таго, асаблівасцю гэтага бізнесу з'яўляецца актыўнае задзейнічанне сучасных тэхналогій: інтэрнэт-здзелкі падмацоўваюцца анлайн-плацяжамі. Нават для перадачы тавару не патрэбны асабістыя сустрэчы: для гэтага выкарыстоўваюцца схованкі. Тым не менш у праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь ёсць вопыт эфектыўнай барацьбы з распаўсюджваннем забароненых прэпаратаў праз інтэрнэт.

На міжнародным семінары спецыялісты з Нідэрландаў, Ірландыі, Швецыі, Польшчы, Літвы, краін-удзельніц «Усходняга партнёрства», а таксама прадстаўнікі МУС і Акадэміі МУС Беларусі абмеркавалі прагрэсіўныя спосабы спынення наркагандлю ў сеціве. Вядучай тэмай стала падрабязнае вывучэнне механізмаў урэгулявання гэтага пытання на заканадаўчым узроўні, а таксама праца «пад прыкрыццём» супрацоўнікаў праваахоўных органаў у інтэрнэце. Былі прааналізаваны канкрэтныя прыклады. **Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН** падкрэсліла, што МУС Беларусі адыгрывае значную ролю як у напрамку інфармавання, так і ў практычным супрацоўніцтве ва ўзаемадзеянні з еўрапейскімі спецыялістамі ў сферы барацьбы з наркагандлем

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by



■ Беражыце блізкіх

# ПАЗАКЛАСНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА ПРАВІЛАХ БЯСПЕКІ

## Калі вы пераходзіце дарогу на чырвоны, ваша дзіця зробіць тое самае

**Для бацькоў няма нічога больш каштоўнага, чым жыццё іх дзяцей. Мамы і таты хвалююцца, калі не атрымліваюць своечасовага званка нават ад сваіх дзяцей перадпенсійнага ўзросту, што ўжо казаць пра тых, каму з-за працы даводзіцца пакідаць без нагляду зусім малых, якія вучацца ў малодшых класах. Як даступна растлумачыць дзецям правілы бяспекі, каб яны іх зразумелі і прымянялі на практыцы? З гэтым пытаннем мы накіраваліся да начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўніка Ігара ГАТАЛЬСКАГА. Ён даў вельмі карысныя для ўсіх бацькоў парады.**

### Бацьку можна, дык чаму мне нельга?

З-за адсутнасці вопыту знаходжання ў адзіноце і самастойных перамяшчэнняў дзеці, як толькі аказваюцца без нагляду, адразу ж трапляюць у зону рызыкі. Задача бацькоў — не на словах, а на справе падрыхтаваць дзіця да сустрэчы з навакольным светам сам-насам. Першае і самае галоўнае правіла — гэта падаваць уласны станоўчы прыклад. Дзіця ніколі не будзе выбіраць крыху больш доўгі шлях па добра асветленай дарозе, калі з бацькамі яно заўсёды зразала праз цёмны парк. Словы пра тое, што такім чынам паступаць можна толькі ў прысутнасці дарослых, не дзейнічаюць, бо кожны маленькі грамадзянін імкнецца пераймаць манеру паводзін старэйшых. А раз бацьку — галоўнаму аўтарытэту — можна, дык чаму мне нельга? Так што адзінае выйсце — знаходзячыся побач з дзіцем, сачыць за кожным сваім учынкам.

Дарогу да школы трэба не проста апісаць, неабходна некалькі разоў прайсці яе разам з дзіцем. Асаблівую ўвагу варта надаць правілам дарожнага руху. На перакрыжаванні задаць дзіцяці пытанне: у які бок спачатку глядзім? Можна прыдумаць для яго якія-небудзь цікавыя асацыяцыі, каб прасцей было запомніць. Паўтараць практыкаванні трэба, пакуль іх выкананне не дойдзе да аўтаматызму. Пасля таго як вы ўсё ж вырашыце адпусціць дзіця адно, не лішнім будзе прасачыць, як яно выконвае вашы ўказанні.

У наш час велізарнай праблемай не толькі з пункту гледжання псіхалогіі, але і з пункту гледжання бяспекі сталі гаджэты. Напрыклад, навушнікі не раз станавіліся прычынай дарожна-транспартных здарэнняў. Нават дарослому варта даставаць іх з вушэй на праезнай часткі: мала што — а дзіцяці наогул лепш устрымацца ад праслухоўвання музыкі ў навушніках на працягу ўсёй дарогі. Яшчэ адзін момант, звязаны з дарагімі прыладамі, — гэта крадзяжы. Калі ў аднакласнікаў ёсць «наварочаныя» смартфоны, у большасці бацькоў не хапае сіл адмовіць свайму дзіцяці купіць гэткі самы. Але дзіцячая няўважлівасць робіць сваю справу — і любімы тэлефон з мностам захапляльных гульняў бясследна знікае. Прадумаць, дзе захоўваць тэлефон або планшэт, лепш загадзя. Пажадана, каб у заплечніку быў адмысловы адсек з боку спінкі, калі ж гэта вопратка, дык класці гаджэт лепш ва ўнутраную кішэню, якая надзейна зашпіляецца. Гэта простыя меры засцярогі, якія дапамогуць зберагчы спакой дзіцяці і ваш сямейны бюджэт ад непрадбачаных выдаткаў.

### Сарамлівасць — прэч!

Маршрут, па якім дзіця будзе вяртацца дадому са школы, таксама лепш абгаварыць загадзя. Добра, калі дзеці перамяшчаюцца невялікімі групамі, хаця б па 2-3 чалавекі. Калі ж дзіця вучыцца ў другую змену, то трэба ўсё ж пастарацца падладзіць свой графік так, каб была магчымасць яго сустрэць. Аб'яднаўшыся з іншымі бацькамі-суседзямі, можна дамовіцца забіраць дзяцей са школы па чарзе. Калі ж з якіх-небудзь прычын дзіця ўсё ж дабіраецца да дома адно, не лішнім будзе папрасіць яго патэлефанаваць ужо з кватэры.

З самага ранняга дзяцінства трэба вучыць разам з дзіцем адрас, яго імя і прозвішча, імёны бацькоў. Неабходна растлумачыць, як сябе паводзіць, калі раптам яно згубіцца. Лепш за ўсё падыходзіць да людзей у форме, таму не варта палохаць дзяцей міліцыянерамі. У выпадку, калі побач няма прадстаўнікоў праваахоўных органаў, можна звярнуцца да любога чалавека, які знаходзіцца на працоўным месцы. А вось да незнаёмцаў на вуліцы з просьбай аб дапамозе маленькім дзецям падыходзіць не трэба.

Дзіця павінна дакладна ведаць, што калі здалося, быццам нехта ідзе следам, то ні ў якім разе нельга спрабаваць хутка забегчы ў пад'езд. Лепш пайсці ў людную краму, пачакаць нейкі час і на ўсялякі выпадак пазваніць бацькам. Калі ж ніякага людняга месца паблізу няма, а незнаёмы актыўна праяўляе ўвагу, то выйсце адно — крычаць, што хочаш, галоўнае — з усіх сіл. Абавязкова трэба растлумачыць дзіцяці, што ў гэтым няма нічога саромнага, і вы б зрабілі гэтаксама.

Не варта ўнушаць дзіцяці, што небяспеку можа прадстаўляць толькі дарослы «дзядзька». Злачынец можа паўстаць у любым абліччы, таму правіла не размаўляць з незнаёмцамі і ўжо тым больш нічога ў іх не браць павінна распаўсюджвацца на ўсіх — на старых і маладых, на «дзядзечкаў» і «цётачак». Гэта ж адносіцца і да званкоў у дзверы: адчыняць, папярэдне паглядзеўшы ў вочка, можна толькі родным. У перамовы праз дзверы лепш не ўступаць. У дзіцяці павінен быць спіс тэлефонаў, на якія яно ў выпадку небяспекі можа пазваніць. Пажадана, каб сярод іх быў і нумар добра знаёмых суседзяў, якія хутка могуць прыйсці на дапамогу.

### Давярай, але правярай

Калі ж паўстала надзвычайная сітуацыя, напрыклад пажар, трэба неадкладна пакінуць дом. Для таго каб дзіця зрабіла менавіта так, яго ні ў якім разе нельга запалохваць. Малое павінна ведаць, што самая вялікая каштоўнасць — гэта яго жыццё, таму не трэба спрабаваць самому змагацца з агнём, каб «бацькі, не дай бог, не даведаліся». Ужо апынуўшыся на вуліцы, можна патэлефанаваць у службу выратавання, але ніяк не раней. Выходзячы з імавернасці непрадбачаных сітуацый, дзіцяці нельга замыкаць у кватэры на ключ без магчымасці самастойна выбрацца.

У тлумачальных гутарках трэба абапірацца на спецыфіку мясцовасці. Калі, напрыклад, вы жывяце ў вёсцы, ля якой у гады Вялікай Айчыннай вайны ішлі жорсткія баі, асаблівую ўвагу трэба надаць боепрыпасам, якія засталіся ў зямлі, падрабязна расказаць пра тое, што, знайшоўшы падазроны прадмет, нельга да яго нават блізка падыходзіць, не тое што чапаць. У цэлым, у пытанні бяспекі дробязяў не бывае, таму трэба старацца ахапіць тэму максімальна шырока. Перыядычна варта пытацца, як дзіця павяло б сябе ў тым ці іншым выпадку, у гульнявой форме мадэляваць розныя сітуацыі. Аднак імкнуцца праверыць на справе, папрасіўшы сваіх знаёмых падыграць, лепш не трэба: гэта можа нанесці шкоду псіхіцы малога.

Да пэўнага ўзросту (усё вызначаецца індывідуальна), пакуль у дзіцяці нізкі ўзровень усвядомленасці сваіх дзеянняў, лепш перыядычна правяраць яго перапіскі ў сацыяльных сетках. Трэба старацца ўсталяваць з дзіцем даверныя адносіны, каб яно без страху магло падзяліцца ўсімі падазронымі гісторыямі.

На ўсякі выпадак дзіцяці можна паказаць і адпрацаваць з ім некалькі простых прыёмаў самаабароны. Аднак трэба растлумачыць, што іх можна ўжываць толькі ў крайніх выпадках. Калі ў дзіцяці няма схільнасці да асацыяльных паводзін, то яго для надання агульнай упэўненасці ў сабе можна адправіць на курсы самаабароны. Аднак не варта перагінаць: мы ўсё ж жывём у мірны час у спакойнай краіне.

І галоўнае — бацькам самім варта выконваць правілы бяспекі, прыдуманыя не проста так. Напрыклад, нягледзячы на неабходнасць перавозкі дзяцей да 12 гадоў у спецыялізаваным аўтакрэсле, многія бацькі адмаўляюцца прытрымлівацца гэтага правіла. Як вынік — значна больш сур'ёзныя, чым маглі б быць, наступствы дарожна-транспартных здарэнняў. Усё ж слоган «Бяспека дзіцяці — у руках бацькоў» быў прыдуманы нездарма!

**Статыстыка:**

***За кожнай навучальнай установай замацаваны спецыяліст, які мінімум раз у месяц праводзіць прафілактычныя заняткі з дзецьмі. Асаблівая ўвага гэтым пытанням надаецца ў пачатку восені, калі дзеці паступова адаптуюцца да школьнага рэжыму жыцця, і ў канцы вясны, калі яны перастаюць знаходзіцца пад пастаянным кантролем дарослых. Праводзяцца тэматычныя месячнікі. І вынікі даюць сябе адчуваць: колькасць злачынстваў, накіраваных супраць непаўналетніх, за 8 гадоў скарацілася амаль у 4 разы. Калі ў 2007 годзе іх было 5703, то ў 2015-м — 1589, у тым ліку ў 6 разоў менш стала злачынстваў супраць уласнасці (крадзяжоў): 615 у параўнанні з 3588.***

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■ Па-за службай

# ВЫРАЗІЦЬ СЯБЕ Ў ТАНЦЫ

## Міліцыянер з Дэпартамента аховы танцуе ў знакамітым брэсцкім ансамблі «Радасць»

**Хто ведаў бы Дзмітрыя Лявосіка ў яго 23 гады, і ці ўбачыў, спазнаў, асэнсаваў бы столькі ў сваім жыцці за гэты перыяд часу ён сам, каб не заняткі танцамі? Сёння яму лягчэй назваць краіны Еўропы, дзе ён не быў, чым тыя, у якіх даводзілася бываць з гастролямі. Усё гэта дзякуючы «Радасці».**

Захапленнем танцамі Дзмітрый абавязаны найперш маме. Гэта яна завяла яго, шасцігадовага, у мастацкую гімназію №3 у Брэсце, туды, дзе ўрокі харэаграфіі, музыкі пазначаны ў раскладзе побач з іншымі дысцыплінамі. Спачатку вучыўся і займаўся нароўні з усімі, потым хлопчыка адабралі ў дзіцячы танцавальны ансамбль «Прыбужжа», і Дзмітрый Лявосік заняўся танцамі на больш сур'ёзным узроўні. А «Прыбужжа» даўно ўжо служыць своеасаблівай кузняй кадраў для заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танцаў «Радасць». Яго кіраўнік Анатоль Вараб'ёў і прыкмеціў здольнага хлопца ў дзіцяча-юнацкім калектыве. З той пары Дзмітрый танцуе ў «Радасці».

За гэты час хлопец паспеў скончыць Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, на працу пасля адпаведнай падрыхтоўкі паступіў у Маскоўскі райаддзел Дэпартамента аховы абласнога цэнтра. Прапаршчык міліцыі Лявосік нясе службу ў адным з аддзелаў прымусовага выканання.

— На ўсіх святах дажынак выступалі, на канцэртах з нагоды знакавых для краіны падзей нас часта запрашаюць, — згадвае самадзейны артыст. — Кожнае лета выязджаем на гастролі ў Еўропу. Часам запрашэнняў бывае столькі, што даводзіцца выбіраць. Сёлета пабывалі ў Францыі. Варта сказаць, што еўрапейцы ўспрымаюць наша танцавальнае мастацтва проста «на ўра». Вельмі прыемна, калі ў зале сустракаеш суайчыннікаў. Бывае проста падчас выступлення чуем: «Ма-лай-цы!» Значыць, на канцэрце прысутнічаюць выхадцы з былога Саюза, а то і з Беларусі. Пасля выступлення яны, бывае, падыходзяць, стараюцца паразмаўляць, распытаць.

Танцы Дзмітрый больш любіць імклівыя, рытмічныя, пра якія кажуць, што яны «запальваюць». Самыя яго любімыя — казацкія танцы з шаблямі. Хоць не раз здараліся казусы-непрыемнасці падчас выступлення, калі танцоры залішне захапіўшыся, наносілі траўмы адзін аднаму. Ну і Дзіма атрымліваў па пальцах. Наконт гэтага кажа, што ва ўсялякай вытворчасці бываюць выдаткі, так і тут.

— Але ж якое гэта задавальненне станцаваць так, каб потым, пасля выступлення падыходзілі людзі і выказвалі сваё захапленне! — дзеліцца ўражаннямі артыст. — Асабліва еўрапейцы здзіўляюцца, як можна паўтары гадзіны рухацца ў такім тэмпе, гэта ж фізічна цяжка. Але для нас прывычна. У праграме рухомыя танцы, як правіла, чаргуюцца з больш павольнымі, меладычнымі.

Танец цяпер для яго больш чым хобі. Гэта магчымасць найперш паказаць сябе, на мове пластыкі, цела, рытму расказаць людзям пра свае думкі, адчуванні. Апошняе асабліва важна цяпер, лічыць Дзмітрый, калі ў Еўропе стала так неспакойна.



**Дзмітрый ЛЯВОСІК — міліцыянер роты міліцыі Маскоўскага (г. Брэста) аддзела Дэпартамента аховы МУС.**

Гэтым летам, пакуль былі на гастролях, у Францыі адбылося два тэракты. Раніцай усталі ў Марсэлі, а там аб'яўлена ваенная становішча. На вуліцах вайскоўцы з аўтаматамі, хадзіць можна толькі групай у суправаджэнні... Калі трапляеш вось у такую сітуацыю рэальна, а не бачыш па тэлевізары, адчуваеш, якое кволае жыццё, няўстойлівы свет, а вось мастацтва, музыка, дабро і могуць аб'яднаць людзей.

Цікаўлюся ў Дзмітрыя, як яго захапленне ўспрымаюць сябры-равеснікі. Кажа, што раней нават крыху пасмейваліся, маўляў, танцы — гэта для дзяцей альбо для дзяўчат. Потым, калі стаў ім прывозіць сувеніры з Лондана, іншых цікавых месцаў, пачалі паважаць. А цяпер наогул з павагай ставяцца да справы, бо выраслі і разумеюць, што любое паспяховае выступленне азначае вялікую працу.

А пастаянная фізічная нагрузка, падтрыманне сябе ў добрай форме, вядома, ідуць на карысць асноўнай рабоце.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Зачапіла

Рэверс з сецiва

## Я. ЛЫСКАВЕЦ. «У СТРАІ З ЗЕЎСАМ І НОРАЙ...»

*(«Чырвонка. Чырвоная змена» ад 15 верасня)*

— Вельмі ўражвае, якога ўзроўню вывучкі можа дасягнуць сабака, калі яго гаспадар мае адпаведныя навыкі. Не параўнаць з тымі, якія ў гарадскіх скверах гуляюць са сваімі гадаванцамі. Сядзе такі аматар свойскіх жывёл на лаву, закурыць цыгарэтку, а сабака сам па сабе. Ці яшчэ лепшы прыклад — прагулка майго суседа з лабрадорам доўжыцца... секунда 30. Няцяжка здагадацца, на што гэтага часу хапае беднаму сабаку.

Зусім іншая справа, калі гадаванец для чалавека — сапраўдны сябар. Такія часцей ходзяць не ў скверы, а на спецыяльныя пляцоўкі, бавяць разам час, а не проста суіснуюць. Такі гаспадар і грошай на жывёлу не пашкадуе, і часу свайго, і, прабачце, прыбярэ за сабакам пасля прагулкі. Да гэтых людзей у мяне шчырая павага. А першыя... Ці не ў такім стаўленні да братоў нашых малодшых заключаецца праблема гарадоў з кінутымі жывёламі, якія знаходзяць сабе прытулак на сметніках і ў падвалах?

**Тамара,** *г. Гомель.*

## С. ЯСКЕВІЧ. «НАКАРМІЦЬ ТРОХ ЧАЛАВЕК ЗА 10 РУБЛЁЎ»

*(«Звязда» ад 16 верасня)*

— Мяне гэтыя нататкі падштурхнулі да сумнаватага роздуму аб рэаліях нашага жыцця. Калі каўбаса з рознымі раслінна-крупянымі дабаўкамі каштуе два з паловай рублі, і яна запатрабаваная, то нічога добрага ў тым няма. Такую ежу здаровай не назавеш, а бабуля купляе прадукт для сваіх унукаў!

Вось і грэчка нашмат падаражала, ды і на іншыя прадукты цэны не стаяць на месцы — гэта добра вядома ўсім, хто штодня ходзіць у краму. Значыць, вучыцца эканоміць давядзецца ў найбліжэйшы час многім. Адзін станоўчы момант у акрэсленай сітуацыі ўсё ж можна адзначыць. Цяпер мы будзем больш гатаваць дома. Апошнім часам асабліва маладыя гаспадыні сталі ленавацца варыць-парыць для сям'і. Цяпер можна купіць і салаты, і паўфабрыкаты якія хочаш страў у любым супермаркеце. Але і танней абыдзецца, і смачнейшым будзе тое, што прыгатуеш з настроем на ўласнай кухні.

**Ірына Саўчук,** *г. Брэст.*

## І. СІДАРОК. «ЯК ЗРАБІЦЬ З ХРУШЧОЎКІ «ЦУКЕРКУ»?

*(«Звязда» ад 17 верасня)*

— Прыклад перараблівання кватэры, што апісаны ў артыкуле, сапраўды ўражвае!.. Такое па сілах зрабіць толькі майстру і чалавеку з грашыма. Аднак асноўныя моманты, як правільна арганізаваць і скарыстаць нават мінімальную прастору, думаю, падыдуць кожнаму руплівому гаспадару, які дбае пра сваё жыллё і пакутуе ад недахопу месца.

Вось толькі не напісалі, што пасля такога рамонту трэба новы тэхпаспарт на кватэру выпраўляць ды з усімі службамі камунальнымі ўзгадняць праекты падчас работ. І ўвогуле, калі сам не разумееш, як трэба, а проста вельмі хочаш менавіта так, як прыдумаў, лепш кансультавацца са спецыялістамі. Я вось падчас рамонту сэканоміць вырашыў. Каб не раўняць сцяну шпатляваннем, дазволіў гора-майстрам «зашыць» яе гіпсакардонам. Праз пяць гадоў такая цвіль у кутку пайшла, што хоць пеніцылін збірай!.. Так што жадаю ўсім думаць і рабіць, перш чым рабіць.

**Уладзімір Лявончык,** *Віцебская вобласць.*

## І. КРЫЖЭВІЧ. «ЯК ТАМ, НА МЫТНІ?»

*(«Звязда» ад 20 верасня)*

— У мяне ёсць сваяк, ветэран мытнай службы. Таму пра тое, наколькі цяжкая праца мытніка, я ведаю. Вядома, нямала змянілася з савецкіх часоў у лепшы бок. За 25 гадоў існавання ДМК прагрэс адбыўся вельмі прыкметны. Мы сёння маем эфектыўныя прапускныя пункты і высокапрафесійных супрацоўнікаў. Сёння зручна ездзіць праз нашу мяжу ў Польшчу. Не раз сам праязджаў праз «Брузгі» — сапраўды, у мяне няма ніякіх нараканняў у дачыненні да мытных інспектараў. Цікава, наколькі эфектыўным будзе эксперымент, пра які казаў Юрый Сінько? Не аднойчы чуў ад свайго брата, што ў іх была спецыяльная сістэма, якая аналізуе патэнцыйныя рызыкі адносна шэрагу кіроўцаў. Але яна, сапраўды, не настолькі эфектыўная, як зоркае вока мытнага інспектара. Яшчэ раз са святам вас, ветэраны і супрацоўнікі мытнага камітэта!

**Уладзімір Чабатарэнка.**

## Д. КАСКО. «ЯК УЛАДКАВАЦЬ ДЗІЦЯ Ў БЕЛАРУСКАМОЎНУЮ НАВУЧАЛЬНУЮ ЎСТАНОВУ»

*(«Звязда» ад 21 верасня)*

— Калі быць шчырай, я раней нават не задумвалася пра тое, што магу выбіраць мову навучання для свайго дзіцяці. У мяне ў дзяцінстве найлепшай настаўніцай роднай мовы і культуры была бабуля. Такога чыстага маўлення, мне здаецца, я не чула ні ад каго, нягледзячы на тое, што яна жыла ў невялікім мястэчку. А вось у маіх дзяцей магчымасці пачуць беларускую мову ў паўсядзённых зносінах практычна няма, таму якраз-такі навучальныя ўстановы могуць стаць выдатнай пляцоўкай для заглыблення ў моўнае асяроддзе.

Мяне крыху засмуціў той факт, што нават пры жаданні трапіць у беларускамоўны садок ці школу не заўсёды так проста. Што значыць «куды чарга прыйдзе — туды і пойдзеш»? Мне здаецца, часы СССР даўно прайшлі. Я нават дзеля цікавасці даведалася пра свой раён. Школа з беларускамоўнымі класамі не так далёка, ды і дзіцячы садок у зоне даступнасці. Думаю, што калі паставіць гэта сабе за мэту, то дзіця можна ўладкаваць менавіта туды, куды зручней. Для тых, хто не гатовы да навучання цалкам на беларускай мове, я прапанавала б арганізаваць тэматычныя факультатыўныя заняткі ў гульнявой форме.

**Вікторыя Т.,** *Мінск* ■

# Дзесяць міфаў пра Зіновія Калабанава

**Важнай вехай майго жыццёвага шляху выступае працэс аднаўлення гістарычнай памяці пра выдатнага танкіста Вялікай Айчыннай вайны Зіновія Рыгоравіча Калабанава, 75-ю гадавіну бессмяротнага подзвігу якога мы адзначалі 19 жніўня. Нагадаю, у жніўні 1941-га экіпаж КВ-1 старшага лейтэнанта Калабанава ў скарацечным баі каля вёскі Вайсковіцы, што пад Ленінградам, падбіў 22 фашысцкія танкі, чым выратаваў паўночную сталіцу савецкай краіны ад немінучай пагібелі.**



Васіль МОНІЧ на магіле легендарнага танкіста.

У апошні час вакол імя Зіновія Калабанава разгортваюцца сур'ёзныя дыскусіі, якія спараджаюць рознага роду здагадкі і нават спекуляцыі на тэме яго гераічнага ўчынку. Як грыбы пасля дажджу плодзяцца версіі пра «тайныя» старонкі яго біяграфіі. У дні святкавання ў нашай краіне прафесійнага свята беларускіх вайскоўцаў — Дня танкістаў — хочацца расставіць усе кропкі над «і» ў справе гісторыі жыцця выдатнага абаронцы нашай Айчыны, камандзіра самага выніковага ў гісторыі вайнаў танкавага экіпажа.

### Міф № 1

Многія даследчыкі біяграфіі Зіновія Калабанава дагэтуль не могуць вызначыцца з датай яго нараджэння. Падкрэсліваю: мяркуючы па напісанай ім аўтабіяграфіі, нарадзіўся савецкі танкіст у 1910 годзе. Копія дакумента знаходзіцца ў асабістай справе афіцэра.

### Міф № 2

У газетных публікацыях, кнігах, дакументальных фільмах і тэлесюжэтах датай подзвігу экіпажа Зіновія Калабанава часам называецца то 19 жніўня, то 20 жніўня 1941 года. Мяркуючы па запісе ў асабістай справе наводчыка гарматы з калабанаўскага экіпажа танка КВ-1 Андрэя Усава, ён быў лёгка паранены ў баі 19 жніўня 1941 года. Менавіта пра гэтую дату пачатку баявых дзеянняў савецкіх танкістаў каля вёскі Вайсковіцы неаднаразова ўспамінаў у гутарках з работнікамі Мінскага аўтамабільнага завода і сам Калабанаў, а таксама адзіны сёння жывы яго аднапалчанін — жыхар Санкт-Пецярбурга, палкоўнік у адстаўцы Уладзімір Мельнікаў.

### Міф № 3

Факт братання чырвонаармейцаў роты Зіновія Калабанава з салдатамі праціўніка, які быццам бы зафіксаваны фотааб'ектывам фінскага ваеннага карэспандэнта і па сумяшчальніцтве пляменніка (!) галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Фінляндыі Карла Манергейма, з'яўляецца вынікам фантазіі некаторых нядобрасумленных даследчыкаў біяграфіі славутага савецкага танкіста.

### Міф № 4

Перад Вялікай Айчыннай вайной Зіновій Калабанаў быў вязнем сталінскага ГУЛАГу. Ніводным дакументам гэты, растыражаваны некаторымі СМІ, факт не пацвярджаецца.

### Міф № 5

Некаторыя асабліва заўзятыя «змагары» за гістарычную справядлівасць сцвярджаюць, што за свой «бескампрамісны і бунтарскі» характар у 1942 годзе Зіновій Калабанаў быў разжалаваны камандаваннем ледзь не ў радавыя. Маўляў, ён стаў чарговай ахвярай «саўдэпаўскай сістэмы», якая была ненавісным шмат каму. Аднак, як той казаў, факты — рэч упартая і сапраўды бескампрамісная. У асабістай справе афіцэра Калабанава дакладна пазначана: 31 мая 1942 года, знаходзячыся на лячэнні ў шпіталі, ён атрымаў ад «ненавіснай сістэмы» чарговае воінскае званне — капітана!

### Міф № 6

Ужо пасля Вялікай Айчыннай з-за ўцёкаў свайго падначаленага за межы акупацыйнай зоны Групы савецкіх войскаў у Германіі Зіновій Калабанаў быў спешна звольнены з радоў Узброеных Сіл СССР. Гэта яшчэ адна выдумка, пра якую няма ні радка ў асабістай справе народнага героя.

### Міф № 7

Дзякуючы ветэранам вермахта, якія звярнуліся ў 1990-х гадах у савецкі камітэт ветэранаў вайны ў Маскве, пра подзвіг танкавага экіпажа Зіновія Калабанава стала вядома шырокай грамадскасці. Гэтую ідэалагічную хітрасць-праваацыю на газетныя палосы запусцілі тыя ж лібералы, што разважалі пра перспектывы піць баварскае піва, калі б адбылася перамога немцаў над ненавісным «саўком».

### Міф № 8

Ёсць версія, што Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза была атрымана Зіновіем Калабанавым яшчэ падчас савецка-фінскай кампаніі 1940 года. Ніводным афіцыйным дакументам гэта не пацверджана. Мяркуючы па выпісцы з асабістай справы танкіста, у 1940 годзе ён стаў заслужаным уладальнікам іншай высокай савецкай узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга.

### Міф № 9

Пасля памятнага бою ў 1941 годзе пад Вайсковіцамі ў ходзе далейшага свайго ўдзелу ў Вялікай Айчыннай вайне за Берлінскую наступальную аперацыю легендарны танкіст быў узнагароджаны яшчэ адным ордэнам Чырвонага Сцяга. На самай справе Зіновій Рыгоравіч з 16 верасня 1941 года па 15 жніўня 1945 года знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі.

### Міф № 10

Асобныя біёграфы Зіновія Калабанава да гэтага часу блытаюцца з датай смерці знакамітага танкіста, называючы то 1994-ы, то 1995 год. У пасведчанні аб смерці №251611 ад 8 жніўня 1994 года зафіксавана: Зіновій Калабанаў памёр 7 жніўня 1994 года ў горадзе Мінску.

**Васіль МОНІЧ,**
**заснавальнік дабрачыннага фонду імя З.Р. Калабанава.**


**26 октября 2016 г.** **№14-А/2016**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 466 по генплану) | 340100000008002318 | 0,0855 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона сетей и сооружений канализации, линий связи и радиофикации | 99 | 4 682 р. 66 коп. (46 826 640 р.) | 234 р. 13 коп. (2 341 332 р.) | 1 605 р. 95 коп. (16 059 500 р.) |
| 2 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 484 по генплану) | 340100000008003145 | 0,0944 | | ограничений в использовании нет | 99 | 5 170 р. 10 коп. (51 700 992 р.) | 258 р. 51 коп. (2 585 050 р.) | 1 512 р. 40 коп. (15 124 000 р.) |
| 3 | микрорайон № 16 | 340100000001006134 | 1,4148 | для строительства и обслуживания комплекса малоэтажной многоквартирной жилой застройки | водоохранная зона рек и водоемов | 99 | 1 901 676 р. 31 коп. (19 016 763 124 р.) | 95 083 р. 82 коп. (950 838 156 р.) | 4 031 р. 42 коп. (40 314 158 р.) |

1. **Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).**

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. №№2-14).

3. **Аукцион состоится 26 октября 2016 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка для участия в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые документы:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 26 сентября по 24 октября 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

**Контактный телефон 41-97-86.**
**Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by**



Падзея месяца

# «ТАХЕЛЕС» У МІНСКУ

## Легенды ў палотнах, палотнаў і арт-тусоўкі сканцэнтраваліся ў сталічнай прасторы

**«Мастакі, літаратары, музыкі апынуліся ў машыне часу — у гэтай талерцы яны ляцяць над беларускімі збудаваннямі і гарадамі. Карціна ахоплівае час ад Вялікага Княства Літоўскага да XIX стагоддзя. Своеасаблівыя замкі, дамы рамеснікаў і сялян — усё гэта адрознівалася ад заходняй і ўсходняй архітэктуры, мела свае дасягненні, якія ў свой час прываблівалі мяне. Тут ёсць менскае замчышча, гарадзенскія і лідскія сядзібы...» У мінскай прасторы «Верх» адкрылася выстава Global Warning/Global Warming найвядомейшага беларускага мастака Алеся Родзіма (Родзіна), палотны якога ў культавым месцы Берліна шмат гадоў узвялічвалі беларускае мастацтва, культуру і саму краіну.**

Берлінскі арт-цэнтр «Тахелес» (назва ў перакладзе з ідыш прыкладна азначае адкрытае выказванне свайго меркавання), што размяшчаўся ў будынку са сваёй асобнай гісторыяй на скрыжаванні Араніенбургерштрасэ і Фрыдрыхштрасэ, — гэта легенда. Яшчэ ў 1990 годзе, калі і без таго напаўразбураную пабудову ўлада ўнесла ў спіс на знішчэнне, яе «акупавала» група мастакоў, з чаго пачаўся, напэўна, найслаўнейшы перыяд будынка, узведзенага ў 1907 годзе. У гэтых сценах і па-за іх межамі тусаваліся мастакі, музыкі, перформеры, тэатралы, літаратары — словам, творчыя людзі авангарднага, маргінальнага, альтэрнатыўнага кшталту. Не пералічыць, колькі тэкстаў напісана пра гэта месца, колькі людзей тут пабывала, колькі цыгарэт выкурана на гэтых плошчах і колькі літраў алкаголю выпіта — яно мае даволі неадназначную рэпутацыю.

У пачатку 2000-х гадоў у «Тахелесе» прайшла выстава беларускіх мастакоў, сярод іх экспанаваўся адрозны ад іншых Алесь Родзім, якому прапанавалі тут застацца. «У мяне была прыкладна такая ж, пад тысячу квадратных метраў (як у прасторы «Верх». — **Аўт.**), плошча, дзе экспанавалася каля сотні маіх твораў, — кажа Алесь Родзім. — Берлін з'яўляецца перакрыжаваннем турыстычных маршрутаў, таму «Тахелес», і ў прыватнасці маю выставу, наведвала каля тысячы турыстаў за дзень, за ўвесь час па самых сціплых падліках беларускае мастацтва, якое я ўвасабляў, убачылі больш за мільён чалавек».

У нейкім сэнсе «Тахелес», што з 2012 года як арт-цэнтр на скрыжаванні Араніенбургерштрасэ і Фрыдрыхштрасэ ўжо не існуе, ці яго важкая частка аказаліся ў прасторы «Верх» у Мінску — маштабная выстава прадстаўляе створаныя за трынаццаць гадоў работы Алеся Родзіма.

**Калі яго палотны носяць універсальны характар, так прыемна ад самога мастака атрымаць пацвярджэнне, што яго муза хаваецца ва ўсім, што тычыцца Беларусі — гісторыі, сучаснасці і будучыні.**

Як гэта было ў самім «Тахелесе», дзе майстэрні мастакоў адначасова былі і галерэямі, дзе Алесь Родзім падчас работы выставы пісаў свае палотны на вачах у цікаўнай публікі, мастак працуе і ў прасторы «Верх». Шукайце вачыма чалавека з пэндзлем і фарбамі, — гэта ён, Родзім. Традыцыя працягваецца.

Для таго каб вызваліцца ад чалавечых кантактаў і крыху памедытаваць, тут ёсць усе ўмовы таксама — неахопнае мастацтва, адпаведны музычны фон, шмат прасторы і паветра. Ва ўсім гэтым можна аказацца ў адзіноце, нават калі недзе гучаць чалавечыя галасы, — варта толькі захацець.

**Не пералічыць, колькі тэкстаў напісана пра гэта месца, колькі людзей тут пабывала, колькі цыгарэт выкурана на гэтых плошчах і колькі літраў алкаголю выпіта.**

Трынаццацігадовы пласт работы не так проста ахапіць — гэтыя постапакаліптычныя сюжэты, у якіх так ці інакш суіснуюць мінулае, сучаснасць і будучыня, са шматлікімі падрабязнасцямі матэрыяльнага свету і нематэрыяльнымі трактоўкамі, базуюцца на беларускіх міфалагічных матывах.

«Беларускі этнас неймаверна багаты; чытанне казак патрабуе моцнага напружання, яны ўражваюць мяне, з гэтага свету не хочацца выходзіць. У свой час я набраўся выдатнейшых вобразаў, на гэтым этнасе і легендах я працую. Напрыклад, у вялікай карціне «Карані» заблытаная гісторыя ўсяго чалавецтва, у «Фатуме» нованароджанаму, што глядзіць на свет шырокімі вачыма, лёс будзе ўказваць куды ісці і як».

Кажуць, проста так у Берліне не атрымаеш і метра, у распараджэнні Алеся Родзіма цягам гадоў былі цэлых семсот. І калі яго палотны носяць універсальны характар, так прыемна ад самога мастака атрымаць пацвярджэнне, што яго муза хаваецца ва ўсім, што тычыцца Беларусі — гісторыі, сучаснасці і будучыні. «Гэта кангламерацыя натхняе і дае асаблівую вобразную стылістыку».

Гэта не адзіная карціна Алеся Родзіма з позіркам у будучы час, які мае аўтарытэтнае права на цікавасць. З той нагоды, што будучыня існуе на палотнах не ў адзіночным ліку, а падмацоўваецца мінулым і днём сённяшнім (і ён так імкліва сыходзіць у прошлы час), мы лішні раз усведамляем, што гісторыя — не толькі падручнік і прадмет для вывучэння — гэта і ёсць мы самі. Бо на тое, якімі сёння мы і навакольны свет з'яўляемся, паўплываў кожны рух.

«Будучыня — гэта цемра. Яе хочацца распазнаць, раскаларызаваць, перадаць вобразы, якія я бачу, і кірункі ў глабальным сэнсе, па якіх чалавецтва, на мой погляд, можа ісці. Зразумела, тут ёсць і станоўчыя, і адмоўныя рысы, але гэта і цікава, за кошт супярэчнасці — прыгожа. Паколькі чалавецтва авалодала найноўшымі тэхналогіямі, яму будзе лягчэй спраўляцца з праблемамі, толькі пры ўмове, што тэхналогіямі будзе валодаць розум, а не падсвядомасць. Тады будучыня стане нечым моцным і фантастычным».

**Як гэта было ў самім «Тахелесе», дзе майстэрні мастакоў адначасова былі і галерэямі, дзе Алесь Родзім падчас работы выставы пісаў свае палотны на вачах у цікаўнай публікі, мастак працуе і ў прасторы «Верх».**

Выстава Global Warning/Global Warming будзе працаваць некалькі месяцаў: 13 верасня яна адкрылася, 13 снежня стане яе апошнім днём. «Пляцоўка павінна ажыць», — кажа Алесь Родзім. Цікава, як частка легендарнага берлінскага «Тахелесу» ажыве ў Мінску.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

**Наш Максім Багдановіч**



# СЭРЦА НАЧАМІ АБ РАДЗІМАЙ СТАРОНЦЫ БАЛІЦЬ...

Мінск — горад для Максіма Багдановіча асабліва значны. Тут паэт нарадзіўся ў настаўніцкай кватэры бацькі на Траецкай гары, правёў першы год жыцця да пераезду ў апошняга.

Восенню 1916 года, пасля заканчэння Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя, Максім выпраўляецца на радзіму, уладкоўваецца ў Губернскую харчовую камісію, прагна ўліваецца ў бягучае культурнае жыццё, займаецца справамі бежанцаў, удзельнічае ў маладзёжных гуртках. І, варта адзначыць, адраджэнца тут добра ведалі і з нецярпеннем чакалі. «У хуткім часе ў Мінск прыедзе Максім Багдановіч», — пачулі мы голас Аркадзя Смоліча, які ўвайшоў у сталоўку «Беларускай хаткі» з лістом у руках... «Максім Багдановіч піша, што хоча пажыць у Мінску, у сваім родным горадзе, дыхнуць паветрам Бацькаўшчыны, пачуць жывую беларускую мову...» Нас ахапіла радасць і трывога. Радасць, што пазнаем нашага дарагога паэта, і трывога за яго здароўе... Было гэта ў палове верасня 1916 года. У «Беларускай хатцы» на Захараўскай вуліцы, № 18, у сталоўцы «Таварыства дапамогі ахвярам вайны», — пісала Зоська Верас.

Ветліва і зычліва сустрэты, паэт пасяліўся на кватэры ў Змітрака Бядулі, які пакінуў пасля пра гэты візіт шмат каштоўных успамінаў. Прынамсі, пра мужнае змаганне Багдановіча з хваробай, яго аскетычны лад жыцця: «...Мае думкі перабіває працяглы кашаль Максіма. Чуваць і на дварэ. Я куру ў запас на ўсю ноч. Калі я ўваходзіў у пакой, Максім ужо не кашляў. Ён выціраў хустачкай кроплі поту на ілбе. Яго пышная цёмна-каштанавая шавялюра зрабілася вільготнай. Рыжаватыя вусы бездапаможна апусціліся ўніз. А карыя вочы сталі цёмныя, бліскучыя і празрыстыя. Перад ім на стале дзве шклянкі чаю. Адну Максім «забракаваў» — з цукрам. Ад самага пачатку вайны ён цукар не ўжывае. «Калі мільёны людзей гінуць на франтах, калі сотні тысяч бежанцаў — жанчын, старых, дзяцей — церпяць голад і холад на дарогах, у чыстым полі, я не магу дазволіць сабе раскошы». Так ён мне аднойчы сказаў. Ён мяшае ложачкай чай без цукру і п'е маленькімі глыткамі...»

Як заўсёды, баючыся чагосьці не паспець, у Мінску Максім Багдановіч намагаецца зрабіць як мага больш для людзей роднага краю. У снежні 1916 года падае ад Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны хадайніцтва перад мінскім губернатарам аб правядзенні лекцыі «Беларускае адраджэнне», якое, на вялікі жаль, адхіляюць. Разам з Аркадзем Смолічам і Зоськай Верас працуе над чытанкай для беларускай школы, якая таксама не пабачыла свет... А вось адны з найбольш значных у творчай спадчыне паэта творы выйшлі з-пад пяра менавіта ў родным Мінску.

Неяк Максім Багдановіч прызнаўся Змітраку Бядулю: «Задумаў твор на тэму біблейскага міфа. Тэму навеяла мне вайна, гібель мільёнаў і мой уласны лёс». Творам гэтым стала апошняя, невялікая па аб'ёме, ды бясконца эмацыянальна насычаная паэма Багдановіча «Страцім-лебедзь», многімі крытыкамі названая запаветам творцы, яго галоўным словам да свету. Чытаецца твор нібы былінны рэчытатыў, гэта аповед пра моцнага духам, гордага птаха, які не жадае пакідаць астатніх птушак, ратаваць адзін:

*І паселі тут на лебедзя*
*Птахі дробныя усёй стаяю.*
*Лебедзь з сілы выбіваецца,*
*Птушкі ажно ўсцяшаюцца.*
*Дзень ён плавае, другі-трэці дзень,*
*На чацвёрты стаў прасіць-маліць:*
*«Вы ўзляціце хоць на час які,*
*Выбіваюся з астатніх сіл.*
*Дайце вы грудзям, гэй, вальней уздыхнуць!*
*Дайце вы крылам, гэй, шырэй узмахнуць!»*
*Не паслухалі птахі лебедзя.*

Так і загінуў мужны Страцім, таму «ад усіх цяпер патомкі ёсць, ды няма адных — Страцімавых». Важна, што чытаючы твор Змітраку Бядулю, Багдановіч выразна вымавіў «Максімавых», што яшчэ раз падкрэслівае паралель сюжэта твора з уласным горам паэта... Цікава і тое, што Багдановіч за аснову паэмы бярэ не класічны, а беларускі фальклорны варыянт біблейскага міфа, наўмысна набліжаючы твор да нашай ментальнасці, але і пераасэнсоўваючы яго. Падкрэсліваючы згаданы момант, Рыгор Бярозкін пра галоўнага героя паэмы пісаў наступнае: «Гэта — дабрыня моцнага, і калі Страцім загінуў, дык не таму, што быў «залішне» добры, а таму, што яго мужнасць і імкненне да свабоды не абудзілі такіх самых пачуццяў у «птахаў дробных».

Напісаны ў Мінску і хрэстаматыйны сёння верш Багдановіча «Пагоня». У канцы 1916 года ён прагучаў у сценах «Беларускай хаткі» і атрымаў першыя ўражаны водгукі. Сімвал дзяржаўнасці і аб'яднання народа, герб Вялікага Княства Літоўскага, выступае ў творы як прадмет гераічнага ўвасаблення велічы беларусаў, іх духоўнай сілы і надзеі на незалежную будучыню. Адно з галоўных месцаў у вершы, разам з вобразам Старадаўняй Літоўскай Пагоні, займае вобраз Маці-краіны. А асабліва горкім момантам паказваецца матыў дзяцей-здраднікаў, што пакінулі Бацькаўшчыну ў неймаверна значную для яе пару.

У час перамен, чаканняў, рашучых крокаў жыў і Максім Багдановіч. І яго жаданне волі і шчасця для роднай краіны было не стрымаць, як тую славутую пагоню... Хай апошні спачын ён знайшоў не ў Беларусі, аднак перад смерцю паспеў наталіцца яе красой ды гасціннасцю, налюбавацца родным горадам і блізкімі па духу людзьмі.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

**МАКСІМ БАГДАНОВІЧ**

## ПАГОНЯ

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі ўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Бійце ў сэрцы іх — бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

■ Актуальна

# КНІГІ — ГЭТА ЦЭЛЫ СВЕТ



**У сталіцы пройдзе Рэспубліканскі форум, прысвечаны культуры чытання**

**Кнігі і чытанне — адзін са шляхоў духоўнага ўзбагачэння чалавека. Творы мастацкай літаратуры дазваляюць больш даведацца пра свет і месца чалавека ў ім, даюць магчымасць зазірнуць у глыбіню ўласнай душы чытача, паназіраць за ўнутранымі перажываннямі аўтара і персанажаў. Думаецца, з гэтымі сцвярджэннямі няма сэнсу спрачацца. Але фарміраванне і развіццё культуры чытання — справа не з простых. Гэты працэс уключае цэлую сістэму ўзаемазвязаных звёнаў, а яго ўдзельнікамі ў сучасным свеце становяцца не толькі аўтар, кніга і чытач, а цэлы комплекс установ, цэлыя групы прафесіяналаў розных сфер.**

Аўтары і выдаўцы, бібліятэкары і журналісты, педагогі і метадысты, студэнты і вучні збяруцца 13 кастрычніка ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, каб абмеркаваць актуальныя пытанні фарміравання культуры зносін з кнігай на Рэспубліканскім форуме «Кніга=Свет: сучасны стан і стратэгіі развіцця нацыянальнай прасторы чытання». Яго арганізатарамі выступаюць Нацыянальны інстытут адукацыі, Выдавецкі дом «Звязда», Нацыянальная бібліятэка Беларусі, рэдакцыя «Настаўніцкай газеты». Мерапрыемства адбудзецца ў межах рэспубліканскага інфармацыйна-асветніцкага праекта «КнігаСвет».

Інавацыйны праект «КнігаСвет» рэалізуецца, каб ствараць умовы для развіцця культуры чытання беларусаў, дзеля выхавання кваліфікаванага чытача (і каб ён заставаўся такім) на працягу ўсяго жыцця. Праект мае на мэце наладзіць узаемадзеянне ўсіх, хто зацікаўлены ў росце прэстыжу літаратуры і чытання як нацыянальнай культурнай каштоўнасці. Адным з крокаў рэалізацыі праекта і стане Рэспубліканскі форум «Кніга=Свет: сучасны стан і стратэгіі развіцця нацыянальнай прасторы чытання».

Адметна, што ў сучасным свеце чытанне разглядаецца як адзін з рэсурсаў інавацыйнага развіцця грамадства. Таму яго падтрымка, выхаванне культуры чытання — задача комплексная, якая ўключае цэлы шэраг актуальных момантаў, што плануюцца да абмеркавання падчас форуму «Кніга=Свет». У іх ліку — развіццё сацыякультурнай прасторы (роля і магчымасці бібліятэк у папулярызацыі чытання і развіцці чытацкай культуры, адметнасці ўплыву СМІ на фарміраванне ў грамадстве стаўлення да чытання); педагагічны аспект выхавання культуры чытання, адметнасці ўспрымання чытачом сучаснай мастацкай літаратуры Беларусі, медыявобразаў літаратара; праблемы і перспектывы развіцця беларускага кнігавыдання, выдавецкія ініцыятывы па падтрымцы чытання; разгляд новых інтэрнэт-рэсурсаў як эфектыўных інструментаў фарміравання і развіцця кніжнай прасторы чытання.

Падчас форуму будзе прэзентаваны інтэрнэт-рэсурс «КнігаСвет» http://knigasvet.adu.by. Таксама ў межах імпрэзы пройдзе цырымонія ўзнагароджання пераможцаў II этапу культурна-інфармацыйнага марафону «Культ-пра-Свет» і дыстанцыйнага праекта «Стартап-фэст «Спадчына.tut»», арганізаваных Нацыянальным інстытутам адукацыі. А Выдавецкі дом «Звязда» ўзнагародзіць лепшых бібліятэкараў сістэмы культуры і адукацыі дыпломамі «За пашырэнне чытацкай аўдыторыі прасторы беларускай літаратуры».

Форум пройдзе пры падтрымцы адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска. Спонсарамі выступілі выдавецтва «Аверсэв», прадстаўніцтва «Schneider Electric Industries SAS» (Францыя) у Рэспубліцы Беларусь, кампанія «Смартон».

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■

■ Не абмініце

# ТЭАТР ЯК БРЭНД

**У віцебскім Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа рыхтуюцца адсвяткаваць 90-годдзе. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў Аляксандр СТАРЫХ, дырэктар Коласаўскага тэатра.**

На 18 лістапада запланавалі правесці міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Беларускі нацыянальны тэатр: традыцыі, пошук, эксперымент». Запрашэнні паўдзельнічаць атрымаюць тэарэтыкі і практыкі сцэнічнага мастацтва, магістранты і аспіранты вышэйшых навучальных устаноў, журналісты, краязнаўцы.

Да юбілею задумалі і адкрыць тэматычную выставку ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. А экспазіцыя ў самім тэатры раскажа пра мастакоў-сцэнографаў, якія працуюць або працавалі тут.

21 лістапада адбудзецца святочны вечар, прысвечаны 90-й гадавіне тэатра.

Каб па-добраму змагацца за маладога гледача, ва ўстанове актыўна выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі. Там размяшчаюць анонсы, раяць наведаць тэатр. У планах — запрашэнне публікі на мастацкія чыткі. Публіка зможа назіраць, як акцёры чытаюць тэкст, каб засвоіць драматургічны матэрыял. У Віцебску «класічных чытак» яшчэ не было. У адрозненне ад Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, дзе гэтая форма работы з гледачом вельмі папулярная.

— Наконт прэм'ер. У лістападзе запланаваны паказ спектакля «Матылёк... Матылёк...» — да юбілею Тамары Скварцовай (рэжысёр В. Анісенка). Над казкай для дзяцей працуе рэжысёр Міхась Краснабаеў. Галоўны рэжысёр мінскага Новага драматычнага тэатра Сяргей Куліковскі паставіць спектакль паводле аповесці Ф. Дастаеўскага «Дзядзечкаў сон»... Будуць і іншыя сюрпрызы, — працягвае дырэктар.

Па традыцыі новы тэатральны сезон распачаўся з пастаноўкі «Несцерка». Гэта — «брэнд» тэатра. Сёлета спектаклю споўнілася 75 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромтехника» 6 октября 2016 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Автозаправочная станция с инвентарным номером 400/С-5796 с принадлежностями (навес, резервуары стальные – 16 шт., асфальтобетонное, плиточное покрытие, ограждение, канализационная сеть, ливневая канализация, сеть наружного освещения, водопроводная сеть, линия электропередачи, технологический трубопровод, тепловая сеть) общей площадью 47,0 м², год ввода в эксплуатацию – 1989 |
| Начальная цена продажи | **137 622,70 рубля (с учетом НДС 20%)** |
| Кадастровый номер земельного участка | **422000000009003026** |
| Месторасположение земельного участка | **г. Гродно, ул. Понемуньская, д. 2Д** |
| Размер земельного участка | **0,4581 га** |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Гроднопромтехника», 230003, г. Гродно, ул. Понемуньская, д. 20, тел.: (0152) 757368, 757367 |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | 6 октября 2016 года |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 26 сентября 2016 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 4 октября 2016 года 17.00 |
| Сумма задатка | 10 000 рублей |
| Шаг аукциона | 5% |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости»; **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

■ Фестываль

## Анжаліка КРАШЭЎСКАЯ:

# «МНЕ ШКАДА, ШТО ПЭЎНЫЯ ПАСТАНОЎКІ ЎБАЧАЦЬ ТОЛЬКІ 200 ЧАЛАВЕК»

**Адна з найважнейшых культурных падзей года, буйны тэатральны фэст, багатая міжнародная праграма, нечаканыя беларускія пастаноўкі, традыцыйныя аўтары, супярэчлівыя пачуцці, гул абмеркаванняў. Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» ужо пачаўся і стартаваў ён з праграмы лекцый, якія можа наведаць не толькі датычны сферы дзеяч, але і кожны зацікаўлены. А ўласна тэатр адкрыецца 28 верасня: на фестывалі будуць паказаны 23 пастаноўкі з 9 краін, асобна ў тым ліку з Беларусі. Напярэдадні адкрыцця мы пагутарылі з дырэктарам і адборшчыкам «ТЭАРТу» Анжалікай КРАШЭЎСКАЙ.**

***— Ці заўважылі вы, што, дзякуючы фестывалю, які дапамагае ўпісаць нашу тэатральную прастору ў кантэкст еўрапейскай, у беларускім тэатры нешта змянілася?***

— У мяне ёсць адчуванне, што нешта мяняецца. Хочацца верыць, дзякуючы «ТЭАРТу» таксама, але ў краіне адбываецца шмат культурных падзей, якія прыносяць ажыўленне і накладваюць адбітак на асяроддзе. Дзякуючы гэтаму мы бачым, як на навакольны свет рэагуюць замежныя аўтары, і разумеем, што яны не ў варожым лагеры, а, наадварот, могуць служыць крыніцай новых формаў.

***— А публіка змянілася? Некалькі гадоў таму вы казалі, што не можаце прывезці пэўныя пастаноўкі, бо нашы гледачы да іх не гатовы.***

— Я і цяпер не ўсё магу прывезці. Працэс перавыхавання публікі не хуткі, як хвароба, што перайшла ў хранічную форму, патрабуе больш часу і высілкаў. Сказваецца ўздзеянне масавай культуры і тэлебачання, таму што іх больш у нашым жыцці, да іх людзі прызвычаіліся. Навацыі цяжэйшыя для ўспрымання, глядач ставіцца да іх насцярожана і не заўсёды гатовы зрабіць першы крок насустрач. Але, паколькі гэта шосты фестывальны год, я спадзяюся, нас выбіраюць тыя, хто зразумеў фармат «ТЭАРТу». Глядач можа згаджацца з намі ці не, любіць нас ці не любіць, але мы прадстаўляем, на мой погляд, найлепшыя дасягненні еўрапейскага тэатра.

***— Вы ўяўляеце сабе гледача, для якога фарміруеце праграму?***

— Мне складана ўявіць, хто прыйдзе на гэтыя пастаноўкі. Спадзяюся на тое, што Беларусь — цэнтр Еўропы, а Мінск — прагрэсіўны горад, было б дзіўна, калі б мы не знайшлі свайго гледача. З іншага боку сёлета ўсе спектаклі будуць паказвацца толькі аднойчы, і мне шкада, што пэўныя пастаноўкі ўбачаць толькі 200 чалавек.

> **«У нас глядач можа разважаць на сцэне ці ў заводскіх памяшканнях, што часам дзіўна для дарослых гледачоў, бо ў іх разуменні тэатр — гэта спецыяльны будынак, рытуал».**

***— Пры адборы вы не кіруецеся камерцыйнымі меркаваннямі? Летась у праграме быў «Яўген Анегін» у той час, як імя рэжысёра Цімафея Кулябіна было звязана са скандалам у сувязі з забаронай яго варыянта «Тангейзера». У спектаклі «Горад. Жаніцьба. Гогаль» з сёлетняй праграмы іграе вядомая па серыялах, якраз па згаданай вамі масавай культуры, Ганна Кавальчук. Што першаснае?***

— Скандалы мяне насцярожваюць, асабліва калі яны раздутыя з нічога. Напэўна, у іх ублытаны ўсе расійскія «зоркі», і карыстацца гэтым не вельмі добра. Я ўжо адбіраю спектаклі на 2017—2018 гады, дзе які скандал — не мая гісторыя. Кулябін — таленавіты чалавек, нехта яго варыянт «Анегіна» не прыняў, але гэтым пастаноўка і цікавая — яна здзіўляе. У нас з'явіўся яшчэ адзін чаканы рэжысёр, у мяне пра яго пытаюцца, таксама як пра Оскараса Каршуноваса і Алвіса Херманіса. Што тычыцца Ганны Кавальчук — жыццё такое, акцёры становяцца папулярнымі дзякуючы серыялам. Але менавіта яе ўдзел стаў адным з фактараў, чаму на спектакль «Горад. Жаніцьба. Гогаль» ужо аншлаг. Думаю, гэта будзе раўназначна «Шэрбурскім парасонам» Васіля Бархатава, калі ў вялізнай чарзе каля Дома афіцэраў пыталіся пра лішні білецік. Але ў гэтым выпадку я арыентавалася на рэжысёра Юрыя Бутусава. Дарэчы, з гэтым звязаны цікавы эпізод. Я была ў касе Купалаўскага тэатра, як толькі адкрыўся продаж білетаў. Туды прыбеглі дзве жанчыны і папрасілі месцы на Бутусава, а набываючы, запыталіся: «А што ён там будзе спяваць?» Гісторыя з серыі «Пачуў звон — не ведаю, дзе ён».

***— На што білеты раскупляюцца актыўней?***

— Карыстаецца попытам «Апошняя лента Крэпа» Каршуноваса з Юозасам Будрайцісам у галоўнай ролі. Нашы цэны знаходзяцца ва ўзроўні рэпертуарнага тэатра, каб глядач мог паглядзець, калі не ўсё, то хаця б некалькі пастановак. Добра раскупляецца «Мера за меру» Дэклана Донэлана. Гэта брытанскі рэжысёр, які паставіў у Расіі шмат спектакляў па Шэкспіру. Як заўсёды, добра ідзе харэаграфія, у гэтым выпадку французская пастаноўка «Карані». Ёсць у мяне сум у сувязі са спектаклем «Місія. Успамін аб адной рэвалюцыі», які папулярнасцю пакуль не карыстаецца. Гледачы прызвычаіліся да зразумелых рускамоўных пастановак, а да замежных, у тым ліку нямецкіх, ставяцца насцярожана. У той жа час спектакль — вельмі прыгожы, адвошчаны, захапляльны, ён увабраў у сябе шмат жанраў. Драматург Ёханас Кірстэн — паслядоўнік Бертальда Брэхта, ён паўдзельнічаў у развіцці сучаснага нямецкага тэатра. У пастаноўцы прагучыць яго голас: ён будзе чытаць п'есу, а акцёры на тэкст будуць накладваць ролі. Рэжысёрскае прачытанне тут яшчэ цікавейшае, у фінале аўтар збярэ ўсіх рэвалюцыянераў — на адной сцэне сустрэнуцца, напрыклад, Роза Люксембург, Чэ Гевара і іншыя. Ёсць у нашай праграме «Кінг сайз» Крыстафера Марталера. Мне тэлефануюць і пытаюцца, як білет на Марталера можа быць таннейшым за расійскі спектакль? Я адказваю, што ў нас яго, на жаль, не ведаюць, хоць велічыня гэта проста недасягальная.

***— Два гады таму з'явілася праграма Belarus Open. Можна заўважыць, што рэпертуарны тэатр у ёй прадстаўлены ў асноўным рэгіёнамі, хоць, здавалася б, культура канцэнтруецца ў сталіцах.***

> **«Мне тэлефануюць і пытаюцца, як білет на Марталера можа быць таннейшым за расійскі спектакль? Я адказваю, што ў нас яго, на жаль, не ведаюць, хоць велічыня гэта проста недасягальная».**

— Для мяне гэта таксама парадокс. Магчыма, так уздзейнічаюць фестывалі, бо ў Магілёве праходзіць «Март-кантакт», у Брэсце — «Белая вежа». У праграме шмат лялечнага тэатра, які ўжо даўно ўпісаны ў міжнародны кантэкст і ўпэўнена трымае планку. Лялечнікі дэкларуюць, што яны ў трэндзе, сёння ў беларускім тэатры гэта сапраўды найлепшае і вартае гонару. У беларускай праграме шмат незалежных пастановак. Пры адборы мы вырашылі, што ў нас не павінна быць любімчыкаў, але аднагалосна вызначылі цікавымі перформераў. Мы запрашаем замежных гасцей і хочам паказаць ім беларускае мастацтва. Мы кажам, што «ТЭАРТ» — міждысцыплінарны фестываль, таму паказваем і звязаныя з тэатрам формы. У нас глядач можа разважаць на сцэне ці ў заводскіх памяшканнях, што часам дзіўна для дарослых гледачоў, бо ў іх разуменні тэатр — гэта спецыяльны будынак, рытуал.

***— Ці ставіце вы задачу праграмай Belarus Open паказаць вобраз сучаснага беларускага тэатра?***

— Хутчэй, тэндэнцыі, чым вобраз. Мы хочам паказаць найцікавейшыя пастаноўкі. Спачатку адсочвалі, ці ёсць з чаго выбіраць, бо мне здавалася, што беларускі тэатр знаходзіцца ў стагнацыі, што ён занадта прадказальны. Але мы выявілі шмат цікавых рэчаў, тую ж пастаноўку «З жыцця насякомых» Святланы Бень і Дзмітрыя Багаслаўскага. Беларуская праграма здольна паказаць, што тэатр абсалютна розны.

***— І каб пазбавіцца ад вобраза архаічнага тэатра, вы аддаяце перавагу неакадэмічным пастаноўкам.***

— Не, чаму? У нас ёсць рэпертуарны тэатр, напрыклад, Магілёўскі драматычны. Праграма — не проста агляд тэатраў, а тое, што можа быць цікавым гасцям, яны не павінны прыходзіць сюды як у музей. Мы не хочам рабіць супрацьпастаўленне, Belarus Open складаецца з найбольш яркіх і цікавых работ, незалежна ад таго, рэпертуарны гэта тэатр альбо не. Мы запрашаем адборшчыкаў, хочацца верыць, нехта атрымае пуцёўку на гастролі альбо фестываль. Ды і беларуская публіка часам не ведае свой тэатр. У Расіі з'явілася гастрольнае агенцтва, якое паказвае ў рэгіёнах Расіі найлепшыя спектаклі — іх можна ўбачыць у Бураціі, на Далёкім Усходзе, у Забайкаллі. Я зайздрошчу гэтай схеме, у нас яе ажыццявіць было б прасцей, краіна ж невялікая.

> **«Я была ў касе Купалаўскага тэатра, як толькі адкрыўся продаж білетаў. Туды прыбеглі дзве жанчыны і папрасілі месцы на Бутусава, а набываючы, запыталіся: «А што ён там будзе спяваць?»**

***— У беларускай праграме няма любімчыкаў, а ў замежнай ёсць.***

— Канешне, таму што гэта адзінкавыя спектаклі. Беларускую праграму прасцей прывезці, на «Тэарце» яна паказваецца ў першую чаргу для прафесіянальных гасцей. Міжнародная праграма — спектаклі, што на думку крытыкаў ужо пра сябе заявілі — прызначаецца для гледачоў, тут усе любімчыкі. Толькі ёсць моманты,





калі разумееш, што гэта важна, але па продажы квіткоў бачыш: важна гэта толькі табе.

***— У асобную частку фестывалю ўвайшла праграма лекцый «Школа ТЭАРТ».***

— У гэтым годзе лектары ўпершыню будуць размаўляць са звычайнай публікай, запісацца мы далі магчымасць усім, не толькі прафесіяналам. Мы хочам, каб адукацыйная праграма праходзіла круглы год. Звычайна гэта бясплатна, але, на жаль, заўсёды так рабіць немагчыма, нам патрэбны партнёр.

***— Цягам года ў кінатэатры «Цэнтральны» паказваюцца найвядомейшыя пастаноўкі з усяго свету — праект «Theatre HD». Гэта выступае працягам «ТЭАРТу»?***

— Мы не праводзім паралеляў. Тэатр — вельмі дарагі від мастацтва і адзін з самых складаных, бо прывезці пяцьдзясят чалавек патрабуе шмат высілкаў і сродкаў. Таму праект «Theatre HD» стаў адной з формаў знаёмства з тэатрам і набыў папулярнасць. Летам мы паказвалі балет Мэцью Борна, у зале прысутнічала дарослая публіка, якая відавочна ходзіць у Вялікі тэатр оперы і балета — нехта прыняў, нехта не. Але мы далі магчымасць убачыць пастаноўку выдатнага балетмайстра і харэографа і апроч гэтага пастаянна знаёмім гледача з дасягненнямі сапраўднага мастацтва.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Кінакрокі

# З шырока заплюшчанымі вачамі

## У ЧЫМ ПРАБЛЕМА РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ КІНАПРАЕКТАЎ

**Існуе феномен, у адпаведнасці з якім падчас крызісных сітуацый сфера мастацтва квітнее. Як бы жудасна гэта ні гучала, чалавечы боль, пакуты, ваенныя канфлікты ў нейкім сэнсе актывізуюць творцаў, становяцца крыніцай натхнення і музай на Геліконе. У гэтым кантэксце зразумела, чаму беларускі кінематограф да гэтых часоў рэфлексуе на тэму Вялікай Айчыннай вайны, а нацыянальная кінастудыя не можа пазбавіцца мянушкі «Партызанфільм». З гэтай прычыны Другая сусветная з зайздроснай рэгулярнасцю адгукаецца ў нашым кінамастацтве. Чарговы рэспубліканскі конкурс кінапраектаў, прыём заявак на які завяршыўся 12 верасня, абвясціў адразу два так званыя «лоты» на адпаведную тэму — 39-хвілінная дакументалка пра Вялікую Айчынную вайну і 4-серыйны тэлевізійны фільм пра гераічную барацьбу савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.**

У стаўленні да падзей першай паловы 1940-х гадоў наша грамадства збольшага падзялілася на дзве часткі. Першая стамілася ад масіўнай спекуляцыі на набалелай тэме і падсвядома адсоўвае ад сябе звязаныя з ёй ініцыятывы. Другая ўпэўненая ў тым, што памяць пра жахі вайны дапаможа нам пазбегнуць іх у будучыні. З гэтым жа матывам, напэўна, Міністэрства культуры клапоціцца пра стварэнне адпаведных кінакарцін. Але давайце паспрабуем успомніць створаныя за апошнія гады фільмы пра Вялікую Айчынную вайну, што сапраўды вартыя ўвагі (амаль у адзіночным ліку ўспамінаецца «У тумане» Сяргея Лазніцы паводле Быкава). І давайце ўспомнім тэлесерыялы, для якіх сакраментальная тэма становіцца толькі сюжэтным апраўданнем для з'яўлення на экране пагонь, боек і перастрэлак. Памяць пра гэтыя няўдалыя ўзоры не дапамагае нам пазбягаць іх бессэнсоўнага стварэння ў будучыні.

Відавочна, конкурсныя дакументы не арыентуюцца на мастацтва кіно: у катэгорыі ігравых фільмаў «заказана» толькі пяць серыялаў і ніводнай поўнаметражнай карціны (кінаверсіі серыялаў не лічацца). Тэмы гучаць патэтычна: «дзейнасць сучасных абаронцаў Айчыны па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі» (мінулы раз у гэтай катэгорыі былі створаны шаблонны і непераканаўчы фільм цыкла «Дзяржаўная граніца»), «праблемы развіцця і ўмацавання інстытута сям'і і шлюбу ў сучасным беларускім грамадстве», «сацыяльная праблематыка асобасных узаемаадносін у сучасным беларускім грамадстве», «фарміраванне пазітыўнага вобраза сучаснай Беларусі ў грамадска-сацыяльным кантэксце» (незразумела, тэма гэта альбо задача). Напісана, тэма.

Затое сярод дзесяці замоўленых анімацыйных фільмаў ёсць сімпатычныя ініцыятывы — «пазнавальныя гісторыі з адказамі на дзіцячыя «чамучкі» з нацыянальным каларытам» ці «навучанне дзяцей беларускай мове». І ў той жа час быццам кулаком па стале стукаюць ментарскія, настаўніцкія лоты пра выхаванне ў дзецях неабходнасці ведаў і ўседлівасці, правілаў этыкету і паводзінаў, спачування і дабрыні. Толькі павучальныя матывы павінны быць не тэмай, а падтэмай, бо попытам сярод дзяцей карыстаецца выключна забаўляльны кантэнт, і толькі ён — цікавы — здольны прасунуць высокія памкненні дарослых.

На шчасце, значную ўвагу конкурс кінапраектаў аддаў дакументальным фільмам: у спісе ўтрымліваюцца цэлыя дванаццаць заявак на неігравыя кінакарціны, таму заказчык здолеў умясціць сюды звароты да розных часоў. У дачыненні да мінулага гаворка ідзе пра гісторыю беларускага кнігадрукавання, класікаў беларускага кіно, юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа, жыццё і творчасць Уладзіміра Мулявіна, выдатных дзеячаў музычнага мастацтва. У меншай ступені арганізатараў цікавіць, але ўсё ж цікавіць, даследаванне дакументалістамі сённяшняга дня на тэмы «актуальныя праблемы сучаснага жыцця Беларусі» і «актуальныя праблемы культуры Беларусі», «міласэрнасць у сучасным беларускім грамадстве» ці «жыццё беларускай глыбінкі» (адна з топавых тэм беларускага, у тым ліку незалежнага, кіно). Дарэчы, у катэгорыі дакументальных фільмаў таксама ідзе гаворка пра дзейнасць абаронцаў Айчыны па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі — гэта другая агульная з ігравым кантэнтам тэма.

Цалкам справядлівы механізм фінансавання кіно праз конкурс у нашых умовах набыў скажоную форму. У той час, як заказчыкам выступае Міністэрства культуры, якое выдзяляе не прыватныя грошы, а дзяржаўныя, што належаць кожнаму грамадзяніну краіны, конкурс стаў закрытай працэдурай, што ніяк не цягне на сапраўдны пітчынг. Прэзентацыя кінапраектаў і тым больш вызначэнне пераможцаў адбываюцца ў кулуарах, весткі з якіх да шырокай грамадскасці не далятаюць. Атрымліваецца, што беларуская форма конкурсу кінапраектаў ставіць у няёмкае становішча, па-першае, беларусаў, грошы якіх размяркоўваюць на часта нецікавае для іх кіно, па-другое, незалежных экспертаў з камісіі, бо іх прапановы носяць толькі рэкамендацыйны характар, па-трэцяе, незалежных кінавытворцаў, якія разумеюць, што іх шанцы атрымаць фінансаванне ў параўнанні з «Беларусьфільмам» даволі сціплыя.

Чарговы конкурс не прапанаваў стварыць ніводнага дэбютнага, фестывальнага і ўвогуле поўнаметражнага ігравога фільма, праўда, ёсць чаго чакаць ад анімацыі і дакументалістыкі. Пабачым, ці ўзбагацяць гэты конкурс культуру.

Ірэна **КАЦЯЛОВІЧ**. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Фотафакт

# АКНО Ў БІБЛІЯТЭКУ

### Жыццё Рыжскай цэнтральнай бібліятэкі можна пабачыць на ўласныя вочы ў Мінску

Выстаўкі латвійскіх фотамастакоў «Адзін дзень у жыцці бібліятэкі» (Валтэр Палякоў) і «Дзень разам з бібліятэкарам» (Імантс Уртанс), якія раней праходзілі ў Літве, Эстоніі, Швецыі, Фінляндыі, Германіі, Польшчы і Расіі, працуюць у Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы. На фотаздымках — побыт чытачоў і бібліятэкараў Рыгі, знаёмы і блізкі для ўсіх, хто мае дачыненне да кнігі.


Фота Кастуся ДРОБАВА.

Падчас адкрыцця выставак выступае дырэктар Рыжскай цэнтральнай бібліятэкі Дзідра ШМІТА.

— Мы вырашылі задакументаваць працэс працы бібліятэкара, — расказвае гісторыю стварэння выставак **дырэктар Рыжскай цэнтральнай бібліятэкі Дзідра ШМІТА**. — На працягу года за побытам нашых супрацоўнікаў і наведвальнікаў назіраў фотамастак. Дзякуючы гэтаму, кожны, хто прыйдзе паглядзець на фотаздымкі, здолее «зазірнуць» у наша жыццё.

Алена Кубышкіна, дырэктар Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы, расказала, што ідэі для супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі з'явіліся падчас святкавання Дзён Рыгі ў Мінску. Сувязі наладжваюцца хутка: за некалькі месяцаў была арганізавана выстаўка, знайшліся далейшыя кірункі для падтрымкі стасункаў.

Так, ужо на гэтым тыдні прадстаўнікі мінскай бібліятэкі прынялі ўдзел у міжнароднай канферэнцыі ў Рызе, прысвечанай 110-годдзю з дня заснавання Рыжскай цэнтральнай бібліятэкі.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**



■ Фестывалі

# ПРЫСВЯЧЭННЕ ІМЁНАМ

### Фестываль Башмета робіць стаўку на славутых музыкантаў... і спартсменаў

Са славутымі музыкантамі — зразумела, так было тут заўсёды. І будзе цяпер частка канцэртаў, якія наша публіка ўпадабала (напрыклад, можна пачуць гучанне скрыпак славутых майстроў Страдзівары і Гварнеры). А вось эксперымент у выглядзе акадэмічнай музыкі і выступлення пад яе гімнасткі Меліціны Станюты адбудзецца ўпершыню.

На адкрыцці фестывалю 30 верасня ёсць магчымасць пачуць скрыпача Сяргея Крылова, які выступіць у дуэце з піяністам Расціславам Крымерам (мастацкім кіраўніком фестывалю). Сам Крылоў мае расійскае паходжанне, працягвае сваю адукацыю ў Італіі і цяпер жыве ў горадзе Крэмоне, музычнае мінулае якога звязана з прозвішчам Страдзівары. Але іграе скрыпач на інструменце, вырабленым яго ж бацькам. Сяргея Крылова ў Беларусі ўжо чулі ў рамках фестывалю Башмета. Сёлета нам прадставяць праграму «Масква — Вена»: прагучыць музыка Шастаковіча і Крэйслера.

Але асаблівы канцэрт запланаваны на 1 кастрычніка: гэта Міжнародны дзень музыкі. І саліраваць на сцэне будзе музыкант міжнароднага ўзроўню, народны артыст Расіі Мікалай Луганскі. Разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь ён выканае трэці фартэпіянны канцэрт С. Пракоф'ева і «Рапсодыю на тэму Паганіні» С. Рахманінава. Вечар абяцае быць надзвычай напоўненым: і гэтыя творы маштабныя, але да іх дадаюцца яшчэ «Прэлюды» Ф. Ліста і сімфанічная карціна «Ноч на Лысай гары» М. Мусаргскага.

А дзе ж беларуская музыка? Ці можна яе пачуць у рамках гэтага фестывалю? Сёлета нам абяцаюць не проста выканаць твор, але зрабіць сусветную (!) прэм'еру. Айчынны кампазітар Сяргей Бадалаў адмыслова для фестывалю Юрыя Башмета напісаў твор... да 125-годдзя Сяргея Пракоф'ева. Такая своеасаблівая ўверцюра да ўсяго канцэрта пад назвай «Сучасная класіка. Вечар прэм'ер», што пройдзе 5 кастрычніка ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі. Ад прызнанага класіка Пракоф'ева — «Скіфская сюіта». Але больш інтрыгуе другое аддзяленне, дзе прагучаць творы ўкраінскага кампазітара Валянціна Сільвестрава. Ён будзе ў Мінску ўпершыню. Каб больш тонка перадаць яго музыку, за дырыжорскім пультам будзе Віктар Пласкіна, які цяпер працуе ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі, але прыехаў да нас з Украіны. Саліраваць на фартэпіяна запрасілі народнага артыста Расіі Аляксандра Любімава.

Музыку, якая ўжо больш вядомая і папулярная, трэба чакаць у Вялікай зале Палаца Рэспублікі 6 кастрычніка. «Эти глаза напротив...» — не толькі песня, а назва цэлай праграмы, прысвечанай спеваку Валерыю Абадзінскаму. Магчымасць успомніць, што спяваў чалавек, які стаў легендай савецкай эстрады і пачуць, як гэта зробяць, напрыклад, Анатоль Ярмоленка ці Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева ці іншыя.

Легенды, якія жывуць, — гэта інструменты знакамітых італьянскіх майстроў. Скрыпка Страдзівары будзе гучаць 7 кастрычніка. Віўен Хагнер з Германіі стала знакамітай яшчэ ў юнацкім узросце. І выступаць будзе з маладым інтэрнацыянальным камерным аркестрам East-West Chamber Orchestra. Магчымасць пачуць твор Моцарта, які ніколі не гучаў у Беларусі. Ды стаць сведкамі дзіўнага эксперыменту: спалучэння музыкі і эстэтычнага наталення ад выступлення зоркі беларускай мастацкай гімнастыкі Меліціны Станюты.

А далей (9 кастрычніка) класіка джаза ў канцэртнай зале «Верхні горад» разам з эстонскімі музыкантамі. І гала-канцэрт камернай музыкі (10 кастрычніка).

Чаго не хапала ўсе папярэднія дні? Таго, хто даў назву фестывалю. Сустрэча на развітанне: камерны аркестр «Салісты Масквы» і маэстра Юрый Башмет. Аншлаг. Заслона...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 420/С-49059 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание мастерской), площадью 318,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 6.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49060 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – столярный цех), площадью 722,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 7.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49061 (назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, наименование – склад), площадью 199,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 4.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49062 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пилорама), площадью 272,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 3.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49063 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 86,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49064 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех), площадью 78,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 5.<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-49065 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 336,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126, корп. 2.<br>- установка по сжиганию отходов УС ДО-95 (год ввода в эксплуатацию – 2009 г., смонтирована в капитальном строении с инв. № 420/С-49060).<br>- рама лесопильная вертикальная одноэтажная модель Р63-4Б (год ввода в эксплуатацию – 2007 г., смонтирована в капитальном строении с инв. № 420/С-49062). |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 441300000012000231 (назначение – обслуживание производственной базы), площадью 2,0019, расположенном по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 126 |
| **Начальная цена продажи** | 507 263,00 р. (пятьсот семь тысяч двести шестьдесят три рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 50 726 р. (пятьдесят тысяч семьсот двадцать шесть рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Обременения со стороны 3-х лиц** | В виде аренды (капитальное строение с инв. № 420/С-49059):<br>- 143,2 кв.м – по 30.09.2016 г.<br>- 128,3 кв.м – по 30.09.2016 г.<br>- 47 кв.м – по 30.09.2016 г. |
| **Продавец** | ОАО «Лидский комбинат бытовых услуг» 231300, г. Лида, ул. Советская, 23а. Тел. 8-0154-60-84-01 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | - обязанность по государственной регистрации сделки и перехода прав возлагается на Покупателя, в том числе оформление всей необходимой документации, а также Покупатель несет все связанные с этим расходы;<br>- возмещение Победителем аукциона затрат Продавца на проведение независимой оценки объектов, проданных через аукцион в размере 2615,40 рублей с учетом НДС;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1% от конечной цены продажи объекта. |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 11 октября 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.06.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 05 октября 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

---

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Оценка всех видов собственности

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Изолированное помещение (магазин) с инв. №350/D-299952, площадью 49,8 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Ильича, д. 30-79. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007001472, площадью 0,2874 га (договор аренды земельного участка от 11.02.2015 г.). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами. | **70 000,00 руб. (700 000 000 бел. руб.)** | **7 000,00 руб. (70 000 000 бел. руб.)** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 25 октября 2016 г. в рабочие дни с 9[00] до 16[00] от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **27 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация»<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 24.09.2016 г. |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю предоставляется рассрочка платежа на шесть месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Подробная информация по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341-15-45**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

---

# БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

## 2 ноября 2016 года в 15.30 проводит открытый повторный аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Инженерная инфраструктура | Расходы по подготовке (руб.) | Начальная цена земельного участка (руб.) | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок №244 | 321080800601000870 | 0,1205 га | Имеется возможность электроснабжения, проводятся работы по централизованному водоснабжению | 1221,08 и расходы за опубликование в СМИ | 7850,41 | 785,04 |
| 2 | Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок №231 | 321080800601000872 | 0,1226 га | Имеется возможность электроснабжения, проводятся работы по централизованному водоснабжению | 1225,28 и расходы за опубликование в СМИ | 7987,22 | 798,72 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А, зал заседаний Гомельского райисполкома 02.11.2016 в 15.30.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов, и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

*Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет №3641414020045 Бобовичского сельского исполнительного комитета, филиал №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178403.*

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения до 29 октября 2016 года.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете.

**Контактные телефоны: +375291390201, (8-0232) 910234, 910244, 910247.**

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА от «24» октября 2016 г.

**Сведения о застройщике:**

## Общество с ограниченной ответственностью «Триумфстрой»,

зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом решением от 9 июля 2003 г. №1124.
Свидетельство о государственной регистрации №190465926 выдано 15 июля 2003 г.

**Местонахождение:** 220020, г. Минск, ул. Леси Украинки, дом 16, каб. 6

**Режим работы:** понедельник – пятница 8.30 – 17.00; перерыв на обед 12.30 – 13.00.

**Сведения о проектах строительства жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние три года:

- 16-этажный двухсекционный, 111-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е. Полоцкой, 1, площадью – 13699,6 м²;
- 10-этажный двухсекционный, 49-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е. Полоцкой, 3, площадью – 5467,9 м²;
- 10-этажный трехсекционный, 124-квартирный жилой дом по ул. Жуковского, 29Б, площадью 9933,8 м².

**Цель проекта:** строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П. Глебки».

**Сведения об этапах и сроках реализации:** Начало строительства – август 2014 г.

Нормативный срок ввода в эксплуатацию – февраль 2016 г. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – январь 2017 г.

Сведения о генеральной подрядной организации – СУ-26 ОАО «Стройтрест № 4». Договор № 01/26-2014 от 21.07.2014 г.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка площадью 0,4713 га, утверждённый Председателем Минского городского исполнительного комитета 31.10.2012 г.;
- решения Минского городского исполнительного комитета от 27.02.2014 г. №458, от 22.01.2016 г. № 79;
- разрешение на организацию стройплощадки №2-208Ж-038/14 от 04.08.2014 г., разрешение на производство строительно-монтажных работ №2-208Ж-038/14 от 01.09.2014 г. Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску;
- заключение КАиГ МГиК от 29.07.2013 г. №07-29/115 Ф, от 28.02.2014 г. № 02-28/80 Ф;
- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка № 500/1312-3071 от 04.04.2014 г.;
- ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 949-60/13 от 31.01.2014 г.; № 635-60/15 от 18.09.2015 г.

**Местонахождение строящегося объекта:** г. Минск, Фрунзенский район, ул. Е. Полоцкой (пересечение ул. П. Глебки и ул. Притыцкого).

**Характеристика объекта:** проектом предусмотрено строительство 84-квартирного жилого дома, состоящего из трех секций со встроенными помещениями бытового обслуживания, расположенных на цокольном и первых этажах, и подземным гараж-стоянкой.

**Жилой дом представляет** собой здание, которое решено по жесткой конструктивной схеме с несущими стенами из эффективного кирпича и дисками перекрытия из сборных многопустотных плит с монолитными участками. Стены наружные и внутренние – кирпич эффективный. Перегородки – из блоков ячеистого бетона, из эффективного кирпича. Фундаменты – в осях «1-9» забивные сваи с монолитными ростверками, в осях «10-17» монолитные ленточные фундаменты. Кровля - плоская, рулонная с внутренним организованным водостоком и отдельные участки – стропильная.

Для привлечения дольщика к строительству по договору создания объекта долевого строительства на коммерческой основе предлагается для граждан и юридических лиц помещение бытового обслуживания № 15 с единовременной оплатой.

Стоимость одного квадратного метра общей площади помещения бытового обслуживания составляет 2 349,41 рубля, что эквивалентно 1206 долларов США по курсу НБ РБ по состоянию на 21.09.2016 г.

Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора.

**Подземный гараж-стоянка** примыкает к жилому дому, имеет сложную в плане форму с осевыми размерами 48x85,5 м, не отапливаемый, одноэтажный, на 52 машиноместа, хранение газобалонных автомобилей не предусматривается.

**Элементы благоустройства:** площадка для отдыха, детская площадка, плоскостные автопарковки, газоны, озеленение, покрытие проездов к дому и автостоянок – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**В состав общего имущества в жилом доме и объектов недвижимости, которые будут находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию, входят:**

- внутренние инженерные сети;
- тамбура подъездов, лестничные клетки, мусоросборные камеры, лифты, машинные помещения лифтов;
- техническое подполье, водомерная, ИТП, электрощитовая.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:** по тел.: 396 30 12, +375 29 222 20 16, +375 29 222 20 41, непосредственно в отделе продаж ООО «Триумфстрой», г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, дом 1, офис №117а, кабинет 12.

Застройщик ООО «Триумфстрой», УНП 190465926.
Подрядчик СУ-26 ОАО «Стройтрест № 4».
Договор №01/26-2014 от 21.07.2014 г.
**ООО «Триумфстрой»**

# Усё пра Еву

## ■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА,**
**галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**

# КУЛІНАРЫЯ



Распавяду вам два вельмі цікавыя назіранні з жыцця, у якія, баюся, вы не паверыце — такія яны выпуклыя. Але запэўніваю: так і было, і з гэтага можна рабіць высновы на тэму: што ёсць для мужчын кулінарыя.

У доме збіралася ладзіцца свята. Малады чалавек гаспадарчага складу... Такія, ведаеце, бываюць. У адрозненне ад дзяўчат, апантаных збіраннем рэцэптаў і бясконцым іх выпрабаваннем (або нават і жанчын з багатым кулінарным досведам), маладыя людзі такога кшталту без ніякіх кніг рэцэптаў ведаюць, колькі чаго куды трэба сыпаць, нават калі размова пойдзе пра блінцовыя крамескі або мазурку з кёнігсбергскім марцыпанам.

Дык вось якраз такога кшталту малады чалавек, запрошаны (і справядліва) дапамагаць у кухні, накройваў на лусты звычайны батон. Рабіў гэта вельмі засяроджана і натхнёна. Здавалася, ён нічога навокал не бачыць і не чуе, адно толькі гэты батон і стук нажа аб дошчачку.

Калі быў зроблены апошні зрэз, хлапец адклаў нож і пачаў лічыць лусты. Палічыўшы, задумаўся. Відаць, нічога не прыдумаўшы, вырашыў за лепшае пералічыць іх нанова. На цікаўныя погляды іншых памагатых не рэагаваў ніяк, чым выклікаў да сябе яшчэ большую цікавасць. Ці трэба казаць, што работа ў кухні спынілася — кожны ўтаропіўся ў гэтага дзіўнага хлопца, якога другі падлік лустаў увёў у бязмежную роспач.

— Ніяк не магу ўцяміць, — нарэшце прамовіў ён, але хутчэй сабе, чым некаму побач. — Ды што ж за напасць?! Звычайна з такога батона атрымліваецца трынаццаць кавалкаў, а гэтым разам выйшла дванаццаць.

Лусты меркавалася пускаць на святочныя тосты: абсмажваць іх у алеі, націраць зубком часнаку, змазваць маслам і выкладаць на кожны шпроцінку, паўкружок лімона, галінку пятрушкі і журавінку. Прыгожа і смачна, ды колькасць тостаў ніяк не лімітавалася, але і не дэкларавалася. То бок, на стале магла з'явіцца якая заўгодна колькасць тостаў, а значыць, лусты лічыць не было ніякай патрэбы.

А ён лічыў. Бо рабіў так заўсёды. Бо дакладна ведаў, на колькі лустаў які від батона здатны падзяліцца, і яму было вельмі важна прытрымлівацца ўласных ведаў і захоўваць сябе «ў форме». Таму і выглядаў ушчэнт разгубленым. Здавалася, што калі і трэці падлік не дасць яму патрэбнай лічбы, ён не будзе здольны працягваць работу ні за якія дэсерты.

Другое назіранне адбылося падчас маёй работы ў «глянцы». Рэалізатар італьянскіх макаронных вырабаў замовіў рэкламны тэкст з рэцэптамі. Мы, вядома, стараліся напісаць нешта выключнае, смачнае, з існуючых у свеце рэцэптаў адбіралі самае выкшталцонае. І адабралі, што называецца, на сваю галаву. Прачытаўшы ў прапанаваным намі тэксце выраз: «Зварыць макароны аль дэнтэ», — заказчык абурыўся не на жарт: «Якія такія макароны аль дэнтэ?! Дзе вы бачылі на нашых упакоўках «аль дэнтэ»?! Мы такіх не рэалізуем, вы падсунулі тэкст, які пісаўся не для нас!» Чытач, канешне, разумее, што «аль дэнтэ» — звычайны (і не толькі для Італіі) кулінарны тэрмін, які па-нашаму азначае «злёгку не даварыць». Але ж адкуль такія тонкасці можа ведаць рэалізатар макаронных вырабаў, хай сабе італьянскіх, калі ён мужчына?

Ёсць, канешне, і жанчыны, якія нават пасля сарака гадоў сямейнага стажу не ведаюць, на якім этапе гатавання бульбу саліць лепш і чаму ёй трэба трапіць у каструлю раней, чым капусце, але тут не пра іх. Тут пра мужчынскую маргінальнасць, у вачах якой кулінарыя — адно з двух: або вышэйшая навука, якую спасцігаць і спасцігаць, або пусты гук і не вартая ўвагі з'ява ■

## ■ Паміж намі

# НУ, ЗА КАХАННЕ!..

Таня, Танечка, Танюша... Выдатніца, прыгажуня, спартсменка, мара ўсіх хлопчыкаў. Ёй прадказвалі зайздросную будучыню — кар'ерны рост, матэрыяльную забяспечанасць, удалае замужжа... Таня ўсіх расчаравала — выскачыла замуж, ледзь паспеўшы скончыць школу, за Славіка, які зорак з неба не хапаў, працаваў на мясцовай аўтабазе, а па вечарах нарошчваў біцэпсы ў мясцовай жа «качалцы»... «А праўда, ён падобны да акцёра Ціханава?» — пыталася Таня ў сябровак, прыжмурваючы ад замілавання вочы, і тыя, каб не расчароўваць яе, згоднаківалі галовамі. Хоць выдатна ўсведамлялі, што ў Славы і акцёра Ціханава з агульнага — толькі імя. Нядобразычліўцам жа, якія спрабавалі адкрыта адгаварыць Таню ад шлюбу — маўляў, нічога добрага з гэтага не атрымаецца, занадта ж вы розныя, — дзяўчына давала суровы адпор, заклікаючы на дапамогу цяжкую артылерыю ў выглядзе жалезнага аргумента: я яго вельмі кахаю, ён кахае мяне бязмежна, і не трэба нам зайздросціць.

Паступова жарсці ўлягліся, пачаліся звычайныя будні... З таго часу мінула гадоў трыццаць, а можа і больш...

* * *

У суботу Тацццяна Пятроўна, жанчына «ў целе» (як гаворыць сама пра сябе), прачынаецца рана, надзявае зялёны спартыўны касцюм з нашытымі на рукавах чырвона-белымі палоскамі, залазіць на свой ровар, які пад яе напорам крыху патрэсквае, і едзе ў краму атаварвацца. Калі праз гадзіну вяртаецца, паходную сумку, якая па буднях служыць дамскай, а па выхадных — гаспадарчай, аж распірае ад пакетаў з ежай.

Тацццяна Пятроўна асцярожна паркуецца каля ўласнай агароджы, здымае з руля свой каштоўны груз і, злёгку кульгаючы, ідзе па цэментнай дарожцы ў бок дома. Не даходзячы да дзвярэй, рэзка збочвае — нырае ў кустоўе пад вокнамі, хаваючы ў зарасніку «пляшку» для будаўнікоў, што перакрываюць дах.

Пакінуўшы бутэльку ў кустах, астатняе нясе ў хату — вечарам да іх запрошаны госці. Ну не тое каб госці ў прыстойным сэнсе гэтага слова, а так, суседзі. Галіна са сваім сужыцелем Сцяпанам. У іх сем'ях такая вось завядзёнка — хадзіць адзін да аднаго па чарзе. Сумесныя пасядзелкі рэдка калі не заканчваюцца сваркай, аднак праз колькі дзён усе зноў мірацца, і гасцявая традыцыя працягваецца.

Колькі разоў Таня прасіла Славіка, каб не лез са сваім «рылам» у святая святых — разважанні Сцяпана (былога армейскага маёра) пра крызіс у сучасным войску... Звычайна Славік дазваляў Сцяпану выказацца, старанна ўслухоўваючыся ў яго маналогі і напружана моршчачы лоб, калі ў разважаннях прыяцеля траплялася незнаёмыя словы. Яно ж і зразумела: Сцяпан — чалавек вучоны, вайсковы інтэлігент, няхай і разжалаваны пад канец службы за крадзеж бензіну. А Славік у сваім жыцці, акрамя «баранкі» і кабіны грузавіка, нічога не бачыў. І таму на выступленні суседа ён рэагуе заўсёды аднолькава — бесцырымонна перапыняе яго, грукаючы кулаком па стале і звяртаючыся невядома да каго з адной і той жа фразай: «Папуасы вы ўсе!» Такой абразы Сцяпан вынесці не можа — мужчыны хвілін пяць тузаюць адзін аднаго «па-суседску» і разыходзяцца. Аднак самае большае праз тыдзень ад крыўды не застаецца і следу.

* * *

У той дзень для сустрэчы мелася і ўвогуле важная падстава — новы Танін веласіпед. Новы-не новы... Спачатку братава жонка, пэўна, з год развозіла на ім пошту. Аднак мара Тацццяны ўсё ж ператварылася ў рэальнасць — уламала радню на «бартар» у выглядзе дзвюх скрыняў памідораў і меха бульбы (балазе, год на іх выдаўся ўраджайны, а ў брата свайго агарода няма).



Веласіпед Тацццяне быў як нельга дарэчы. І да свекрыві ў вёску зматацца, і ў краму, і да сына, Віталіка, на другі канец горада... Зараз Віталік распанеў, носу дома не паказвае, возіць нейкае «начальства». А летась, калі машыну свайго шэфа пабіў і грошы на рамонт тэрміноваа шукаў, да каго прыбег? Да яе, да маці. А калі ўнучка Волечка захварэла і ёй кансультацыі прафесараў ды дарагія лекі спатрэбіліся — хто ўсіх знаёмых на ногі падняў (памятаюць яшчэ, як у Танькі кантрольныя спісвалі, не забыліся!)? Кабанчык, зноў жа, дарчы прыйшоўся — ад свежанінкі ніхто са знаёмых ды і дактароў не адмовіўся, ні адзін чалавек. І Волечку — яе сонейка, яе адзіную на гэтым свеце сапраўдную радасць — выратавалі.

Пасля нявестка малую забрала і да маці ў вёску падалася. Лепш, сказала, буду там жыць, чым у райцэнтры са свёкрам-алкаголікам. Няпраўду сказала, Славік не алкаголік. Ну, любіць чалавек выпіць — дык гэта ж на святы! І яшчэ крыху — калі суседзі прыходзяць.

* * *

Галіна са Сцяпанам з'явіліся пад вечар — прынеслі з сабой настойку ў бутэльцы з-пад каньяку і кружок «пальцам піханай» каўбасы. Таня злазіла ў склеп па агуркі, насмажыла бульбы, парэзала паляндвічку... Славік, як быў — у завэдзганай «садовай» майцы і зашмальцаваных шортах, якія ўвесь час спаўзалі з жывата, — так і плюхнуўся за стол, на сваё любімае месца каля пліты. Лянiва пацікавіўся: «З якой нагоды сёння сабраліся?» — і падазрона скасавурыўся на Сцяпана: нешта зачасціў сусед. Можа, «жэрдка» яго худая яму ўжо надакучыла?.. Таня ўсё яшчэ бегала з кухні на веранду. «Бач, як стараецца, — прамільгнула ў галаве. — З чаго б гэта?»

«Ну, за вашу пакупку!» — сказаў першы тост Сцяпан. Усе выпілі, і ён, накалоўшы на вілку кавалак каўбасы, узяўся за сваю любімую тэму: «Калі я служыў у Ніжнім Тагіле, у жонкі нашага камандзіра таксама быў веласіпед. І яна на ім...»

Далей Славік ужо не слухаў. Не абмежаваная ніякімі рамкамі фантазія, падагрэтая «знізу» парамі настойкі, малявала яму самыя змрочныя сцэны: вось Тацццяна, як заўсёды, кульгаючы, падыходзіць да веласіпеда, залазіць на яго, націскае на педалі і імчыць у напрамку бліжэйшага бярэзніка. А там... Там яе чакае вусаты сусед Сцяпан у поўнай баявой гатоўнасці.

«За каханне!» — прапануе наступны тост бравы адстаўнік Сцяпан. Наліваючыся злосцю, Славік устае з-за стала і, чапляючыся за сцяну, выходзіць у «бакоўку», дзе складзены розныя патрэбныя ў гаспадарцы рэчы.

«Вой, глядзіце, сякеру ўзяў!» — шэпча збялелымі вуснамі Галя. Заварожанымі позіркамі госці сочаць за Славікам. Той размахваецца і з усёй сілы наносіць удар. Спачатку па багажніку, потым — па рулі, па колах... Спіцы разлятаюцца ў розныя бакі, як іголкі. Таня равецца да мужа, але Сцяпан з Галінай стрымліваюць яе. «Ды чорт з ім, не лезь. Зараз супакоіцца, спаць ляжа. А веласіпед... Падумаеш — веласіпед! Не чалавек жа. Сядай лепш за стол. Трэці тост — за жанчын!»

**Ала БЫВАЛАВА** ■

## ■ З канверта

### ЧУЖОЕ — НЕ ТВАЁ

*«Калі мы бачым чыйсці прыгожы і камфортны аўтамабіль ці ўтульную, добра абстаўленую кватэру, то заўсёды думаем, што нам гэта вельмі падабаецца і добра было б мець такі ж ці такую ж... Але ж чужое — НЕ ТВАЁ. І мы ж (у пераважнай большасці) не лезем праз акно ў чужую машыну ці кватэру! Бо ўсе добра разумеем, што гэта не наша, і шанцаў, каб яно стала нашым, мала, так? Чаму ж тады, калі бачым чужых мужоў ці жонак і яны нам падабаюцца, гэты «стоп-сігнал» не спрацоўвае»?.. Калі цяпер не разумеем, дык рана ці позна ўсё роўна прыйдзем да простай высновы: ЧУЖОЕ НІКОЛІ НЕ СТАНЕ сваім! Вывад: жанчыны, паважайце сябе і не дазваляйце сабе апускацца да адносінаў «сэканд-хэнд».*

**Любоў Зямная**

### САМА ВЫБІРАЛА!

*«Паслухаеш часам, як «красамоўна» апісваюць сваіх былых (ды і дзеючых) сужэнцаў некаторыя жанчыны, і задумаешся... Самі ж іх выбіралі! А да сябе пры гэтым — ніводнай прэтэнзіі, маўляў, я ўся такая разумная, прыгожая, правільная...*

*Ага!.. Я таксама была не ў захапленні ад уласнага мужа, але ж САМА выбірала! Сама выбірала — сама і пазбавілася ад яго, у сэнсе, падала на развод. І разышліся мы, як у моры караблі, бо аказаліся рознымі людзьмі па жыцці. Рознае выхаванне, розныя прынцыпы, розныя інтарэсы... Ён стаў мне не цікавы і як мужчына, і як асоба. Развіталіся — і вось ужо некалькі год жыву адна. Але нікому не скарджуся на яго, не ныю, што ён «сволач» і «гад», што «сапсаваў мне жыццё». Можа, гэта я яму жыццё сапсавала? Можа, гэта я не адпавядала яго ідэалам, не раздзяляла яго памкненняў, не чытала яго кніжкі, не глядзела на свет яго вачыма? Дык у чым ён вінаваты? Ні ў чым. Ён — чалавек, які мае права на ўласныя погляды, адрозныя ад маіх. Магчыма, я яго погляды і не падзяляю, але паважаю. Абражаць «былых» — гэта зневажаць у першую чаргу саміх сябе. Не дачакаецеся!»*

**Ларыса К.** ■

■ Шукаю цябе...

# У КРАМЕ ЦІ ГАНДЛЁВЫМ ЦЭНТРЫ

**«Ева» вырашала скласці своеасаблівы даведнік для тых, хто шукае ідэальнага спадарожніка жыцця. Кожны месяц мы будзем наведвацца ў адно з месцаў, дзе, на наш погляд, могуць вадзіцца патэнцыйныя жаніхі, спрабаваць з імі знаёміцца і рабіць адпаведныя вывады.**

***

Я, сімпатычная (па словах таты) мініяцюрная шатэнка з зялёна-шэрымі вачыма і чароўнай усмешкай, ступаю на парог сталічнай крамы і адразу расчароўваюся: годных кандыдатаў тут не відаць! Яно і зразумела, тры гадзіны дня, усе нармальныя мужчыны ў гэты час працуюць, грошы зарабляюць! Але пацвердзіць тэорыю ўсё ж такі трэба. Праходжу далей, у гандлёвую залу. На ролю жаніха можа прэтэндаваць хіба што толькі хлопчык-прадавец у аддзеле шыцця.



— Пакажыце мне, калі ласка, вось гэтую далікатную тканіну. Як вы лічыце, для пеньюара падыдзе? — звяртаюся да прадаўца.

Той аж разгубіўся. Пра жаночую бялізну гаварыць дакладна быў не гатовы (а шкада, тэма «гарачая»). Ды і наогул, фліртаваць за прылаўкам, калі з усіх бакоў калегі і начальства, напэўна, цяжка. Не варыянт.

У чарзе на касе за мной стаў шыракаплечы мужчына з дарагімі гадзіннікамі. «Вось ён, знайшла», — прамільгнула думка ў галаве. Але як прыцягнуць яго ўвагу? Мы стаялі амаль на выхадзе, і пытаць: «Ой, а дзе тут хлеб?» было ўжо позна. Дзейнічаю спантанна. Рукой (быццам выпадкова) закранаю і вывароўваю ўпакоўку з жуйкамі. Прадаўшчыца злуецца, патэнцыйны «жаніх» смяецца. Разам з апошнім кідаемся збіраць гэты «ўраджай».

— Астатнія я куплю, не складвайце, дзякуй, — паказваючы на штук 8 жуек, кажу я.

Ідэальны кандыдат яшчэ раз усміхнуўся і пачаў размаўляць па мабільным тэлефоне. «Зачапіла я, відаць, толькі гэты стэнд», — падумала з расчараваннем, хаваючы ў сумку свае бессэнсоўныя пакупкі. Мужчына не прапанаваў правезці мяне да дому, не пацікавіўся, як завуць, не спытаў нумар тэлефона. Наогул, не зрабіў першы крок, да якога, хай і недарэчна, я так намагалася яго падштурхнуць.

***

На выхадных «патрэбных» мужчын у крамах шмат, але ўсе яны са спадарожніцамі. Адны выбіраюць торт без крэму, другія шукаюць свежую «прыгожую» гронку вінаграду. Усё, што трэба для ідэальнай рамантычнай вячэры.

— Вы якое любіце: чырвонае або белае? — раптам пачула я з-за спіны. — На якую суму разлічваем? — працягнуў мой новы суразмоўнік гадоў каля 40.

Мужчына ў доўгім паліто і з недагледжанай барадой падышоў да мяне каля стэлажа з віном. Прачытаў цэлую лекцыю пра алкаголь і скончыў прапановай пакаштаваць «белае сухое» разам. Пры гэтым абмацаў свае кішэні і ўспомніў пра кашалёк, які... чамусьці застаўся дома. Ад прапановы я адмовілася, а суседні аддзел з півам (на ўсялякі выпадак) абышла бокам.

З высокім, сур'ёзным і, галоўнае, самотным бландзінам з пельменямі ў руках мы сустрэліся позіркам разы тры.

— Дапамагчы? Вось гэтыя разварваюцца пры варцы, а тут цеста вельмі тоўстае, — пачала размову я.

— Дзякуй за інфармацыю, але мама ў спісе пазначыла патрэбную марку пельменяў, — паказваючы на кавалак паперы, кажа кандыдат. — Паспрабуйце іх і вы, вельмі смачныя.

«Эх, бландзін-бландзін! Якая мама? Якія пяльмені? Ты пра што?» — думала я, разлічваючыся на касе.

***

У будні дзень вечарам халасцякоў у краме — на любы густ. Адзін з іх у адказ на маё гучнае па тэлефоне «Я так стамілася, а яшчэ гэтыя прадукты...» прапанаваў падвезці на аўто да самага пад'езда і ў ліфт «загрузіць». Па дарозе кандыдат запытаў, каму я так у тэлефонную трубку на жыццё скардзілася. Адказ прыйшлося прыдумаць, бо ні з кім я тады не размаўляла, а ўсяго толькі адпрацоўвала новы прыём знаёмства. Дарэчы, працуе. Добрым аказаўся і варыянт са «зламаным» абцасам, і з разраджаным тэлефонам (тут мабільнік прыйшлося адключыць самой). У выніку плюс яшчэ два нумары тэлефонаў сімпатычных халасцякоў у маім нататніку.

У аўторак вечарам я пайшла па агародніну. Над макаронамі схіліўся сімпатычны брунет з незвычайнай татуіроўкай, каля кансерваў кружыў мужчына ў строгім дзелавым касцюме, сасіскі выбіраў шатэн з навушнікамі. Так, тыя, каго я так шукала, разгрупаваліся каля прадуктаў, якія не асабліва трэба гатаваць (!). Але маю ўвагу прыцягнуў кандыдат з спартыўным целаскладам, які наварочваў кругі ў аддзеле бытавой хіміі. «Які гаспадарлівы», — падумала я. У той жа момант жаніх пацягнуўся да жаночых пракладак і ўзяў «ультратонкія з рамонкам». Так, свабодных мужчын тут быць не можа...

У дзіцячыя аддзелы я нават і не заходзіла, каб не марнаваць час.

▸ ***Месца:*** найбліжэйшы да дома гандлёвы цэнтр.

▸ ***Уваход:*** бясплатны, з 9 да 00 гадзін.

▸ ***Удалыя гадзіны для наведвання:*** 19.30 — 21.30, у будні.

▸ ***Дрэс-код:*** штосьці спакуслівае, але стыльнае і камфортнае.

▸ ***Абавязковыя для наведвання:*** аддзелы з паўфабрыкатамі, сасіскамі, салатамі, сырам, макаронамі, кансервамі.

▸ ***Варта пазбягаць:*** аддзелаў з алкаголем, гароднінай і садавінай, тартамі, гаспадарчымі таварамі, дзіцячыя секцыі.

▸ ***Лепш абыходзіць бокам:*** мужчын з мамамі, жонкамі, дзецьмі, супрацоўнікаў магазіна (прадаўцоў, ахоўнікаў, менеджараў).

***

Маё «паляванне» завяршылася на шосты дзень. У сераду я пайшла ў краму проста па сыр і малако. Нават туфлі на абцасах не абувала, а валасы ў хвост сабрала.

— Жуйкай не пачастуеце? — пачула каля касы. — Ці ўсе зжавалі ўжо?

Перад мною стаў той самы мужчына, з якога пачаўся мой эксперымент.

— Не, мятныя яшчэ засталіся, — усміхаючыся, адказала я.

— Выдатна, яны спатрэбяцца нам пасля вячэры ў кавярні, што недалёка адсюль. Вы любіце грузінскую кухню?

Адказваць было неабавязкова. У руках я трымала сыр, малако і візітоўку новага знаёмага. Пакуль ішла дадому, падумала, што мужчына запомніў мяне дзякуючы маёй не вельмі разумнай выхадцы. Спрацавала. А для таго, каб «саспець», жаніху проста патрэбен быў час.

**Сафія ГРОМАВА.**
*gromava@zviazda.by*

**ВЫВАДЫ**

- Хадзіць па крамах лепш вечарам (пасля работы) у будныя дні. Дзённы суботні/нядзельны шопінг «улову» не прынясе.
- Краму трэба выбіраць недалёка ад дома: ёсць шанц яшчэ раз сустрэць таго, хто вам спадабаўся з першага разу, але чамусьці не быў гатовы да знаёмства. Такім чынам, мы дорым сабе і мужчыну другую спробу.
- Паказваць, што вам патрэбна дапамога, трэба далікатна. Рабіць гэта лепш за ўсё арыгінальна (выкарыстоўваючы розныя прыёмы) і з упэўненасцю, што кандыдат з гэтым зможа справіцца тут і зараз.
- Халасцякоў лягчэй за ўсё знайсці каля тых прадуктаў, якія амаль не трэба гатаваць. Рэдка яны водзяцца і ў гаспадарчых аддзелах.

■ Урокі прыгажосці

# 13 КРОКАЎ ДА СТРОЙНАСЦІ



**За тыдзень чалавек можа страціць каля 1 кг, гэта значыць, за месяц рэальна скінуць 3—4. Калі зыходная вага вялікая, гэтая лічба можа дасягаць 5 кілаграмаў. Аднак важна не фарсіраваць падзеі. Дайце сабе час, каб прыйсці ў форму.**

Крок 1.

**ПРАВІЛЬНА СНЕДАЕМ**

Для таго каб запусціць абменныя працэсы, снедаць трэба на працягу 1—1,5 гадзіны з моманту абуджэння. Раншні прыём ежы вельмі важны з пункту гледжання паступлення энергіі, таму прапускаць яго не варта. Класічны варыянт сняданку — каша. Менш класічны, але таксама жыццядольны — амлет, тварог, запяканка.

Крок 2.

**ПЛАНУЕМ ПЕРАКУСЫ**

У сярэднім за дзень у вас павінна быць 1-2 перакусы. Ланч — паміж сняданкам і абедам. Падвячорак — паміж абедам і вячэрай. У варыянце пяціразовага харчавання мы ядзім практычна кожныя 2—2,5 гадзіны. Для перакусу ідэальна падыходзяць садавіна, ёгурты, невялікі сандвіч з зерневым хлебам і гарачы напой.

Крок 3.

**АБЕДАЕМ З РОЗУМАМ**

Вельмі важна ўлічваць колькасць тлушчаў у сваім рацыёне! Частая памылка, якую робяць практычна ўсе людзі, калі абедаюць па-за домам і офісам, — няўважлівае стаўленне да ежы, якую ім падаюць на ўстанове грамадскага харчавання. Адна справа з'есці проста салату, іншая — салату, багата запраўленую тлустым соусам альбо алеем. Кавалак мяса і незразумела з чаго зроблены катлета — таксама розныя рэчы! На жаль, мы звяртаем увагу на аб'ём ежы, а не на яе каларыйнасць. Гэта няправільна. Вас павінен хваляваць састаў прадуктаў, асабліва, калі вы ясцё не дома.

Крок 4.

**ВЯЧЭРАЕМ СВОЕЧАСОВА**

Час вячэры — 19—20 гадзін. Аднак ён можа мяняцца як у адзін, так і ў другі бок. Усё залежыць ад таго, калі чалавек кладзецца спаць. Лепш за ўсё прымаць ежу за тры гадзіны да сну. Пры гэтым вы можаце зрабіць аблегчаны варыянт вячэры: кефір, вотруб'е (3 сталовыя лыжкі), трохі тварагу. Паўнавартасны варыянт: кавалак мяса, морапрадукты, тварог, яйкі, рыба або любы іншы бялковы прадукт. У якасці гарніру павінна быць толькі гародніна.

Крок 5.

**ПЕРАГЛЯДАЕМ РАЦЫЁН**

